**Анцыпіровіч Вольга Мікалаеўна**

# МУЗЫЧНАЯ СКАРБОНКА

Дапаможнік для педагогаў, кіраўнікоў установ,

якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі

## Анатацыя

Дапаможнік змяшчае тэарэтычны і практычны матэрыял, які раскрывае магчымыя накірункі арганізацыі работы па далучэнні дзяцей старшага дашкольнага ўзросту да беларускага музычнага фальклору.

Адрасаваны педагогам, кіраўнікам устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі.

## Змест

УВОДЗІНЫ.....................................................................................5

ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ВЫКАРЫСТАННЯ БЕЛАРУСКАГА МУЗЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў МУЗЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ ДАШКОЛЬНІКАЎ ................................................... 8

Музычны фальклор як сродак фарміравання музычнай культуры дашкольнікаў ............................................................8

Улік спецыфікі фальклорнага мастацтва і асаблівасцей беларускага музычнага фальклору пры далучэнні да яго дзяцей дашкольнага ўзросту ......................................................19

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ДАЛУЧЭННІ СТАРШЫХ ДАШКОЛЬНІКАЎ ДА БЕЛАРУСКАГА МУЗЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ ......................................................26

Агульная характарыстыка сістэмы заняткаў ..............26

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі заняткаў .33

Тэма «Уводзіны ў фальклор»…………………………… 33

Тэма «Кірмаш»……………………………………….. 46

Тэма «Калыханкі» ………………………………………….. 58

Тэма «Зімовы фальклор» …………………………….... 72

Тэма «Заняткі нашых продкаў»………………………… 86

Тэма «Беларускія музычныя інструменты» ……………… 99

Тэма «Веснавы фальклор» ………………………………. 113

ЗАКЛЮЧЭННЕ……………………………………….. 125

Літаратура..........................................................................126

да раздзела «Тэарэтычныя асновы выкарыстання беларускага музычнага фальклору ў музычным выхаванні дашкольнікаў» ...........................................................................126

да раздзела «Метадычныя рэкамендацыі па далучэнні старшых дашкольнікаў да беларускага музычнага фальклору» ....................................................................................127
Фонадакументы да раздзела «Метадычныя рэкамендацыі па далучэнні старшых дашкольнікаў да беларускага музычнага фальклору» ............................................................128

*Quod nova testa capit, inveterata sapit.*

*Что малый понял, то старый знает.*

## УВОДЗІНЫ

З моманту свайго з'яўлення на гэтым свеце Маленькі Чалавек непазбежна апыняецца ў свеце Культуры. У яе вялізным поле дзейнасці значную ролю адыгрывае культура эстэтычная, мастацкая, музычная. Немагчыма пераацаніць ролю музычнай культуры ў развіцці асобы, яе моцнае ўздзеянне на эмацыянальную і інтэлектуальную сферу, на фарміраванне эстэтычных і маральных якасцей дзіцяці. Закладзенае ў дзяцінстве застаецца з чалавекам на ўсё яго жыццё, а значнасць і ўнікальнасць дзяцінства ў жыцці асобнага чалавека агульнапрызнана.

Калі разглядаць дзяцінства як гісторыка-культурны фенамен, яно адначасова выступае і як «акумулятар» існуючай культуры, і як «генератар», творца культуры будучыні. Так, па словах амерыканскага філосафа і паэта У. Эмерсона, дзеці — гэта адвечныя місіі грамадства, увасабленне яго непазбежнай будучыні. І для гэтай будучыні, між іншым, не абыякава, якія з'явы існуючай сёння культуры з'явяцца тым субстратам, на якім будучая культура будзе развівацца.

Адукацыя і выхаванне — моцныя каналы трансляцыі ўсіх пластоў сучаснай культуры, уключаючы эстэтычную і музычную культуру грамадства. І гэты канал, як ніякі іншы, павінен у сваім уздзеянні на чалавека на ўсіх ступенях адукацыі ўлічваць не толькі з'явы ўжо існуючай культуры, але і тыя тэндэнцыі, якія больш яскрава праявяцца ў найбліжэйшай будучыні.

Сучасную гісторыка-культурную сітуацыю, якую называюць «постмадэрнізмам», магчыма азначыць як эпоху «шматмернага

дыялога», які павінен стаць усеабдымным спосабам існавання культуры і чалавека ў ёй. Для вырашэння шматлікіх супярэчлівасцей жыцця сучаснага чалавецтва без пагрозы яго існаванню не застаецца іншага выбару, акрамя пабудовы дыялагічных сувязяў усіх культурных суб'ектаў. У мастацтве ўжо з сярэдзіны XX стагоддзя, а ў культуры ўвогуле ў апошнія дзесяцігоддзі, назіраюцца некаторыя тэндэнцыі, якія адлюстроўваюць ідэю дыялагічнасці ў культуры. Сярод іх — пераадоленне супрацьпастаўлення элітарнай і масавай культуры; традыцыяналізма і наватарства; радыкальныя змены адносін паміж Захадам і Ўсходам, пошук шляхоў паразумення паміж разнастайнымі культурамі і іх носьбітамі.

Апошняя з гэтых непазбежных тэндэнцый, якая праяўлена сёння ў працэсе сучаснай глабалізацыі, аб'яднанні краін з рознымі культурнымі традыцыямі, разам з усімі станоўчымі момантамі нясе і пагрозу для існавання этнічных культур, знікнення іх самабытных рыс. Складаныя пытанні ўзаемадзеяння нацыянальных культур магчыма вызначыць як адзінства разумення і непаразумення, імкненне да аб'яднання і адначасова да зберагання сваёй самабытнасці. Проста і выразна ў свой час вызначыў гэтую пазіцыю Махатма Гандзі: «Я не желаю, чтобы мой дом был обнесен со всех сторон стеной, и чтобы мои окна были наглухо заколочены: я хочу, чтобы культура всех стран свободно проникала в мой дом. Но я не желаю, чтобы меня сбили с ног».

Пытанні захавання, трансляцыі і ўзнаўлення нацыянальнай культуры сёння не толькі захоўваюць сваю актуальнасць, як гэта было ў папярэднім стагоддзі, але і набываюць яшчэ большую вастрыню. Роля адукацыі ў гэтым працэсе відавочна: менавіта яна павінна ствараць сучасныя тэхналогіі выхавання, якія забяспечаць у далейшым дастаткова вялікую для захавання і развіцця нацыянальнай культуры колькасць яе актыўных носьбітаў, і ў той жа час паклапаціцца аб

выхаванні талерантнасці, цярпімасці да носьбітаў іншых культур, жаданні і магчымасці разумець праявы іншых культур, і існаваць, такім чынам, у глабальна дыялагічным свеце культуры.

Безумоўна, менавіта фальклорнае мастацтва разам з сучаснай нацыянальнай культурай выступаюць фактарамі захавання нацыянальнай ідэнтычнасці. Музычны фальклор традыцыйна з'яўляецца тым універсальным матэрыялам, на аснове якога фарміруюцца першапачатковыя ўяўленні дашкольніка аб нацыянальных традыцыях, побыце, гісторыі, характары народа, кампаненты музычнай культуры асобы, назапашваецца слоўнік найбольш характэрных для нацыянальнай культуры музычных інтанацый, своеасаблівых "эталонаў" нацыянальнай музычнай мовы.

Цікаўнасць да пошуку найбольш эфектыўных мадэляў далучэння дзяцей да сваёй нацыянальнай музычнай культуры сёння дэманструюць педагагічныя даследванні ў РФ і краінах СНД, значнае месца музычнаму фальклору адведзена і ў айчыннай базіснай праграме выхавання і навучання дашкольнікаў «Пралеска». На жаль, каштоўны і багаты матэрыял, прапанаваны ў зборніках фальклорных твораў, не суправаджаецца, за рэдкім выключэннем, патрэбнай для педагога, які працуе ў дашкольнай установе, інфармацыяй аб музычных асаблівасцях прапанаваных узораў і непасрэдных рэкамендацый па арганізацыі вывучэння іх з дашкольнікамі. Акрамя таго, выкарыстанне музычнага фальклору ў практыцы дашкольных устаноў сёння часцей за ўсё звязана з падрыхтоўкай і правядзеннем фальклорных свят, нейкага разавага мерапрыемства. У сувязі з гэтым не дастаткова эфектыўна выкарыстоўваецца развіццёвы патэнцыял фальклору, парушаецца сістэматычнасць і паслядоўнасць далучэння да яго.

Аўтар спадзяецца, што ў "Музычнай скарбонцы" зацікаўленыя педагогі адшукаюць карысныя парады, якія датычацца адбору фальклорнага

матэрыялу для працы з дашкольнікамі з мэтай фарміравання кампанентаў музычнай культуры дзіцяці, удакладняць і пашыраць уласныя ўяўленні аб асаблівасцях фальклорных твораў і уліку іх ў працы ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі, змогуць выкарыстаць прапанаваныя музычныя і літаратурныя творы як з улікам пададзеных аўтарам метадычных рэкамендацый па азнаямленню дашкольнікаў з фальклорнымі з'явамі, так і стварыць уласныя творчыя інтэрпрэтацыі прапанаваных падыходаў.

# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ВЫКАРЫСТАННЯ БЕЛАРУСКАГА МУЗЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў МУЗЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ ДАШКОЛЬНІКАЎ

## Музычны фальклор як сродак фарміравання музычнай культуры дашкольнікаў

Адна з асноўных задач музычнага выхавання ў дашкольным узросце - **фарміраванне асноў музычнай культуры асобы**. Музычная культура асобы, якая з’яўляецца інтаграванай якасцю, трактуецца даследчыкамі як мера засваення асобай музычнай культуры грамадства ва ўсёй яе разнастайнасці.

Звяртаючыся да гэтага масштаба культуры - культуры асобы, неабходна адначасова звярнуць увагу на некаторыя асаблівасці засваення чалавекам музычнай мовы і значнасць ролі дзіцячага ўзросту ў фарміраванні асноў асабістай культуры чалавека. Разгляданне музычнай мовы як семіатычнай (знакавай) сістэмы ставіць яе у адзін рад з іншымі знакавымі сістэмамі (напрыклад, з вербальнай), а гэта дапускае

і падобныя механізмы іх засваення. Як маўленне, так і музычная мова, засвaiваюцца ў дзяцінстве дастаткова рана і інтуітыўна, адразу як сістэма ў адзінстве трох асноўных складаемых: семантыкі, лексікі і граматыкі. Пры ўспрыманні асобай дастатковай колькасці аднастылёвых музычных узораў фарміруецца «пачуццё стылю». Менавіта наяўнасць гэтага пачуцця Дз. К. Кірнарская прапануе лічыць паказчыкам развітай музыкальнасці чалавека. Звязана гэта з тым, што разуменне стылістыкі пэўнага музычнага пласта патрабуе падсвядомага разумення ладавай, меладычнай, рытмічнай будовы гэтых ўзораў і сведчыць аб пэўным узроўні развіцця музычнага слыху, музычна-рытмічнага пачуцця, музычнага мыслення, музычнай памяці — тых музычных здольнасцяў, якія большасцю даследчыкаў звязваюцца з паняццем «музыкальнасць».

Назапашванне музычных уражанняў дазваляе фарміраваць у дашкольнікаў «вусны музычна-інтанацыйны слоўнік» (тэрмін Б. Асафьева) і інтанацыйны вопыт, які павінен стаць вынікам знаёмства з высокамастацкім і разнастайным па стылях музычным рэпертуарам. Неаднаразова ўспрынятыя музычныя інтанацыі становяцца ўсё больш звычнымі для слыху дзіцяці, знаёмымі, распазнавальнымі, што ў сваю чаргу сведчыць аб падсвядомым пазнанні маленькім слухачом лексічных і структурных заканамернасцей пэўнага пласта музычнай культуры. А распазнаванне знаёмых інтанацый, мелодый і твораў выклікае ў чалавека станоўчыя эмоцыі. Узнікненне такіх эмоцый і цікаўнасці да музыкі, заканамернасці якой ў пэўнай ступені ўжо вядомы слухачу, звязаны з узаемадзеяннем кароткачасовай і доўгачасовай памяці. У апошняй у кадзіравальным выглядзе захоўваецца слыхавы вопыт (найбольш часта дубліруемыя інтанацыі), а ў свядомасці ўтвараецца ўнутраная, не абавязкова ўсвядомленая, сістэма правіл, якая іх звязвае. У момант успрымання незнаёмай музыкі актывізуецца

кароткачасовая памяць, атрымліваемая музычная інфармацыя параўноўваецца з той, якая ўжо існуе ў доўгачасовай памяці. У выніку гэтага з'яўляецца прагноз бліжэйшай музычнай будучыні, і, калі ёсць даволі яўнае адхіленне паступаючага матэрыялу ад прагнозу, у эмацыянайнай ацэнцы музыкі адбываецца зрух у адмоўны бок.

Такім чынам, эмацыянальна станоўчыя адносіны слухача выклікае музыка, інфармацыя аб якой у тым ці іншым выглядзе ўжо існуе ў яго доўгачасовай памяці. Таму нельга здзіўляцца неўспрымальнасці дарослага слухача, які знаходзіцца ў адносінах да мовы пэўных музычных стыляў (фальклору, класікі і інш.) у становішчы «маўглі», якому ўжо вельмі складана, а часам і немагчыма авалодаць своеасаблівай «мовай» музычнага стылю або эпохі.

У сувязі з гэтым рэпертуар, які выкарыстоўваецца ў працэсе музычнага выхавання дашкольнікаў, мае прынцыповае значэнне для далейшага музычнага развіцця дзіцяці, фарміравання асноў яго музычнай культуры.

Фальклор з’яўляецца тым універсальным матэрыялам, які адказвае патрабаванням мастацкасці і даступнасці, “азбукай” нацыянальнай музычнай мовы. Нездарма фальклорны рэпертуар ляжаў у аснове найвядомейшых сістэм музычнага выхавання, распрацаваных Карлам Орфам і Золтанам Кодаям. Значэнне музыкі ў справе развіцця «падсвядомых элементаў венгерскага» венгерскі кампазітар, фальккларыст і педагог З. Кодай у сваёй працы “Музыка ў дзіцячым садзе” ацэньваў наступным чынам: «Первым краеугольным камнем подсознательного чувства венгерского является язык. Вторым краеугольным камнем подсознательного чувства венгерского является музыка».

Безумоўна, у працэсе далучэння дашкольнікаў да нацыянальнага музычнага фальклору фарміруюцца кампаненты музычнай культуры

асобы, «складаецца» слоўнік найбольш характэрных для нацыянальнай культуры музычных інтанацый, своеасаблівых «эталонаў» нацыянальнай музычнай мовы, многія з якіх прысутнічаюць і ў сучаснай пісьмовай музычнай культуры, што дазваляе палегчыць слухачу ўспрыманне не толькі фальклорных твораў, але і музыкі беларускіх кампазітараў, з’яў сучаснай нацыянальнай культуры.

Вырашэнне задачы **фарміравання асноў музычнай культуры асобы дашкольніка** рэалізуецца праз фарміраванне асобных кампанентаў музычнай культуры асобы дашкольніка:

— **музыкальнасці**, таму што пазнанне з'яў музычнай культуры непазбежна патрабуе пэўнага ўзроўню развіцця адпаведных здольнасцей (эмацыянальнай спагадлівасці, музычна-рытмічнага пачуцця, меладычнага слыху, рэпрадуктыўнага і прадуктыўнага музычнага мыслення);

— складаемых **музычна-эстэтычнай свядомасці**, такіх як цікаўнасць да музычнай дзейнасці і музычнага мастацтва, эстэтычных перажыванняў, музычных пераваг (першапачатковых праяў музычнага густу), ведаў аб музычным мастацтве і яго творах.

Развіццё дадзеных кампанентаў адбываецца ў адпаведнай **дзейнасці**, такіх яе відах, даступных для дзяцей гэтага ўзросту, як успрыманне музыкі, спевы, музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне, музычна-адукацыйная дзейнасць, музычная творчасць.

Музычны фальклор мае свае спецыфічныя магчымасці ў фарміраванні асобных кампанентаў музычнай культуры дзіцяці, якія павінны ўлічвацца пры азначэнні зместу работы па далучэнню дашкольнікаў да музычнага фальклору дзеля найбольш поўнага выкарыстання ўсіх магчымасцей гэтага віду мастацтва ў музычным развіцці дзіцяці.

Адной з яскравых праяў **музыкальнасці** дашкольніка з’яўляецца *эмацыянальная спагадлівасць* на музыку. Яна можа разглядацца не толькі як непасрэдная рэакцыя на настрой, характар гучання музыкі і быць звязанай з тыпам нервовай сістэмы, актыўнасцю і жвавасцю эмацыянальнай сферы, але і як праяўленне эмацыянальна-маральнай спагадлівасці, умення ўспрымаць музычны твор як зварот да слухача жывога суб’екта, умення паставіць сябе на месца іншага, адчуць яго эмацыянальны настрой. Фальклор ў гэтым сэнсе не з’яўляецца выключэннем з агульных правілаў, якім падпарадкоўваецца музычнае мастацтва: з’уляючыся мастацтвам выразным, музыка перадае разнастайныя пачуцці, настроі, эмацыянальныя становішчы і, вядома, праз «расшыфроўку» гэтага зместу музыкі адбываецца развіццё эмацыянальнай спагадлівасці. Акрамя гэтага, у шматлікіх фальклорных творах, якія захавалі найбольш архаічныя рысы музычнага мастацтва (вядомы даследчык беларускага фальклору У. Ялатаў называе гэты гістарычны этап развіцця нацыянальнай музыкі «этапам эмацыянальнай тыпізацыі»), прысутнічаюць разнастайныя інтанацыі-эмоцыі, якія змяшчаюць у сабе шмат біялагічнага і дэманструюць асноўныя модусы меладычнай выразнасці, якія застаюцца актуальнымі і для сучаснага чалавека. Гэта словы, заклікі, выклічнікі, уздыхі, імітацыі, якія страцілі семантыку і прысутнічаюць у веснавых і калядных песнях, калыханках і забаўлянках, пастуховых песнях, галашэннях і інш. Дастаткова шырокае выкарыстанне падобных першасных «музычных эмоцый» гаворыць аб іх важнасці для раскрыцця пэўнага зместу. Выкарыстанне твораў з такімі элементамі ў працы з дашкольнікамі можа садзейнічаць больш глыбокаму разуменню вобразнага і эмацыянальнага зместу музыкі, усведамленню імі генетычнай сувязі паміж моўнай і музычнай інтанацыямі.

Асноўнымі музычнымі здольнасцямі традыцыйна лічацца *музычна-рытмічнае пачуцце* (або пачуцце рытму) і *меладычны слых* (у адзінстве *ладавага пачуцця і музычна-слыхавых уяўленняў*). Што датычыцца *музычна-рытмічнага пачуцця*, яно выражаецца ў здольнасці эмацыянальна адчуваць выразнасць музычнага рытму і дакладна ўзнаўляць яго, гэта значыць эмацыянальна адлюстроўваць рытмічны малюнак, метрычную аснову музыкі, тэмп і яго змяненні. Па дадзеным К. Ул. Тарасавай, пачуцце рытму ў дашкольнікаў фарміруецца пакампанентна: спачатку — пачуцце тэмпу, потым — пачуцце метру. Найбольшую складанасць нават для старэйшых дашкольнікаў, безумоўна, выклікае дакладнае адлюстраванне рытмічнага малюнка. Менавіта гэты напрамак у развіцці музычна-рытмічнага пачуцця патрабуе найбольшай увагі з боку педагога і павінен рэалізоўвацца шляхам засваення дзецьмі сістэмы рытмічных эталонаў. Фальклорны матэрыял дазваляе засвоіць пэўную колькасць такіх эталонаў, што звязана са шматразовым дубліраваннем у розных творах пэўных рытмічных малюнкаў, якія з’яўляюцца тыповымі для фальклору. Эмацыянальны бок музычна-рымічнага пачуцця дзіцяці найбольш яскрава адлюстроўваецца ў выразнасці разнастайных рухаў пад музыку. Сярод узораў танцавальна-гульнёвага фальклору шмат такіх, дзе выкарыстоўваюцца даступныя дашкольнікам імітацыйныя рухі (танцы «Таўкачыкі», «Млынок», «Каваль» і інш.), вобразныя («Мосцік», «Пакажы, казелінька», «Жораў»), традыцыйныя танцавальныя рухі (крок полькі, элементы танцаў «Лявоніха», «Крыжачок» і інш.). Праз далучэнне дашкольнікаў да выразнага і дакладнага выканання музычна-рытмічных рухаў на фальклорным матэрыяле маецца магчымасць развіцця не толькі музычна-рытмічнага пачуцця, але і навыкаў музычна-рытмічнай дзейнасці.

*Ладавае пачуцце* — гэта здольнасць распазнавання ладавых функцый гукаў мелодыі, калі ўсе яе гукі ўспрымаюцца ў іх адносінах да тонікі і іншых ступенях ладу. Менавіта развітае ладавае пачуцце дазваляе адчуваць эмацыянальную выразнасць мелодыі. Для дзяцей дашкольнага ўзросту (і нават малодшых школьнікаў) асноўную інфармацыю аб характары музыкі нясе не столькі яе ладавая арганізацыя, колькі дынаміка, рэгістр, тэмп. Але, па дадзеным К.Ул. Тарасавай, меладычная арыентацыя пры ўспрыманні музыкі, якая сведчыць аб разуменні слухачом ўзаемазалежнасцей гукаў, распазнаванне мелодыі ў незалежнасці ад змены тэмпа, рэгістра, дынамікі, з’яўляецца ўжо ў пяцігадовым узросце. Садзейнічаць станаўленню меладычнай арыентацыі можа сістэматычная работа па назапашванню дашкольнікамі слоўніка мелодый-інтанацый у працэссе ўспрымання музыкі і спеваў. Традыцыйна шырока выкарыстоўваюцца ў музычным выхаванні дашкольнікаў творы, якія маюць у сваёй аснове мажор і мінор — актаўныя лады, шырокараспаўсюджаныя ў еўрапейскай музыцы пісьмовай традыцыі. Гэта значна збядняе слыхавы вопыт дзіцяці і накіроўвае развіццё ладавага пачуцця менавіта па гэтым шляху. Лагічна дапусціць, што вузкааб’ёмныя лады (тэрцыевыя, квінтовыя і інш.) народнай музыкі больш даступныя для дзіцячага ўспрымання, і іх засваенне павінна быць неабходным этапам у музычным развіцці дзіцяці. У свой час З. Кодай адзначаў, што для дзіцячага сада асабліва падыходзяць пентатанічныя мелодыі як больш даступныя і характэрныя для нацыянальнай музыкі (у дадзеным выпадку венгерскай). Наданне больш пільнай увагі ладавай разнастайнасці музыкі для дашкольнікаў дазволіць «акультурыраваць» іх у розных ладавых сітэмах, што адаб’ецца на якасці фарміруемага ладавага пачуцця.

Калі ладавае пачуцце — перцэптыўны (адказны за ўспрыманне) кампанент меладычнага слыху, то *музычна-слыхавыя ўяўленні* — рэпрадуктыўны (адказны за ўзнаўленне) кампанент меладычнага слыху і непасрэдна звязаны з інтанаваннем дзецьмі гукаў мелодыі голасам або выкананнем іх на музычным інструменце. Чыстае інтанаванне гукаў мелодыі з'яўляецца апошнім этапам у развіцці гэтай здольнасці, у той час як папярэднімі этапамі заваявання дзецьмі гукавой прасторы будуць гульня рэгістрамі голаса, прагаворванне слоў у рытме напеву, інтанаванне мелодыі на 1—2 гуках, узнаўленне агульнага напрамку мелодыі з чыстым інтанаваннем большай ці меншай колькасці яе гукаў. Але ў сваім індывідуальным паэтапным станаўленні (антагенэзе) гэтай здольнасці дашкольнік праходзіць амаль што тыя самыя этапы, што і Чалавек у сваім гістарычным развіцці (філагенэзе). Менавіта ва ўзорах фальклору зафіксаваны і захаваны этапы станаўлення музычнага мыслення Чалавека, адлюстраваны ў тыповых напевах і характэрныя для розных перыядаў гэтага станаўлення тыпы інтанавання мелодыі. Такім чынам, шлях дзіцяці да чыстага інтанавання непазбежна ідзе праз засваенне першасных тыпаў інтанавання, якія ў сваю чаргу зафіксаваны ў фальклорных узорах розных жанраў. Гэтыя ўзоры прапануюць інтанацыйныя і ладавыя эталоны, паслядоўнае засваенне якіх з'яўляецца неабходным крокам у індывідуальным музычным развіцці.

Нельга не спыніцца і на такой асаблівасці песеннага фальклору, як пераважнае выкананне гэтых твораў без акампанемента (a capella). Улік гэтай асаблівасці і выкарыстанне ў працы з дашкольнікамі менавіта такіх спеваў дазваляе больш плённа працаваць над фарміраваннем чысціні інтанавання, што азначае і дадатковыя магчымасці ў развіцці меладычнага слыху дзіцяці.

Музычнае мысленне дашкольніка трактуецца як усведамленне выразнасці музычнага вобраза на аснове распазнавання музычных інтанацый, іх змены і развіцця. *Рэпрадуктыўнае музычнае мысленне* звязана з разуменнем успрынятага музычнага вобраза, а ўзровень яго развіцця ў дашкольніка ацэньваецца па выказваннях аб настроі і характары музыкі, вылучэнні жанру твора, разуменні яго функцыянальнага прызначэння. У развіцці гэтай здольнасці фальклор не мае асаблівых пераваг перад іншым музычным рэпертуарам, напрыклад, класічнай музыкай. Справа ў тым, што ў большасці выпадкаў асобны аўтарскі твор можа адлюстроўваць значна больш эмацыянальных адценняў, выкарыстоўваць больш яскравыя сродкі выразнасці. У фальклоры больш тыповасці інтанацый і рытмаў (за выключэннем позніх яго пластоў), эмацыянальныя адценні больш аднародныя ў межах пэўнага жанру. Прынцыповая розніца ў характары і вобразах фальклору назіраецца пры супастаўленні твораў, якія належаць да розных жанраў. Таму, дзеля больш эфектыўнага развіцця рэпрадуктыўнага музычнага мыслення дашкольніка, пашырэння яго ўяўленняў аб характары музыкі, неабходна дэманстрацыя жанравай разнастайнасці фальклору, знаёмства з розным функцыянальным прызначэннем гэтых жанраў і, як вынік гэтага, — разуменне дашкольнікамі настрою і характару фальклорных твораў менавіта ў сувязі з жанрам.

Вельмі шырокія магчымасці мае фальклор у развіцці *прадуктыўнага музычнага мыслення,* якое праяўляецца ў дашкольнікаў праз стварэнне ўласных невялічкіх «сачыненняў», якія, часцей за ўсё, носяць імправізаваны характар — адначасова «мысляцца» і выконваюцца, ствараюцца «з ходу». Тыповасць рытмікі, ладавай будовы розных узораў фальклору ў межах пэўнага жанру (напрыклад, калыханак) значна палягчаюць стварэнне сваёй імправізацыі ў гэтым жанры, якая ў дадзеным выпадку ствараецца па пэўнай «формуле» і

робіць музычную творчасць даступным відам дзейнасці амаль для кожнага дзіцяці. Самі фальклорныя творы, як правіла, існуюць у вялікай колькасці варыянтаў, якія некалькі адрозніваюцца рытмікай, мелодыяй, тэкстам. Успрыманне дашкольнікамі такіх варыянтаў дазваляе ім добра ўсвядоміць саму магчымасць варыятыўнага выкладання музычнага матэрыялу, убачыць магчымыя варыянты змены твора, тым самым актывізаваць іх уласную творчасць.

У фарміраванні складаемых **музычна-эстэтычнай свядомасці** музычны фальклор паспяхова садзейнічае фарміраванню *цікаўнасці* дзяцей да музычнай дзейнасці. Злітнасць у адным творы шматлікіх элементаў (песні, танца, ігры на інструменце, гульні) дазваляе кожнаму дзіцяці праявіць сябе ў найбольш цікавых для яго відах музычнай дзейнасці і, адначасова, вымушае яго ўдзельнічаць у іншых відах. Існуючая цесная сувязь фальклору са з’явамі жыцця робіць музычны матэрыял больш прывабным для дашкольніка, дазваляе выходзіць за рамкі выключна музычнай дзейнасці. Складана весці размову аб ролі фальклорнага рэпертуару ў фарміраванні *музычных пераваг* дашкольнікаў. Згадзіцеся, цяжка ўявіць сабе дашкольніка, які будзе аддаваць фальклору перавагу перад, напрыклад, сучаснай музыкай, вакальнымі творамі для дзяцей і інш. Але, безумоўна, уключанасць у музычную дзейнасць фальклорных твораў зафіксуе ў падсвядомасці дзіцяці каштоўнасць фальклору, дазволіць вызначыць яго месца і ролю ў музычнай культуры грамадства. Усё гэта ў больш сталым узросце, калі нават і не вырасце ў асаблівую зацікаўленасць гэтым відам мастацтва, то дазволіць з павагай адносіцца да фальклорнай культуры, разумець і прымаць яе.

Спецыфічныя магчымасці фальклору ў атрыманні *ведаў* аб музычным мастацтве датычацца ўдакладнення і пашырэння ўяўленняў дашкольнікаў аб музычных жанрах, тых з іх, якія прысутнічаюць у

музыцы пісьмовай традыцыі (разнастайныя песенныя і танцавальныя жанры), знаёмства з музычнымі фальклорнымі жанрамі (заклічка, забаўлянка, жанры каляндарна-абрадавага фальклору і інш.). Знаёмства з гучаннем традыцыйных беларускіх музычных інструментаў (скрыпкі, цымбал, дуды, гармоніка, балалайкі і інш.), іх назвамі і асаблівасцямі канструкцыі дазволіць пашырыць уяўленні дзяцей аб музычных інструментах увогуле, актывізаваць музычнае ўспрыманне і разумовую актыўнасць дзяцей (напрыклад, пры параўнанні гучання аднаго твора у выкананні розных фальклорных інструментаў і інструментаў сімфанічнага аркестра). Разам з атрыманнем і пашырэннем ведаў аб музычным мастацтве дашкольнік атрымае веды і пра канкрэтныя музычныя творы фальклору, што зробіць гэтыя творы распазнаваемымі для яго, дазволіць стварыць у свядомасці дашкольніка своеасаблівы «каталог» агульнавядомых нацыянальных музычных сімвалаў (мелодыі «Юрачкі», «Мікіты», «Лявоніхі», напеваў калыханак, калядак і інш.).

Такім чынам, нацыянальны музычны фальклор, пашырэнне выкарыстання якога ў выхаванні дашкольнікаў абумоўлена сучасным сацыякультурным становішчам, мае і разнастайныя магчымасці ў музычным развіцці дашкольніка, фарміраванні кампанентаў яго музычнай культуры.

Выкарыстанне педагогам твораў музычнага фальклору ў працы з дашкольнікамі патрабуе спецыяльных ведаў аб асаблівасцях фальклору як віду мастацтва, аб некаторых асаблівасцях ладавай, рытмічнай будовы твораў беларускага музычнага фальклору.

## Улік спецыфікі фальклорнага мастацтва і асаблівасцей беларускага музычнага фальклору пры далучэнні да яго дзяцей дашкольнага ўзросту

Музычны фальклор як від мастацтва, у незалежнасці ад яго нацыянальнай прыналежнасці, мае **спецыфічныя рысы**, якія значна адрозніваюць яго ад музыкі пісьмовай традыцыі і павінны ўлічвацца ў арганізацыі працы з дашкольнікамі. Яшчэ раз звернем увагу на тыя з іх, якія можна лічыць найбольш значнымі з пункту гледжання метадычных аспектаў далучэння да фальклору.

1. *Вуснасць* народнай музыкі. Менавіта вуснасць абумоўлівае спецыфічнасць форм і характар фальклорнай музыкі і з’яўляецца галоўнай якасцю, якая супрацьпастаўляе фальклор пісьмовай культуры. Існуючы ў музыказнаўстве семіатычны падыход, які трактуе музычную мову як знакавую сістэму, у якой існуе прынцыповая розніца паміж непасрэдным выказваннем і выказваннем кадыфіцыраваным, дазваляе гаварыць аб наяўнасці ў музычнай мове двух «суб’языкоў» — пісьмовага і вуснага. Пісьмовая культура носіць сёння дамініруючы характар: у выніку гэтага з’явы вуснай культуры вывучаюцца на ўсіх узроўнях музычнай адукацыі праз прызму прынцыпаў пісьмовай культуры. Такі падыход да вывучэння фальклору крытыкуецца сучаснымі даследчыкамі. Суіснаванне двух «суб’языкоў» у межах музычнай мовы любой культуры з’яўляецца ўмовай жыццяздольнасці музычнай культуры ўвогуле, паколькі музычныя з’явы пераносяцца з аднага субпатока ў іншы, узбагачаючы адзін аднаго. Таму для развіцця музычнай культуры прынцыпова важна захаваць дадзенае вусна-пісьмовае «двухмоўе», а пры дамініраванні пісьмовай культуры гэта магчыма праз свядомы зварот да вусных форм музычных зносін і памнажання носьбітаў гэтага «двухмоўя». Такім чынам, авалодванне

вусным спосабам выкладання музычнай думкі (праз фальклор, джаз і іншыя вусныя віды творчасці), прысваенне не столькі музычнага матэрыялу, колькі механізмаў яго стварэння праз вуснае музіцыраванне, становўча адаб'ецца не толькі на індывідуальным музычным развіцці, але і стане фактарам развіцця музычнай культуры. Гэты факт можа лічыцца дадатковым аргументам у пытанні аб значнасці далучэння да фальклору на ўсіх узроўнях музычнага выхавання і адукацыі.

Улічваючы спецыфіку дашкольнага ўзросту, няма неабходнасці акцэнтаваць увагу на вусным «уваходжанні» ў фальклор, што мае прынцыповае значэнне для тых узроўней адукацыі, дзе слухачы больш знаёмыя з пісьмовай традыцыяй і неабходна пазбегнуць адмоўнага пераносу навыкаў успрымання і выканання музыкі пісьмовай традыцыі. Уваходжанне дзіцяці ў музычную культуру заўсёды вуснае. Непасрэдным жа вывадам, які мае метадычнае значэнне, будзе пераважлівасць вывучэння песеннага фальклору «з голасу» без выкарыстання інструмента, што дае магчымасць выкарыстоўваць найбольш зручныя дыяпазоны, інтанаваць больш чыста.

2. Вуснасць фальклору абумоўлівае наступную яго рысу — спецыфічныя *механізмы перадачы і ўспрымання*. Фальклор уяўляе сабой кантактны тып камунікацыі, натуральны тып мастацкіх зносін. Таму непасрэдны кантакт, натуральнае для фальклору бытавое і прыроднае асяроддзе з'яўляецца важнай умовай яго ўспрымання. Але знаёмства з фальклорам ва ўмовах дашкольнай установы непазбежна звязана з такой з'явай, як фальклрызм — існаванне фальклору ў іншых відах культуры, дзе ён непазбежна прапануецца слухачу ў другасных формах (у апрацоўках). Аднак больш адэкватныя ўяўленні аб фальклоры могуць даць аўтэнтычныя запісы, якія дазваляюць паменьшыць супярэчнасці паміж неабходнасцю непасрэднага кантакту і яго немагчымасцю ва ўмовах адукацыйнай установы. Акрамя таго,

дапамагчы стварыць блізкае да натуральнага бытавое асяроддзе можа далучэнне да працэсу знаёмства з музычным фальклорам разнастайнага этнаграфічнага матэрыялу, адпаведнай інфармацыі і прадметаў матэрыяльнай культуры.

3. Наступныя рысы — *варыянтнасць і варыятыўнасць* фальклору, якія таксама з’яўляюцца вынікам вуснасці гэтага віду мастацтва. *Варыянтнасць* — форма існавання фальклору і адлюстроўваецца ў варыянтах фальклорнага твора (у гэтым выпадку існуе агульная мадэль — інварыянт, на аснове якога можа будавацца вялікая колькасць твораў, якія нязначна адрозніваюцца тэкстам або мелодыяй). Варыятыўнасць — гэта спосаб існавання фальклорнай традыцыі, які падкрэслівае імправізацыйны характар стварэння фальклорнага ўзору. Падкрэсліванне варыятыўнасці фальклору пры азнаямленні з ім і больш глыбокае яго засваенне праз стварэнне ўласных варыянтаў на аснове зафіскаванага фальклорнага твора, які будзе выступаць у гэтым выпадку своеасаблівым інварыянтам, можа дапамагчы засвоіць сам механізм вуснай музычнай творчасці. Такім чынам, варыянтнасць фальклору можа быць адлюстравана праз дэманстрацыю дашкольнікам розных варыянтаў аднаго твора, а варытыўнасць — праз пабуджэнне дзяцей да стварэння ўласных імправізацый.

4. *Наяўнасць тыповых напеваў*, якія, як своеасаблівыя формулы, «вандруюць» з аднаго твора ў другі ў межах аднаго жанру (асабліва ў жанрах абрадавага фальклору). У выніку гэтага такія музычныя ўзоры маюць падобную ладавую або рытмічную будову, якая адчуваецца слухачом як нацыянальна спецыфічная, адлюстроўвае інтанацыйную самабытнасць беларускай народнай музыкі. Як было сказана раней, засваенне дашкольнікамі гэтых тыповых інтанацый з’яўляецца неабходнай «школай» фарміравання навыкаў чыстага інтанавання,

глыбокага засваення найбольш характэрных для нацыянальнай музычнай мовы інтанацый.

5. *Сінкрэтычнасць* фальклору, якая выражаецца праз злітнасць шматлікіх элементаў (музыкі, спеваў, рухаў, гульні). Менавіта сінкрэтычнасць робіць музычны фальклор прывабным і даступным для дашкольнікаў, светаўспрыманне якіх таксама сінкрэтычна.

Гэтыя асаблівасці фальклору дазваляюць вылучыць некаторыя **рэкамендацыі**, якія датычацца адбору музычнага фальклорнага матэрыялу і арганізацыі працы па далучэнні дашкольнікаў да гэтага віду мастацтва. Асноўнымі сярод іх можна лічыць наступныя:

— разам з зафіксаванымі пісьмовай культурай традыцыйнымі ўзорамі і апрацоўкамі фальклору пажадана выкарыстоўваць *гуказапісы аўтэнтычнага гучання;*

— пры наяўнасці варыянтаў вакальнага твора з акампанементам і без яго, неабходна аддаваць перавагу *выкананню a capella;*

— адбіраць для дашкольнікаў тыя ўзоры музычнага фальклору, у якіх прысутнічаюць *найбольш характэрныя рытмічныя і ладавыя формулы*;

— па магчымасці даносіць да маленькіх слухачоў *некалькі варыянтаў аднаго твора* з наступным развучваннем аднаго з іх і *імправізацыяй дзецьмі ўласных варыянтаў;*

— знаёміць з *рознымі жанрамі* музычнага фальклору і *рознымі тыпамі інтанавання* ў працэсе выканання вакальных твораў і *уласных імправізацый у розных жанрах*;

— выконваць патрабаванне *даступнасці* зместу фальклорнага твора;

— выкарыстоўваць *усе віды дзіцячай музычнай дзейнасці* (а па магчымасці — і *іншыя віды дзейнасці* дашкольнікаў) пры вывучэнні

фальклорнага твора з *уводзінамі слухачоў у кантэкст*, у якім гэты твор існаваў і існуе;

— аддаваць перавагу *гульнёвай форме* музычных заняткаў па азнаямленні з фальклорам.

У сувязі з выказанай вышэй рэкамендацыяй выкарыстоўваць у працы з дашкольнікамі музычныя творы, у якіх прысутнічаюць *найбольш характэрныя рытмічныя і ладавыя формулы*, што абумоўлена неабходнасцю засваення дашкольнікамі некаторых музычна-моўных норм нацыянальнай музыкі, коратка ахарактарызуем тыя **асаблівасці беларускага музычнага фальклору**, якія могуць лічыцца нацыянальна-характэрнымі з аднаго боку, і, з другога, быць даступнымі для засваення дашкольнікамі.

Адна з самых устоўлівых прымет нацыянальнай характэрнасці — *ладавы бок* беларускага музычнага фальклору. Сярод разнастайных ладоў найбольш характэрнымі і даступнымі для засваення дашкольнікамі з’яўляюцца наступныя:

— *секундавыя лады* (два суседніх гукі), якія распаўсюджаны ў жанрах дзіцячага фальклору і дзіцячай песнятворчасці;

— *тэрцыевыя лады* (тры гукі), нацыянальна спецыфічным варыянтам якіх з’яўляецца вельмі распаўсюджаны ў жніўных, дзіцячых песнях, калыханках *тэрцыевы лад з субквартай* (напрыклад: *рэ1 — соль1 — ля1 — сі1*), у якім да ніжняга тону тэрцыевага ладу дадаецца незапоўненая кварта (у разглядаемым выпадку *рэ1*), і які, між іншым, ужо мае мажорнае або мінорнае нахіленне ў залежнасці ад верхняга гуку тэрцыі (у разглядаемым выпадку *сі1* дае мажорнае нахіленне, *сі-бемоль1* — мінорнае);

— *лады з цэнтральнай тонікай*, якія ўтварыліся з тэрцыевых ладоў з субквартай ў працэсе запаўнення субкварты паслядоўнасцю гукаў (чатыры гукі ніжняга тэтрахорду, напрыклад: *рэ1 — мі1 — фа1 —*

*соль1*) і дабаўленнем верхняга гуку да тэрцыі (чатыры гукі верхняга тэтрахорду, напрыклад: *соль1 — ля1 — сі1 — до2* ), тоніка ў якіх застаецца ў цэнтры (у разглядаемым выпадку — *соль1*), а крайнія гукі (ладавая рамка) ўтвараюць малую сэпціму (*рэ1 — до2*);

— *лады з ніжняй тонікай*, якія ўзніклі ў выніку пераасэнсавання ладавых узаемаадносін у ладах з цэнтральнай тонікай, сярод якіх вылучаюцца лад з ладавай рамкай малая сэпціма, квінтовы лад (пяць ступеняў у межах квінты гукаў), актаўныя лады (звычныя нам мажор і мінор);

— *пентатоніка* (пяць ступеняў у межах актавы), якая з'уляецца эпізадычным ладам у беларускім фальклоры (сустракаецца толькі безпаўтонавая пентатоніка, якую могуць утвараць, напрыклад, наступныя гукі: *до1 — рэ1 — мі1 — соль1 — ля1*; *рэ1 — мі1 — соль1 — ля1 — до2*; *мі1 — соль1 — ля1 — до2 — рэ2* і г. д.); але пентатанічныя абароты дастаткова распаўсюджаны ва ўзорах розных жанраў (веснавых песнях, жанрах дзіцячага фальклору) і надаюць гэтым творам незвычайную выразнасць і каларыт.

Існуюць нацыянальна-характэрныя рысы і ў рытмічнай арганізацыі твораў беларускага фальклору. Для нас найбольш цікавыя наступныя з іх:

— *тыповыя рытмічныя малюнкі* ва ўзорах абрадавага фальклору, напрыклад: два чатырохдольніка (./ ./ ./ ./ | ./ ./ ./ ./) у вяснянках, купальскіх песнях, характэрныя рытмічныя схемы (./`./`./`././` і ././`./`./) у калядках, шчадроўках, схема з распевам пятага гуку (./`./`./`./`./) у калядных, жніўных, восеньскіх, лірычных песнях;

— разнастайныя *рэфрэны* (прыпевы, запевы, устаўкі, эмацыянальныя выгукі, выклічнікі і інш.), якія звычайна рытмічна адрозніваюцца ад іншых музычных фраз твора і жанрава азначаюць

характар (напрыклад, выклічнікі «А!», «У!» у веснавых песнях, «а-а-а» — у калыханках, «Каляда!» — у калядках і інш).

Усведамленне акрэсленых спецыфічных рыс музычнага фальклору ўвогуле, ладавых і рытмічных асаблівасцей беларускага музычнага фальклору дазволіць больш свядома арганізаваць працу па далучэнні да яго дашкольнікаў, лепш зразумець выкладзеныя ніжэй метадычныя рэкамендацыі, выкарыстаную ў іх тэрміналогію і агульныя падыходы да адбору твораў, метадаў і форм данясення фальклорнага матэрыялу, больш глыбока асэнсаваць яго магчымасці ў музычным развіцці і фарміраванні кампанентаў музычнай культуры дашкольніка.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ДАЛУЧЭННІ СТАРШЫХ ДАШКОЛЬНІКАЎ ДА БЕЛАРУСКАГА МУЗЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ

## Агульная характарыстыка сістэмы заняткаў

Пры арганізацыі сістэматызаванага вывучэння беларускага музычнага фальклору з дашкольнікамі неабходна улічваць наступную супярэчнасць паміж заканамернасцямі працэсу выхавання і аб’ектыўнымі асаблівасцямі фальклору. Так, логіка навучання і развіцця патрабуе паступовага ускладнення вывучаемых з’яў, замацавання і супрацьпастаўлення вядомага з новым матэрыялам. У той жа час спецыфіка фальклору, значную частку якога складае каляндарна-абрадавы фальклор, патрабуе дакладнага суаднясення вывучэння твора з пэўным сезонам. Таму, на наш погляд, ўвесь прапанаваны для вывучэння старэйшымі дашкольнікамі фальклорны матэрыял неабходна і магчыма аб’яднаць у пэўныя тэмы, у межах якіх паслядоўна вырашаць як агульныя задачы музычнага развіцця дзіцяці, фарміравання кампанентаў яго музычнай культуры, так і задачы, спецыфічныя для кожнай тэмы.

У “Музычнай скарбонцы” прадстаўлены распрацоўкі па наступных тэмах: «Уводзіны ў фальклор», «Кірмаш», «Калыханкі», «Зімовы фальклор», «Заняткі нашых продкаў», «Беларускія музычныя інструменты», «Веснавы фальклор», у кожную з якіх уваходзіць 4—6 заняткаў, аб’яднаных пэўнымі сюжэтамі і гульнёвымі сітуацыямі, створанымі з дапамогай лялек або батлеечных персанажаў. Прапанаваная паслядоўнасць тэм дазваляе карыстацца дадзеным матэрыялам на працягу навучальнага года («Уводзіны ў фальклор» — верасень-кастрычнік, «Кірмаш» — кастрычнік-лістапад, «Калыханкі» —

лістапад-снежань, «Зімовы фальклор» — снежань-студзень, «Заняткі нашых продкаў» — студзень-люты, «Музычныя інструменты» — люты-сакавік, «Веснавы фальклор» — сакавік-красавік).

Акрамя таго, ад тэмы да тэмы запланавана (па магчымасці) ускладненне (напрыклад, у ладавых адносінах) музычнага матэрыялу, выканальніцкіх і творчых заданняў для дзяцей, пашырэнне іх ведаў аб жанрах і музычных інструментах. Так, напрыклад, пры вывучэнні тэмы *«Уводзіны ў фальклор»* музычны фальклорны матэрыял цесна звязаны з практыкай моўных інтанацый, гукаперайманнямі — дзеці знаёмяцца з жанрамі, якія іх найбольш выразна адлюстроўваюць (былічка, прычыт, пастухоў найгрыш і інш.). Таксама прадстаўлены творы, пабудаваныя ў найбольш вузкіх ладах — тэрцыевых, уключаючы і тэрцыевы лад з субквартай. У межах гэтых ладоў дзеці выконваюць заданні, звязаныя са спевамі і музіцыраваннем, з найбольш даступнымі ім творчымі праявамі, якія носяць сінкрэтычны характар (заданні па агучванні былічкі і казкі). Падчас выканання музычна-рытмічных рухаў дашкольнікі замацоўваюць свае ўяўленні аб танцавальных жанрах полькі і кадрылі, гучанні скрыпкі.

Ужо пры вывучэнні тэмы *«Кірмаш»* акрамя тэрцыевых ладоў ад выхавальнікаў патрабуецца выкананне тэтрахордаў, у рэпертуары з'яўляецца пентатоніка («Ішоў Бай») і лад з цэнтральнай тонікай і ладавай рамкай «малая сэпціма» («Гойда, гойда, гайдамаш»). Вялікая ўвага надаецца жанру забаўлянкі, асаблівасцям іх рытмічнай будовы і выкладання тэксту ў іх, выкананню на аснове гэтых твораў музычна-творчых заданняў, сярод прапанаваных у тэме танцаў - «Лявоніха», «Юрачка», «Мосцік», музычных інструментаў - скрыпка, цымбалы, дудка, гармонік, ліра.

Тэма *«Калыханкі»* дае магчымасць у працэсе спеваў, музіцыравання і вакальнай імправізацыі (ёй надаецца асобая ўвага)

замацаваць уяўленні аб тэрцыевых ладах (менавіта ў гэтым жанры тэрцыевы лад з субквартай прадстаўлены ў амаль што схематычным выглядзе), мажорным і мінорным нахіленні ў іх (на прыкладзе варыянтаў з розным ладавым нахіленнем), фарміраваць навыкі інтанавання ў квартавых ладах і пентатоніке, пазнаёміць з раўнамерным і пункцірным рытмічнымі малюнкамі. Праз супрацьпастаўленне дзвух узораў — калыханкі і забаўлянкі з падобнымі вобразамі — замацоўваюцца ўяўленні дзяцей аб характары і функцыянальных асаблівасцях гэтых жанраў.

Заняткі тэмы *«Зімовы фальклор»* прызваны, у першую чаргу, пазнаёміць дзяцей з каляндарна-абрадавым фальклорам, некаторымі традыцыямі правядзення зімовых свят беларусаў. Але праз заняткі вырашаюцца і задачы музычнага развіцця дзяцей. У працэсе спеваў, музіцыравання на шумавых інструментах, рухаў яны знаёмяцца з тыповымі рытмічнымі малюнкамі калядак і шчадровак (праз параўнанне варыянтаў твораў), з такой рытмічнай і меладычнай асаблівасцю, як рэфрэн («Гэй, каляда!», «Добры вечар!»). У гукавысотных адносінах з’яўляецца інтэрвал чыстай квінты, які інтаніруецца дзецьмі. Прысутнасць ужо знаёмых дзецям ладоў (секундавы і тэрцыевы, тэрцыевы з субквартай, лад з цэнтральнай тонікай) дапамагае замацаваць уяўленні аб ладавых адносінах, ствараць уласныя варыянты шчадровак. Пашыраюцца і веды аб жанрах: акрамя спецыфічна фальклорных калядак і шчадровак адбываецца знаёмства з танцам «Жораў» (танцавальная лексіка падобна да «Мосціка»), калядным танцам-гульнёй «Пакажы, казелінька» і музычнымі інструментамі (парныя дудкі).

У сувязі з наяўнасцю шматлікіх фальклорных твораў, тэматыка якіх звязана з заняткамі земляроба і рамесніка, прыладамі працы, прапануецца тэма *«Заняткі нашых продкаў».* Большую частку

музычнага рэпертуару ў гэтай тэме складае танцавальная музыка, якая дазваляе дзецям праявіць свае творчыя здольнасці падчас стварэння рухавых імправізацый-імітацый, пачуццё рытму падчас музіцыравання на дзіцячых інструментах, фарміраваць навыкі выразных і дакладных рухаў («Шастак», «Таўкачыкі», «Млынок», «Каваль»). Пры вывучэнні гэтай тэмы дзеці знаёмяцца з познетрадыцыйным песенным узорам «Я табун сцерагу», які У. Ялатаў называў сапраўдным шэдэўрам песеннага фальклору. Прысутнічае і жанр забаўлянкі, на аснове якога ў працэсе самастойнага дзіцячага выканання на ксілафоне замацоўваецца тэрцыевы лад з субквартай («Сіўка-варонка»), удакладняюцца ўяўленні дзяцей аб мажорных і мінорных ладах (імправізацыя на тэкст забаўлянкі «Коў-коў, кавалёк»).

Тэма *«Беларускія музычныя інструменты»* дазваляе, па-першае, абагульніць і пашырыць веды аб традыцыйных інструментах (скрыпка, цымбалы, дудка, парныя дудкі, пішчык, дуда, гармонік, балалайка) і, адначасова з гэтым, аб музыцы і рухах да танцаў («Лявоніха», «Юрачка», «Мікіта», «Крыжачок», «Старажытны палескі вальс») падчас успрымання, музычна-рытмічных рухаў, музіцыравання, падпявання (песні «Іграў я на дудцы», «Зайграй жа мне, дударочку»). Пры выкананні на ксілафоне імён танцораў (Лявоніха, Мікіта, Юрачка) дзеці практыкуюцца ў інтанаванні і ігры на інструменце мажорнага трохгучча і малой сэксты.

Тэма *«Веснавы фальклор»* зноў звяртаецца да абрадавага боку фальклору. У музычным матэрыяле тэмы прадстаўлены пентатоніка («Жаваронaчкі, прыляціце»), квінтовы лад («Дазвольце, людзі») і лад з ніжняй тонікай і ладавай рамкай «малая сэпціма» («Свяці, свяці, сонейка»), які засвойваецца ў спевах і выкананні на ксілафоне ладавай рамкі - інтэрвала малай сэпцімы. У рытмічных адносінах гэты матэрыял таксама дастаткова складаны — прысутнічаюць распевы гукаў. У іншых

тэмах дашкольнікі не сустракаліся і з традыцыйным для веснавога цыклу карагодам «крывым танком» і жанрам заклічкі, на матэрыяле якой выконваюцца музычна-творчыя заданні.

У матэрыялах тэм рэкамендаваны і літаратурныя творы, сярод якой галоўнае месца займаюць казкі і лічылкі. Усе яны суадносяцца з тэмай заняткаў. Некаторыя казкі непасрэдна выкарыстоўваюцца з мэтай музычнага развіцця дзіцяці («Баран-бок абадран», паданне «Пра зязюлю», «Людзей слухай, а свой розум май», «Піліпка-сынок»), некаторыя могуць стаць дадатковым літаратурным матэрыялам, які будзе існаваць і ў адрыве ад музычнай дзейнасці («Як воўк калядаваць хадзіў», «Два камяні»). Большасць лічылак выкарыстоўваецца па іх непасрэдным прызначэнні: у гульні, пры выбары ролі, неабходнасці ўсталяваць чаргу падчас выканання пэўных заданняў.

Знаёміць дашкольнікаў з прапанаваным матэрыялам можна ў самых разнастайных формах арганізацыі музычнага выхавання ў дашкольнай установе. Шырокія магчымасці ён мае пры падрыхтоўцы розных відаў музычных заняткаў. Так, пры правядзенні тэматычных заняткаў (тэмай якога можа стаць любая з тэм “Музычнай скарбонцы”), педагог будзе мець магчымасць адабраць з прапанаванага матэрыялу той, які палічыць найбольш цікавым, або яго выкарыстанне мэтазгодным з пункту гледжання індывідуальных асаблівасцей дзяцей, ступені іх знаёмства з фальклорным мастацтвам. Амаль што кожны з прапанаваных у планаванні заняткаў, дапоўнены задачамі і адпаведным матэрыялам па іншым відам дзіцячай дзейнасці (маўленне, выяўленчая, дэкаратыўна-прыкладная, тэатральная дзейнасць), можа стаць асновай для правядзення комплексных заняткаў. Пры правядзенні тыпавога музычнага занятку можа выкарыстоўвацца адзін з фальклорных твораў і 1—2 віды музычнай дзейнасці дзяцей (напрыклад, успрыманне і спевы, спевы і музычна-рытмічныя рухі, спевы і музіцыраванне, спевы і

песенная творчасць, музычна-рытмічныя рухі і музіцыраванне і інш.). Музычны кіраўнік можа арганізаваць і правядзенне забаў (1-2 разы на месяц), для якіх падыйдзе матэрыял тэм “Кірмаш”, “Зімовы фальклор”, “Заняткі нашых продкаў”, “Веснавы фальклор”. Дадзены матэрыял можа быць паспяхова выкарыстаны і пры падрыхтоўцы фальклорных святаў (матэрыял тэм “Зімовы фальклор”, “Веснавы фальклор”). Асобныя творы “Музычнай скарбонкі”, як і метадычныя парады па азнаямленні з імі, могуць перайсці і у “педагагічную скарбонку” не толькі музычных кираўнікоў, але і выхавацеляў, якія маюць пэўную музычную падрыхтоўку і, напрыклад, пад час правядзення заняткаў па развіцці маўлення пажадаюць узбагаціць уяўленні дашкольнікаў пра жанры дзіцячага фальклору (забаўлянкі, калыханкі і інш.). Але найбольш эфектыўнай формай можа стаць спецыяльна арганізаваны цыкл заняткаў (1 раз на тыдзень, магчыма ў другой палове дня) або музычны гурток. Менавіта для такіх форм, у якіх ў поўнай меры магчыма паслядоўнае і сістэматызаванае, усебаковае вывучэнне усяго матэрыялу, прапанавана планаванне. Але планаванне музычнай дзейнасці дзяцей на занятках (па кожнай тэме), гульнёвыя сітуацыі і сюжэтны бок заняткаў з’яўляюцца прыкладнымі і ні ў якім разе не прэтэндуюць на аксіёму. Колькасць часу на развучванне некаторых твораў (для далейшага выканання «на сцэне») можа быць павялічана, частка прапанаванага матэрыялу з поспехам можа быць заменена на іншы ў тым выпадку, калі пры гэтым не парушацца выкладзеныя вышэй агульныя падыходы да адбору музычнага матэрыялу і арганізацыі працы з ім. Галоўнае, ад чаго немагчыма будзе адмовіцца, так гэта ад актыўнага ўзаемадзеяння дарослага з дзецьмі, ад яго шчырага жадання працаваць у гэтым накірунку.

Метадычная распрацоўка па кожнай тэме ўключае ў сябе ўказанне відаў дзіцячай дзейнасці, прапанаваны да яе фальклорны матэрыял, яго

кароткую характарыстыку з пункту гледжання найбольш яскравых асаблівасцей, а таксама задачы выкарыстання дадзенага рэпертуару з мэтай фарміравання кампанентаў музычнай культуры дашкольніка (усё гэта прадстаўлена у табліцах). Далей падаецца пералік неабходнага абсталявання, музычных інструментаў і г. д., літаратурных твораў, аўдыязапісаў і натаваных твораў (у кожнай тэме даецца асобная нумерацыя твораў; робіцца спасылка на фальклорны зборнік або аўдыяносьбіт *(гл.* адпаведна літаратуру або спіс фонадакументаў да раздзела), магчымы сюжэт і гульнёвыя сітуацыі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі заняткаў

### Тэма «Уводзіны ў фальклор»

| № занятку | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці; абсталяванне | Задача выкарыстання Фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| 1. | Успрыманне твору | Былічка «Цялушачка» (аўтэнтычны ўзор у аўдыязапісе). Апавядальны тэкст дапоўнены інструментальнымі эпізодамі, якія выконваюцца на скрыпцы і суадносяцца з эмацыянальным станам дзеючых асоб або з'яўляюцца гукаперайманнямі (пастушы рог, мыканне каровы і інш.) | Фарміраванне цікаўнасці да фальклору, уяўленняў аб выяўленчым і выразным значэнні музычных інтанацый; пашырэнне ведаў аб скрыпцы |
| | Успрыманне і падпяванне | Інструментальныя эпізоды былічкі «Цялушачка» | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці ў працэсе «расшыфроўкі» эмоцый, увасобленых у музычных інтанацыях і ўзнаўленне голасам эмацыянальна афарбаваных гукаперайманняў |
| | Успрыманне і падпяванне | Песня «Пастухоў найгрыш на трубе» (гл. ніжэй спіс натаваных твораў, № 1). Песенныя інтанацыі імітуюць гучанне рога пастуха. Аснова — тэрцыевы лад з субквартай | Развіццё ладавага пачуцця, навыкаў чыстага інтанавання гукаў у тэрцыевым ладзе з субквартай |
| | Рухомая гульня са спевамі | Гульня «Воўк і авечкі», лічылка № 1. Песня да гульні будуецца ў трыхордавым ладзе, крайнія гукі якога — вялікая тэрцыя | Развіццё ладавага пачуцця, навыкаў чыстага інтанавання гукаў у дыяпазоне вялікай тэрцыі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Успрыманне | Прычыт «Зязюленька мая шэранькая» (аўтэнтычны узор у аўдыязапісе). Традыцыйны ўзор жанру. Яскравая асаблівасць — увасабленне эмацыянальнага стану з дапамогай кантрастна-рэгістравага тыпу інтанавання | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці; фарміраванне ўяўленняў аб шляхах выражэння стана адчаю, суму ў фальклорых узорах; знаёмства з жанрам прычыту |
| 2. | Успрыманне, вакальная імправізацыя | Прычыт «Зязюленька мая шэранькая» | Замацаванне ўяўленняў аб жанры; фарміраванне ўмення адлюстроўваць эмоцыі з дапамогай кантрастна-рэгістравага тыпу інтанавання |
| | Маляванне | Контурныя выявы выканаўцы прычыту (бабуля), каляровыя алоўкі. Партрэтная выява з характэрнай для жанра прычыту мімікай | Замацаванне ўяўленняў аб эмацыянальным змесце жанру прычыту з выкарыстаннем колеравых асацыяцый |
| | Успрыманне твора | Паданне «Пра зязюлю». У тэксце прысутнічае гукапераймение спеваў зязюлі | Пашырэнне ведаў пра паданне |
| | Інтанаванне гукапераймання, музіцыраванне | Паданне «Пра зязюлю» | Фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання вялікай тэрцыі («тэрцыі зязюлі»), навыкаў музіцыравання на ксілафоне, выразнага выканання эмацыянальна афарбаванага гукапераймання |
| | Гульня-танец | Гульня-танец «Зязюля». У мелодыі танца прысутнічае гукаперайманне голаса зязюлі, які па чарзе інтануецца ўдзельнікамі гульні-танца | Фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання вялікай тэрцыі («тэрцыі зязюлі»), навыкаў адлюстравання вобраза ў характэрных рухах |
| 3 | Музіцыраванне | Песня «Пастухоў найгрыш на трубе» | Фарміраванне навыкаў музіцыравання на ксілафоне мелодыі, пабудаванай на вялікай тэрцыі і чыстай кварце; развіццё цікаўнасці да музіцыравання |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Рухавая гульня са спевамі | Гульня «Воўк і авечкі» | Фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання гукаў у дыяпазоне вялікай тэрцыі; развіццё творчага мыслення |
| | Успрыманне тэксту, вакальная імправізацыя | Тэкставыя эпізоды былічкі (*гл.* вышэй былічку «Цялушачка») | Замацаванне ўяўленняў аб эмацыянальнай выразнасці інтанацыі зову і прычыту; развіццё прадуктыўнага музычнага мыслення |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Полька» (аўтэнтычны ўзор у аўдыязапісе) у выкананні дзвух скрыпак і бубна | Замацаванне ўяўленняў аб кроку танца «полька», навыкаў яго выканання |
| | Музіцыраванне | Танец «Полька». Бубны і іншыя шумавыя музычныя інструменты | Замацаванне ўяўленняў аб жанры полькі, развіццё метрычнага пачуцця ў працэсе музіцыравання |
| 4. | Успрыманне | Узор жанра замовы «Ідзі ж ты, хвароба...». Тыповы узор жанра, манатонна інтануемы выканаўцай | Знаёмства з жанрам замовы, яго функцыянальным прызначэннем, асаблівасцямі інтанавання |
| | Вакальная імправізацыя | Тэкст замовы «Ідзі ж ты, хвароба...», лічылка № 2 (*гл.* ніжэй) | Замацаванне ўяўленняў аб жанры замовы |
| | Успрыманне | Танец «Кадрыль» у выкананні дзвух скрыпак, цымбал і бубна | Пашырэнне ўяўленняў аб танцавальных жанрах, музычных інструментах |
| | Музіцыраванне і музычна-рытмічныя рухі | Гульня-танец «Зязюля» | Фарміраванне цікаўнасці да музіцыравання, навыкаў ўзнаўлення дзвух гукаў інтэрвала вялікай тэрцыі на цымбалах |
| | Успрыманне казкі | Казка «Баран-бок абадран». У тэкст казкі ўключаны эмацыянальна афарбаваныя рэплікі персанажаў | Сапастаўленне эмацыянальнай афарбоўкі і інтанацыі выказванняў герояў казкі з мімічнымі мадэлямі, асэнсаванне выразнасці моўных інтанацый |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Вакальная імправізацыя | Казка «Баран — бок абадран», набор мімічных мадэляў | Развіццё творчага мыслення, умення адлюстроўваць эмацыянальныя станы ў кароткіх вакальных імправізацыях |
| 5. | Вакальная і інструмен-тальная імправізацыя | Казка «Баран — бок абадран» | Развіццё творчага мыслення |
| | Музычна-рытмічныя рухі і музі-цыраванне | Танец «Полька». Шумавыя музычныя інструменты | Замацаванне шага полькі; развіццё метрычнага пачуцця, фарміраванне навыкаў музіцыравання |
| | Гульнёвае заданне «Па-знай жанр» | Знаёмыя ўзоры жанраў прычыту, пастухова найгрыша, кадрылі | Замацаванне і абагульненне ведаў аб фальклорных жанрах, іх функцыянальным прызначэнні |
| 6. | Гульнёвае заданне «Агучым малюнак» | Набор картак з сімвалічным адлюстраваннем жанраў *прычыту, пастухова найгрыша, замовы* | Замацаванне і абагульненне ведаў аб фальклорных жанрах у працэсе выканання знаёмых узораў або вакальнай імправізацыі ў жанры |
| | Сачыненне ўласнага ўзору жанра былічкі | Знаёмы ўзор былічкі «Цялушачка» | Развіццё творчага мыслення і замацаванне ведаў аб фальклорных жанрах у працэсе вакальнай, інструментальнай, рухавай імправізацыі |
| | Музычна-рытмічныя рухі і танца-вальная ім-правізацыя | Танцы «Полька», «Кадрыль» | Замацаванне ведаў аб танцавальных жанрах і музычных інструментах, фарміраванне навыкаў выразнага выканання танцавальных рухаў, выкарыстання вядомых рухаў ва ўласных імправізацыях |

**Абсталяванне:** персанажы батлеечнага тэатра або лялькі: вясковая хатка, людзі (дзед і баба, пастух і пастушка), жывёлы (воўк, зязюля, баран, ліса, мядзведзь, пчала і інш.); дзіцячыя музычныя інструменты: ксілафон, цымбалы, бубен, шумавыя інструменты; контурныя выявы выканаўцы прычыту (бабуля); каляровыя алоўкі; наборы картак: мімічныя мадэлі (інтанацыі запалоханасці, пагрозы, зварота), карткі-сімвалы жанраў (прычыт, пастухоў найгрыш, замова), фотаздымкі або малюнкі музычных інструментаў (пастухова труба, скрыпка, цымбалы, бубен) [27; 29].

**Літаратурны фальклорны матэрыял**

*Паданне* «Пра зязюлю»; *казка* «Баран — бок абадран».

*Лічылкі*:

№ 1

Раз, два, тры, чатыры,
Воўка грамаце вучылі.
Не чытаць, не пісаць,
А сяброў выбіраць.

№ 2

Раз, два, тры, чатыры, пяць.
Выйшаў зайчык пагуляць.
А за зайчыкам луна
Просіць выйсці калдуна.

*Замова:* «Ідзі ж ты хвароба, у шырокае поле, у сухія лясы ды ў мокрае балота».

**Музычны фальклорны матэрыял**

*Аўтэнтычныя аўдыязапісы*: былічка «Цялушачка» [4, № 66], прычыт «Зязюленька мая шэранькая» [4, № 47], «Полька» [4, № 63], «Кадрыль» [4, № 70].

*Натаваныя творы*:

№ 1 [17, с. 49].

Пастухоў найгрыш на трубе



№ 2 [30, с. 40].

Воук і авечкі




Мы прапануем наступны варыянт гэтай традыцыйнай гульні, які некалькі адрозніваецца ад пададзеных у літаратуры і ў большай ступені накіраваны на вырашэнне задачы музычна-творчага развіцця дзяцей.

Выбіраюць пастуха (іх можа быць некалькі чалавек) і воўка. Усе астатнія — авечкі. Пастух становіцца сярод авечак з «качаргой» у руках, а воўк хаваецца за дзвярыма. Пастух спявае. Пасля спеваў пастух адыходзіць убок і робіць выгляд, што спіць. Воўк кідаецца да авечак, хапае адну ці дзве з іх і разам яны ўцякаюць за дзверы. Усхапіўшыся, пастух крычыць: «Ага-ту! Воўк авечку панёс!» Усё паўтараецца зноў да моманту, пакуль воўк не забярэ ўсіх авечак. Пасля гэтага пастух ідзе шукаць авечак, пытаецца ў воўка: «Ці не бачыў маіх авечак?» Воўк адказвае адмоўна. У гэты момант першая з авечак пачынае шумець, але абавязкова так, каб гэты шум адлюстроўваў пэўныя з’явы прыроды або з’яўляўся гукаперайманнем. Пастух пытаецца: «А што гэта ў цябе шуміць?» Воўк павінен адказаць, праявіўшы кемлівасць. Так гуляюць, пакуль ёсць авечкі, якія жадаюць «пашумець». Апошняя з авечак «спявае» голасам авечкі, пасля чаго ўсе разам ўцякаюць ад воўка у свой «хлеў». Воўк спрабуе злавіць авечак, але пастух павінен яго ўтрымліваць.

№ 3 [31, с. 62].




У літаратуры зафіксаваны наступны варыянт танца-гульні. Тры дзяўчыны становяцца тварам у твар, адна з іх пляскае ў далоні і «кукуе». Пасля чаго яны ловяць адна адну, бяруцца за рукі і кружацца пад музыку. На справе колькасць гульцоў можа быць неабмежавана, а ў працэсе гульні магчыма ствараць свае варыянты з улікам існуючых абставін.

Магчымая сюжэтная лінія і гульнёвыя сітуацыі

Занятак 1. Спачатку дзеці знаёмяцца з адным з персанажаў, які будзе «удзельнічаць» у розных гульнёвых сітуацыях — дзедам. Дзед распавядае аб жыцці сваёй вескі і прапануе паслухаць адну гісторыю, якая здарылася ў суседзяў, — былічку. Пасля першаснага ўспрымання неабходна ўдакладніць уяўленні дзяцей аб скрыпцы, прадэманстраваць фотаздымак або малюнак, зрабіць акцэнт на тым, што скрыпка — трыдыцыйны музычны інструмент беларусаў. Падчас наступнага ўспрымання былічкі запіс спыняецца кожны раз пасля гучання інструментальнага эпізода, удакладняецца яго сэнс і настрой, пасля чаго можна прапанаваць некаторым дзецям голасам перадаць гукаперайманні або аналагічныя праслуханыя ў інструментальным выкананні інтанацыі, адпаведныя эмацыянальным станам герояў і рэгістрам іх галасоў. Працягваючы сюжэтную лінію, дзед «знаёміць» дзяцей з персанажам, які прысутнічае ў былічцы, — пастухом (лялька), які выконвае сваю песню. Пры развучванні гэтай песні дзяцей можна пазнаёміць з інструментам, якім карыстаўся пастух, — трубой і імітаваць ігру на ёй, адлюстроўваючы змяненні вышыні гукаў мелодыі ў адпаведных рухах. Далей песня можа спявацца дуэтам — хлопчыкам і

дзяўчынкай, якія падчас выканання «пераўтвараюцца» ў пастуха і пастушку, атрымліваючы для выканання роляў адпаведных персанажаў батлейкі. Пасля гэтага пастух жадае пагуляць з дзецьмі ў новую гульню «Воўк і авечкі». Першапачаткова ролю пастуха бярэ на сябе дарослы (разам з адным з дзяцей), ён жа выконвае песню пастуха і імправізуе мелодыю на тэкст: «Ага-ту! Воўк авечку панёс!» Далей пастухом застаецца толькі дзіця, а дарослы дапамагае «авечкам» праявіць сябе (падказвае, якія гукі ці гукаперайманні яны могуць прадэманстраваць перад воўкам і пастухом). Пажадана пагуляць 2—3 разы, каб ўсе дзеці-«авечкі» абавязкова выканалі заданне і пастухі (якіх можа быць некалькі ў адной гульні) актыўна падпявалі дарослому і самастойна імправізавалі па тэксту. Пры арганізацыі гульні выкарыстоўваецца лічылка № 1.

*Занятак 2.* Напачатку дзядуля запрашае дзяцей наведацца ў адну з хат вёскі. З хаты чуюцца спевы (гучыць урывак запісу прычыту). Дарослы пытаецца ў дзяцей, хто можа жыць у гэтай хаце, які настрой у выканальніцы (выкарыстоўваецца персанаж батлейкі бабуля). У гэты момант дарослому вельмі важна стварыць пэўную эмацыянальную атмасферу — з дапамогай уласнай мімікі, моўных інтанацый падкрэсліць спецыфіку жанра. Пасля выяўлення эмоцый, адлюстраваных у творы, ён гучыць цалкам. У мэтах больш глыбокага разумення пачуццяў і стану выканальніцы, далей вельмі карысным будзе выкарыстанне малявання (контурныя выявы). Пры немагчымасці яго арганізацыі можна прымяніць «моўнае маляванне», галоўнае, каб дзеці ўсвядомілі эмацыянальныя адценні твораў гэтага жанра.

Дарослы ад імя бабулі прапануе паслухаць паданне «Пра зязюлю» (у час чытання словы «Якуб, Якуб!», «Ку-ку, ку-ку» меладызуюцца дарослым). Пасля гэтага кожны з дзяцей можа паспрабаваць выканаць «песню» зязюлі на ксілафоне і адначасова з гэтым прапяваюць гукаперайманне. Пажадана, каб гукаперайманне прагучала ў розных рэгістрах.

Каб павесяліць бабулю, далей дзядуля прапануе патанцаваць. Дарослы арганізуе танец-гульню «Зязюля». Падчас прапявання гукаперайманне ў гульні можна прапанаваць дзецям адлюстроўваць змяненне вышынь гукаў з дапамогай «крылаў» зязюль (адпаведныя рухі рукамі). Сам танец можа быць імправізаваным — кружэнне ў парах, імітацыйныя рухі і інш.

*Занятак 3* пачынае пастух. Ён паведамляе, што чуў, як добра раней дзеці ігралі на ксілафоне песню зязюлі і прапануе ім навучыцца іграць так, каб дапамагчы яму пазваць жывёл («Пастухоў найгрыш на трубе»). Пасля выканання голасам знаёмага дзецям узору, ад імя пастуха дарослы паказвае, што, каб сыграць гэту песню, трэба дадаць да песні зязюлі яшчэ адзін гук. Дарослы дэманструе спачатку «песню» зязюлі (на гуках *ля* і *фа*), а потым іграе першыя дзве фразы пастухова найгрыша (дадаваючы да тэрцыі зязюлі яшчэ адзін ніжні гук *до*). Такім чынам, узор выконваецца на ксілафоне ад гука фа. Далей дзеці па чарзе спрабуюць выканаць гэты ўрывак на ксілафоне. Пасля кожнай удалай спробы «пастух» гаворыць: «Вось яшчэ адна кароўка знайшлася!» ці «А вось і волік прыйшоў!» і г. д. (Увага! Выкарыстоўваюцца толькі першыя дзве музычныя фразы «Пастухова найгрыша на трубе».) Пасля музіцыравання можна выканаць хорам песню.

Далей пастух арганізуе знаёмую дзецям гульню «Воўк і авечкі». Пасля гэтага звяртаемся да былічкі. На гэты раз замест інструментальных эпізодаў, якія блізкія па сваім сэнсе жанрам прычыту і пастухова найгрыша, дзеці выконваюць адпаведныя эпізоды голасам, ужываючы, напрыклад, такі тэкст: «А кароўка мая, дзе жа ты?» і песню «Пастухоў найгрыш» голасам або на ксілафоне. Напрыканцы былічкі на гэтым занятку замест заключнага танцавальнага найгрыша на скрыпцы гучыць «Полька» у выкананні дзвух скрыпак і бубна. Пасля удакладнення ўяўленняў дзяцей аб жанры і характары полькі дзецям

прапануецца вывучыць (або замацаваць) характэрны крок танца. Калі гэта заданне будзе складаным для дзяцей, можна прапанаваць вольную пляску ў адпаведнасці з характарам музыкі. Неабходна звярнуць увагу дзяцей на гучанне бубна ў танцы, яго ролю ў наданні маторнасці танцу і радаснага настрою. Напрыканцы пажадана аркестраваць мелодыю танца, ужываючы бубны і іншыя шумавыя інструменты (адна група дзяцей аркеструе, другая — выконвае танцавальныя рухі, некаторыя дзеці могуць імітаваць выкананне на скрыпках).

*Занятак 4* пачынаецца з сустрэчы з дзедам, які раптам захварэў і просіць пазваць бабулю, якая можа дапамагчы: яна ведае, як лячыць з дапамогай розных раслін і нават ведае спецыяльныя словы (замову), якія дапамогуць «прагнаць» хваробу. Неабходна растлумачыць дзецям, што нашы продкі верылі ў тое, што з дапамогай замовы можна не толькі палепшыць стан хворага, але і пашкодзіць чалавеку або жывёле. Таму людзей, якія маглі гэта зрабіць, лічылі ведзьмакамі. Далей дарослы ад імя бабулі імправізуе замову і «дае патрэбныя лекі». Потым кожны з дзяцей таксама выконвае ролю бабулі, адлюстроўваючы адпаведную інтанацыю (можна ствараць уласныя варыянты тэкстаў). Пры жаданні, дзеля ўсталявання чаргі, можна выкарыстаць лічылку № 2.

Далей дарослы паведамляе, што верна падабраныя бабуляй лекі і нашы добрыя пажаданні дапамаглі дзеду, які так узрадаваўся, што запрасіў да сябе сяброў, каб тыя павесялілі яго музыкай. Дзецям прапануецца запіс танца «Кадрыль», перад успрыманнем якой можна даць заданне здагадацца, колькі сяброў у дзеда (столькі, колькі гучыць музычных інструментаў — чатыры). Потым удакладняюцца ўяўленні дзяцей аб цымбалах праз дэманстрацыю адпаведных фотаздымкаў або малюнкаў. Пры паўторным успрыманні танца дзеці могуць імітаваць ігру на цымбалах або рухацца ў адпаведнасці з характарам музыкі.

Далей дарослы нагадвае дзецям, што яны знаёмы з дзіцячым музычным інструментам, вельмі падобным на сапраўдныя цымбалы, але іграюць на ім не з дапамогай дзвух палачак, а медыятарам. На цымбалах дзеці па чарзе спрабуюць сыграць песню зязюлі, а потым выконваюць гульню-танец «Зязюля».

Пасля гульні дзед прапануе дзецям паслухаць казку «Баран — бок абадран». Чытаючы казку, дарослы павінен вельмі выразна падаць словы дзеючых асоб з інтанацыямі пагрозы, запалоханнасці, зварота. Потым «з'яўляецца» галоўная дзеючая асоба казкі — баран і просіць дзяцей зрабіць казку больш цікавай — музычнай. Ён паказвае дзецям карткі-мімічныя мадэлі і запрашае астатніх дзеючых асоб казкі дапамагчы дзецям скласці казку са спевамі. Разглядаючы карткі, дзеці павінны суаднесці мімічную мадэль з дзеючай асобай і удакладніць, якім голасам будзе выконвацца кожная роля. Далей ролі размяркоўваюцца паміж дзецьмі па жаданні і па ходу чытання казкі дарослым кожны ўдзельнік спрабуе меладызаваць тэкст свёй дзеючай асобы. Пры гэтым тэкст дзяючай асобы можа быць скарочан пры дапамозе дарослага.

*Занятак 5.* Напачатку яшчэ раз выконваецца заданне па меладызацыі дыялогаў дзеючых асоб казцы «Баран — бок абадран». Далей дарослы прапануе паказаць у рухах крокі розных дзеючых асоб, палёт пчалы, а потым адлюстраваць іх ігрой на ксілафоне. Напрыканцы выканання серыі заданняў па казцы гучыць знаёмая дзецям «Полька» (дзеючыя асобы казкі святкуюць сваю перамогу над баранам), пад якую дзеці выконваюць адпаведныя рухі, аркеструюць яе, яшчэ раз удаклядняюць назву жанра. Далейшая праца на занятку падпарадкавана замацаванню ведаў аб іншых жанрах, з якімі пазнаёміліся дзеці. Дарослы ад імя аднаго з персанажаў выконвае або прапануе запіс знаёмых твораў, дзеці павінны назваць іх жанры.

*Занятак 6.* Выкананне першага задання «Агучым малюнак» можна арганізаваць наступным чынам: карткі з жанравай сімволікай размяшчаюцца малюнкам уніз, жадаючыя павінны выбраць адну з картак і назваць жанр, адлюстраваны на малюнку, па магчымасці выканаць знаёмы твор або імправізацыю ў жанры.

Найбольш актыўным у выкананні гэтага задання прапануецца выбраць персанаж батлейкі або цацку, з дапамогай якой дзіця жадае ўдзельнічаць у стварэнні новай былічкі-казкі. Каб накіраваць дзяцей і зрабіць калектыўны твор больш разгорнутым, дарослы яшчэ раз звяртае ўвагу на тое, што ўсе сябры, з якімі дзеці пазнаёміліся на занятках (персанажы), павінны ўдзельнічаць у былічцы. Астатнія дзеці выбіраюць персанажы, якія не ўдзельнічалі ў агульным сюжэце, але для іх магчыма знайсці ролю ў новай былічцы-казцы (конь, сабака, суседзі, музыкі і інш.) Словы ад аўтара, вядома, будуць належыць даросламу. Ён жа павінен і прадугледзець магчымы сюжэт з мэтай падвесці дзяцей да неабходнасці выкарыстаць у калектыўным сачыненні вядомыя дзецям вакальныя творы, інструментальныя імправізацыі і імітацыйныя і танцавальныя рухі. Агульны сюжэт, у якім прысутнічаюць матывы знаёмай дзецям былічкі «Цялушачка» і казкі «Баран — бок абадран», можа быць, напрыклад, наступным.

Жылі ў адной хаце дзядуля і бабуля. Былі ў іх карова, конь, авечка і баран. Аднойчы забыўся дзед зачыніць вароты, і ўсе жывёлы ўцяклі са двара. Карова, конь і баран апынуліся ў лесе, а авечка прыбілася да стада, якое на лузе пасвілі пастух і пастушка (праводзіцца гульня са спевамі «Пастух і авечкі», авечка вяртаецца дамоў). Тым часам дзядуля і бабуля, калі ўбачылі, што жывёлы зніклі, вельмі засумавалі (дзеці выконваюць вакальныя імправізацыі на тэксты: «А кароўка мая, дзе жа ты?», «Мой ты конік, куды ж ты пайшоў?»). Вырашылі яны прасіць пастуха і пастушку, каб тыя ім дапамаглі (дзеці выконваюць голасам

або на ксілафоне інтанацыі «зову» або спяваюць песню «Пастухоў найгрыш на трубе», змяняючы тэкст на «карову згубіў» і «каня згубіў»). Карова і конь пачулі пастухоў і хацелі вярнуцца дамоў (дзеці адлюстроўваюць крокі жывёл з дапамогай ксілафонаў), але кожны з іх параніўся, і пачалі яны храмаць (дзеці адлюстроўваюць адпаведны рытм крокаў). Баран не чуў пастуха, ён так бег праз лес (дзіця адлюстроўвае на інструменце), што абадраў сабе бок і схаваўся ў нару лісіцы. (Далейшы сюжэт пра прыгоды барана адпавядае сюжэту казкі «Баран — бок абадран» з выкананнем роляў лісіцы, мядзведзя, воўка і пчалы). Калі баран уцёк ад пчалы, ён убачыў зязюлю. Тая ведала, дзе дзядуля з бабуляй жывуць. Яна паляцела (дзіця выконвае рухі пад мелодыю танца-гульні «Зязюля») і сваім голасам (дзіця выконвае гукаперайменне) дапамагла барану павольна дайсці (дзіця адлюстроўвае на ксілафоне крокі) да дзедавай хаты. У гэты момант і конь з каровай прыйшлі. Але гэтых трох жывёл трэба было падлячыць (дзеці выконваюць замовы і «даюць лекі» ад імя бабулі і дзядулі). Дзядуля і бабуля былі вельмі рады, што ўсё скончылася добра, яны пазвалі музыкаў, якія зайгралі вясёлы танец (усе удзельнікі выконваюць танцавальня рухі пад гучанне полькі або кадрылі, а «музыкі» аркеструюць танец з дапамогай шумавых інструментаў або імітуюць выкананне на скрыпках, цымбалах). Пры выкананні роляў большасці дзяцей можа спатрэбіцца некаторы час для разумення сваёй задачы, дапамога дарослага і нават неаднаразовая дэманстрацыя-падказка дарослым магчымага варыянта. Складанасць гэтага апошняга задання цыкла «Уводзіны ў фальклор» відавочна, але менавіта яго выкананне дазволіць найбольш эфектыўна замацаваць усе атрыманыя ў гэтым цыкле веды, адчуць радасць ад сумеснай творчасці на аснове фальклорнага матэрыялу, які вельмі гэтаму спрыяе.

## Тэма «Кірмаш»

| № занятку | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці; абсталяванне | Задача выкарыстання фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| 1 | Успрыманне музыкі | Інструментальная замалёўка «Кірмаш» (аўдыязапіс). У пачатку твора чуваць гоман, шум, якія звычайна суправаджаюць кірмашы, далей гучаць танцавальныя матывы | Выклікание зацікаўленасці, пазітыўнага эмацыянальнага настрою |
| | Успрыманне і спевы (падпяванне) | Забаўлянка «Гойда, гойда, гайдамаш» (першыя дзве фразы). Першапачатковы меладычны ход складаецца з дзвух чыстых кварт, якія надаюць нацыянальны каларыт гучанню, у далейшым развіцці выкарыстаны тэрцыевы лад з субквартай (мінорнае нахіленне). Складанасць рытмікі — у наяўнасці распеваў | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага пачуцця, навыкаў чыстага інтанавання пры выкананні паслядоўнасці з дзвух чыстых кварт; фарміраванне ўяўленняў аб жанры «забаўлянка» |
| | Успрыманне і вакальная імправізацыя | Казка «Людзей слухай, а свой розум май». У тэксце казкі прысутнічаюць апісанне кірмашовай атмасферы і тэкст гандляра «Купіце зайца! Купіце зайца!» | Развіццё пачуцця гумару; фарміраванне навыкаў інтанавання фраз з пэўным функцыянальным прызначэннем |
| | Гульнёвае заданне «Латок гандляра» | Лічылка № 1, розныя рэчы для «продажу» | Развіццё прадуктыўнага музычнага мыслення; фарміраванне навыкаў інтанавання фраз з пэўным функцыянальным прызначэннем |
| | Спевы (падпяванне) | Забаўлянка «Гойда, гойда, гайдамаш» | Развіццё меладычнага слыху; фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання гукаў у тэтрахордзе і ў тэцыевым ладзе з субквартай (мінорнае нахіленне) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец-гульня «А у нашага Трыхвана семера дзяцей», найгрыш «Лявоніха». Правілы танца дазваляюць арганізаваць вывучэнне асобных танцавальных рухаў; «Лявоніха» выконваецца на скрыпцы | Развіццё тэмбравага слыху; пашырэнне ведаў аб музычных інструментах (скрыпка); замацаванне ведаў аб традыцыйных беларускіх танцах, варыянтах рухаў да іх |
| 2 | Спевы | Забаўлянка «Гойда, гойда, гайдамаш» | Замацаванне твора; фарміраванне навыкаў яго выразнага выканання |
| | Успрыманне і пад-пяванне | Забаўлянка «Ішоў казёл мастом». Галоўная асаблівасць твора ў дыялагічным выкладанні тэксту, характэрным увогуле для жанраў дзіцячага фальклору | Пашырэнне ўяўленняў аб жанры; развіццё ладавага пачуцця праз дакладнае выкананне тонікі напрыканцы фраз забаўлянкі |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танцы «Мосцік», «Лявоніха». Асноўны танцавальны рух танца «Мосцік» — «ручаёк» | Развіццё музычна-рытмічнага пачуцця; фарміраванне навыкаў руху ў адпаведнасці з характарам музыкі |
| | Успрыманне і спевы | Забаўлянка «Ішоў Бай па сцяне». Галоўная асаблівасць — вы-карыстанне пентатонікі. Тэкст твора дае магчымасць праз пытанне «Ці баіць, ці не?» неаднаразова паўтараць твор і ствараць новыя варыянты куплетаў | Развіццё меладычнага слыхупашырэння, уяўленняў аб жанры, асаблівасцях выкладання тэкстаў у забаўлянках |
| 3 | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Мосцік» | Развіццё музычна-рытмічнага пачуцця; фарміраванне навыкаў руху ў адпаведнасці з характарам музыкі |
| | Спевы і тэк-ставая імправізацыя | Забаўлянка «Ішоў казёл мастом», лічылка № 3 | Фарміраванне навыкаў выканання ансамблямі і хорам; развіццё творчай актыўнасці |
| | Гульня «Сляпы музыка» | Малюнкі знаёмых дзецям музычных інструментаў, ліры. Гучанне ўрыўкаў адпаведных музычных твораў | Замацаванне ведаў аб знаёмых музычных інст-рументах, знаёмства з ліраю |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Спевы | Забаўлянка «Ішоў Бай па сцяне» | Развіццё меладычнага слыху |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Юрачка» (аўтэнтычны запіс). Танец гучыць у выкананні дудкі | Замацаванне варыянтаў рухаў да традыцыйнага танца; узбагачэнне ўяўленняў аб музычных інструментах |
| | Спевы | Забаўлянка «Гойда, гойда, гайдамаш» | Замацаванне твора, фарміраванне навыкаў выразнага выканання |
| 4 | Музычна-рытмічныя рухі і музіцыраванне | Танец «Юрачка». Выкарыстоўваецца сімфанічнае гучанне твора | Замацаванне варыянтаў рухаў да танца, навыкаў выканання на дзіцячых музычных інструментах |
| | Спевы і імправізацыя тэкстаў | Забаўлянка «Ішоў Бай па сцяне». У імправізацыі магчыма змена тэксту з «ішоў бай» на «бег бай» і тэмпа выканання, стварэнне новых куплетаў | Развіццё творчых здольнасцей; замацаванне ўяўленняў аб тэмпе выканання ў адпаведнасці з вобразам |
| | Музычна-рытмічныя рухі | «Лявоніха». Выкарыстоўваецца гучанне танца ў апрацоўцы для цымбал і баяна | Пашырэнне ўяўленняў аб баяне і гармоніку; замацаванне рухаў да танца |
| | Заданне «Загадкі для сляпога музыкі» | Малюнкі: скрыпка, ліра, бубен, дудка, цымбалы, гармонік | Замацаванне ўяўленняў аб музычных інструментах, уменняў апісваць аб’екты |
| | Спевы і частковая імправізацыя | Забаўлянка «Гойда, гойда, гайдамаш». У імправізацыі магчыма змена тэксту «На булачку грошай не стала» на «А Надзейка плакаць не стала» і ладавага нахілення гэтай фразы | Развіццё ладавага пачуцця ў працэсе замены мінорнага нахілення на мажорнае, творчага мыслення |
| 5 | Спевы, музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне | Увесь вывучаны па тэме матэрыял | Фарміраванне навыкаў выразнага выканання твораў |

**Абсталяванне:** персанажы батлеечнага тэатра або лялькі: людзі (дзяўчынка, дзядуля, музыка), казёл; дзіцячыя шумавыя музычныя інструменты; фотаздымкі або малюнкі музычных інструментаў (скрыпка, цымбалы, дудка, гармонік, ліра).

**Літаратурны фальклорны матэрыял**

*Казка* «Людзей слухай, а свой розум май».

*Лічылкі:*

№ 1

Йшла таргоўка міма рынку
Спатыкнулась на карзінку.
У гэтай маленька карзінцы
Ёсць памада і духі,
Лента, кружава, бацінкі —
Што ўгодна для душы.

№ 2

Ішоў Ціхан па масту,
Праваліўся ў ваду.
Бульк!

**Музычны фальклорны матэрыял**

*Аўтэнтычныя аўдыязапісы:* найгрыш на скрыпцы «Лявоніха» [4, № 21], найгрыш на дудцы «Юрачка» [4, № 58].

*Аўдыязапісы апрацовак фальклору:* танцавальныя мелодыі «Лявоніха» (цымбалы і баян) [8], «Юрачка» (сімфанічны аркестр) [8]; інструментальная замалёўка «Кірмаш» [2].

*Натаваныя творы:* танец «Мосцік» [18, с. 251].

№ 1 [18, с. 30].

Забаулянка




№ 2 [18, с. 32].

А ў нашага Трыхвана семера дзяцей




№ 3 [24, с. 39].

Ішоў казёл мастом



Ішоў казёл мастом.
Ду-ду-ду-ду-ду![1]
Ківаючы хвастом.
Ду-ду-ду!
— А куды ідзеш, казёл?
— На кірмаш пайду.
— А чаго на кірмаш?
— Касу купляць пайду.
— А нашто табе каса?
— Буду сена касіць.
— Нашто табе сена?
— Каровачак карміць.
— Нашто табе каровы?
— Буду малачко даіць.
— Нашто тое малачко?
— Буду дзетак паіць.

№ 4 [18, с. 32].




Ішоў Бай па сцяне,
Нёс сямёра лапцей:
І дзіцёнку па лапцёнку,
І жане, і сабе.

Ішоў Бай па сцяне,
У чырвоным каптане,
Нёс сямёра лапцей:
І жане, і сабе.
І ці бавіць, ці не?

[1] **Гэтыя радкі паўтараюцца пасля кожнага пытання або адказа на яго.**

*Магчымая сюжэтная лінія і гульнёвыя сітуацыі*

*Занятак 1.* Пачаць знаёмства з новай тэмай пажадана з музычнай загадкі, прапанаваўшы дзецям па музычным ўрыўку паспрабаваць здагадацца аб месцы, куды «мы накіроўваемся» разам з нашай новай сяброўкай — дзяўчынкай Надзейкай. Маляўнічы ўрывак «Кірмаш» дазволіць дзецям лёгка адказаць на пытанне і стварыць атмасферу зацікаўленасці, пазітыўны эмацыянальны настрой.

Далей дарослы прапануе дзецям паехаць на кірмаш пад частку забаўлянкі «Гойда, гойда, гайдамаш», якую выконвае дарослы. Мелодыя забаўлянкі дастаткова складаная, таму пажадана развучваць яе па частках, тым больш, што тэкст кожнай часткі добра суадносіцца з агульным сюжэтам занятку. Маторны характар у працэсе развучвання забаўлянкі неабходна падкрэсліць рухамі, пры гэтым магчыма мадэліраваць рытмічны малюнак праз прытупы. Пры паўторных спевах дзеці могуць рухацца па кругу, або ў розных напрамках, «каб адшукваць дарогу».

На кірмашы дзеці сустракаюць свайго знаёмага — дзядулю, які прапануе ім паслухаць невялічкую казку пра аднаго чалавека, які таксама адправіўся на кірмаш, каб прадаць пеўня. Падчас чытання казкі дарослы выразна, з адпаведнай інтанацыяй меладызуе фразу «Купіце зайца! Купіце зайца!» Пасля чытання казкі і неабходнай размовы аб яе змесце і сэнсе, дарослы павінен звярнуць увагу дзяцей на тыя тавары, продаж якіх адлюстраваны ў казцы, і прапануе ўявіць, як гадляры маглі рэкламіраваць свой тавар. Можна прапанаваць наступныя тэксты: «Купляйце патэльні, лепшыя патэльні ў свеце!», «Купляйце косы — вострыя ды звонкія!»

Дзядуля, працягваючы сваю размову з дзецьмі, прапануе ім самім выступіць ў ролі гандляроў праз гульнёвае заданне «Латок гандляра» (арганізуецца накшталт «Цудоўнага меха», у якім хаваюцца розныя рэчы, добра вядомыя дзецям). Першы гулец вылучаецца з дапамогай лічылкі №1. Ён выцягвае з меха рэч і меладызуе сваю «рэкламу», потым перадае

гэтую рэч наступнаму гульцу, каб той знайшоў у ёй яшчэ якую-небудзь прывабную рысу і таксама зрабіў рэкламу. Так працягваецца да таго часу, пакуль «дзядуля» не вырашыць набыць гэтую рэч, пасля чаго гульня пачынаецца зноў.

Далей можна працягваць развучванне забаўлянкі «Гойда, гойда, гайдамаш». Неабходна звярнуць увагу дзяцей на змену характара забаўлянкі ў апошняй фразе. Каб развесяліць персанаж забаўлянкі дзяўчынку Надзейку, дзядуля прапануе патанцаваць. Для гэтага выкарыстоўваецца танец-гульня «А ў нашага Трыхвана семера дзяцей». Дадзеная гульня дапаможа развучыць асобныя рухі, якія ў далейшым могуць быць уключаны ў любую танцавальную кампазіцыю. На гэтым занятку пажадана вывучыць або ўдакладніць адзін з рухаў да танца «Лявоніха». Гэта можа быць традыцыйны для сцэнічнай практыкі асноўны крок «Лявоніхі»: памер 2/4, зыходнае становішча — шостая пазіцыя ног; на «раз» — крок правай нагой з выцягнутым наском і лёгкім скачком на нізкія паўпальцы; на «і» — такі ж крок левай нагой; на «два» — такі ж крок правай нагой; на «і» — левую нагу вынесці ўперад з выцягнутым наском; на другі такт рух паўтараецца з левай нагі. У фальклорнай традыцыі выкарыстоўвалася самая розная лексіка ў «Лявоніхе» — простыя, прыстаўныя і пераменныя крокі, простыя і трайныя прытопы і інш. Любы з гэтых рухаў можа вывучацца або замацоўвацца з мэтай далейшай танцавальнай імправізацыі пад скрыпічны найгрыш «Лявоніха».

*Занятак 2* можна пачаць з паўтарэння забаўлянкі «Гойда, гойда, гайдамаш», ствараючы гульнёвую сітуацыю. Пасля спеваў дарослы арганізуе сустрэчу з казлом, які таксама ідзе на кірмаш.

Дарослы выконвае забаўлянку-дыялог «Ішоў казёл мастом» паміж Надзейкай і казлом. Пры далейшым выконванні дзеці хорам падпяваюць рэфрэн. Пасля гэтага «казёл» жадае навучыць дзяцей танцу-карагоду «Мосцік». Пары дзяцей, стаўшы ў дзве лініі адзін за другім, пад музыку

простым крокам рухаюцца ў любым напрамку. Злучаныя левая рука хлопчыка і правая рука дзяўчынкі падняты ўверх. Напрамак руху задае кожная апошняя пара, якая, прабягаючы пад мосцікам, становіцца спераду, падымаючы злучаныя рукі. Пасля карагода магчыма звярнуцца да танцавальнага найгрыша «Лявоніха», узнавіць развучанныя на папярэднім занятку рухі.

Знаёмства і вывучэнне наступнай забаўлянкі «Ішоў Бай па сцяне» магчыма арганізаваць з дапамогай спецыяльна падрыхтаванай гукавысотна-рытмічнай мадэлі першай фразы забаўлянкі — папяровых слядоў Бая на сцяне, якая з'явіцца і сюрпрызным момантам. Дарослы звяртае ўвагу дзяцей на тое, што нехта прайшоў па сцяне залы і пакінуў вялікія і малыя сляды, размешчаныя на трох высотах (памер следу суадносіцца з даўжынёй — восьмой або шаснаццатай гука ў мелодыі, два следа разам адпавядае чвэрці; вышыня следу адносна пола адпавядае вышыні гукаў). Пасля дарослы выконвае твор, пры гэтым кранаючыся далонямі кожнага следу, праходзіць па «дарожцы Бая», прапяваючы першыя фразы ўсіх куплетаў забаўлянкі. Кожны з дзяцей можа паспрабаваць інтанацыйна і рытмічна прапець фразу «Ішоў Бай па сцяне». Пасля гэтага развучванне забаўлянкі працягваецца, пры гэтым неабходна звярнуць увагу дзяцей на пытанне забаўлянкі «Ці бавіць, ці не?», растлумачыць магчымасць выбара адказа на яго, паспрабаваць яго выканаць, выкарыстоўваючы розныя варыянты адказаў. Неабходна паведаміць дзецям, што Бай з'яўляецца "казачным" персанажам беларусаў. (Паводле міфалогіі ўвогуле ён лічыцца першым прадстаўніком беларускага этнасу, своеасаблівым "бацькам" усіх беларусаў).

*Занятак 3.* Пасля паўтарэння танца «Мосцік» прапануецца звярнуцца да забаўлянкі «Ішоў казёл мастом». Пасля спеваў дарослага «разам» з персанажам пажадана заахвоціць дзяцей да самастойнага сольнага прапявання пытанняў тэксту забаўлянкі ў той час, як дарослы ад

імя персанажу будзе даваць адказы на пытанне, а астатнія дзеці хорам падпяваць рэфрэн. Тэкст забаўлянкі таксама дазваляе ствараць як уласныя варыянты адказаў, так і варыянты пытанняў. Падчас спеваў гэтай забаўлянкі галоўным будзе не столькі дакладнасць выканання мелодыі, сколькі магчымасць праявіць актыўнасць, знаходлівасць, пачуццё гумару з боку дзіцяці. Усталёўваць чаргу магчыма з дапамогай лічылкі № 2.

Далей сюжэтная лінія разгортваецца такім чынам, што дзеці на кірмашы сустракаюць «сляпога музыку». Ён паведамляе, што вельмі добра чуе музыку, але не можа бачыць, на якім інструменце яна выконваецца, таму просіць дзяцей раскласці карткі з выявамі музычных інструментаў у той паслядоўнасці, у якой будуць гучаць музычныя ўрыўкі. Арганізаваць выкананне задання магчыма па камандах або індывідуальна. Вобраз сляпога музыкі дазволіць больш арганічна пазнаёміць дзяцей і са старажытным музычным інструментам колавай лірай, на якімігралі музыкі менавіта з рознымі фізічнымі недахопамі, атрымлівая такім чынам сродкі для існавання. Гэтае апавяданне дазволіць выклікаць у дзяцей не толькі зацікаўленасць, але і эмацыянальнае спачуванне. Добра, калі будзе магчымасць паслухаць гучанне гэтага адроджаннага інструмента ў сучасных запісах. Каб перайсці да наступнага задання, можна прапанаваць дзецям «пазабавіць» свайго новага знаёмага — выканаць забаўлянку «Ішоў Бай па сцяне». Пры гэтым дарослы ад імя музыкі некалькі разоў на пытанне «І ці бавіць, ці не?» адказвае: «Бавіць», што забяспечвае замацаванне твора.

Пасля замацавання забаўлянкі «Ішоў Бай па сцяне» прапануем зноў звярнуцца да танцавальнага фальклору. На гэты раз можна развучыць або замацаваць некалькі танцавальных рухаў да вядомага танца «Юрачка», які гучыць у выкананні дудкі, на што таксама трэба звярнуць увагу дзяцей. У сцэнічнай інтэрпрэтацыі гэтага танца асноўны крок выконваецца такім чынам: памер 2/4; рух займае два такты; зыходнае становішча — шостая

пазіцыя ног; на «раз» — скокнуць на паўпальцы правай нагі, левую, сагнутую ў калене, падняць да ўзроўню лыткі; на «і» — скокнуць на паўпальцы левай нагі, правую, сагнутую ў калене, адарваць ад падлогі; на «два» — скокнуць на паўпальцы правай нагі, левую, сагнутую ў калене, адарваць ад падлогі; на «і» — паўза; на «раз і» — скокнуць на левую нагу ў лёгкае прысяданне, правую нагу, сагнутую ў калене, падняць пад прамым вуглом; на «два і» — правую нагу паставіць уперад на каблук. У фальклорным жа варыянце гэты танец-карагод звычайна выканваўся так: усе выканаўцы рухаліся па крузе парамі, акрамя аднаго «лішняга» хлопца, «Юрачкі», які прытанцоўваў сола. Калі карогод абыходзіў круг, хлопец забіраў партнёрку з першай пары, і лішнім станавіўся іншы хлопец. Танец заканчваўся, калі «Юрачкам» перабылі ўсе хлопцы. Напрыканцы занятку пажадана зноў выканаць забаўлянку «Гойда, гойда, гайдамаш».

*Занятак 4.* Напачатку будзе да месца прыгадаць танцавальныя рухі да «Юрачкі», але на гэты раз можна выкарыстоўваць гучанне танца ў аркестровым выкананні. Потым дарослы можа прапанаваць стварыць уласны аркестр (шумавы) і пад гучанне «Юрачкі» выканаць сваю кампазіцыю.

Выкананне знаёмых забаўлянак на гэтым занятку арганізуецца такім чынам, каб меладычны і тэкставы матэрыял стаў асновай для творчых праяўленняў дзяцей і адначасова садзейнічаў замацаванню іх уяўленняў аб сродках музычнай выразнасці. Так, у працэсе выканання забаўлянкі «Ішоў Бай па сцяне» неабходна прапанаваць дзецям стварыць уласныя тэкставыя варыянты. Змены тэксту могуць датычыцца колеру адзення персанажа або тых рэчаў, якія ён нясе, і г. д. Дарослы можа прапанаваць свой варыянт, у якім адбудуцца значныя змены. Напрыклад:

Ішоў Бай па сцяне,
У зялёным жупане,
Нёс цукерачкі ў руцэ,

Для цябе і для мяне.

Ці бавіць, ці не?

Яшчэ адным варыянтам для імправізацыі можа быць замена слоў «ішоў Бай» на «бег Бай». У гэтым выпадку неабходна змяніць і тэмп выканання — паскорыць яго.

Наступнае паўтарэнне танцавальных рухаў да танца «Лявоніха» можна арганізаваць пад гучанне мелодыі гэтага танца ў апрацоўцы для цымбал і баяна, звярнуўшы ўвагу дзяцей на гучанне апошняга, і пазнаёміць іх з «братам» баяна — гармонікам. Пасля гэтага можна замацаваць веды дзяцей аб музычных інструментах з дапамогай гульнёвага задання «Загадкі для сляпога музыкі». У ролі музыкі можа выступаць як дарослы, так і жадаючыя дзеці. Гулец, які складае загадку, можа карыстацца малюнкам або фотаздымкам. Апісваючы інструмент, яму неабходна звярнуць увагу на памеры, асаблівасці канструкцыі, спосаб ігры на інструменце.

Выкананне забаўлянкі «Гойда, гойда, гайдамаш» таксама падпарадкавана мэце не толькі замацавання твора, але і асэнсавання дзецьмі ладавых магчымасцей у стварэнні адпаведнага настрою. Так, апошняя фраза «На булачку грошай не стала», якая мае мінорнае нахіленне, можа быць зменена на мажорную фразу «А Надзейка плакаць не стала» або на якую-небудзь іншую.

*Занятак 5.* Апошні занятак тэмы прысвячаецца замацаванню вывучаных забаўлянак, танцавальных рухаў да танцаў «Мосцік», «Лявоніха», «Юрачка», у тым ліку і з дапамогай танца-гульні «А ў нашага Трыхвана семера дзяцей», аркестроўцы танцавальных мелодый. Таксама не выключаецца выкананне творчых заданняў, якія найбольш зацікавілі дзяцей: стварэнне тэкставых і меладычных варыянтаў забаўлянак, выкананне гульнёвага задання «Латок гандляра», розных варыянтаў гульні «Сляпы музыка».

## Тэма «Калыханкі»

| № занятку | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці; абсталяванне | Задача выкарыстання фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| 1 | Успрыманне літаратурнага твора | Казка «Піліпка-сынок». У казцы тэкст калыханкі: «Люлі, люлі, сынок, з белымі плячыцамі, з чорнымі вачыцамі...», моўны выраз: «калыхаць і ката спяваць» | Выкліканне цікавасці да жанра калыханкі праз знаёмыя літаратурныя вобразы |
| | Успрыманне музыкі | Калыханка «Спі, сыночак міленькі». Уступ калыханкі — тыповы ўзор характэрнага для калыханак глісандуючага інтанавання на гук «А». У першай частцы — жанрава характэрны тэрцыевы лад з субквартай (мінорнае нахіленне) | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага пачуцця; узбагачэнне слоўніка дзяцей параўнаннямі і эпітэтамі |
| | Вакальная імправізацыя | Тэкст для імправізацыі: «А-а-а», лічылка № 1. У імправізацыі неабходна адлюстраваць пэўны настрой і выкарыстаць адпаведны тып інтанавання ў розных рэгістрах. Дарослы можа выканаць у якасці прыкладу узор № 1а | Замацаванне ўяўленняў аб музычных рэгістрах у працэсе ўласных спеваў; развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, выразнасці выканання, прадуктыўнага музычнага мыслення |
| | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка «Хадзіў каток па капусце». Калыханка цалкам вытрымана ў тэрцыевым ладзе з субквартай (мажорнае нахіленне). У рытмічных адносінах — узор раўнамернага рытму | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага пачуцця; фарміраванне ўяўленняў аб раўнамернай паслядоўнасці даўжынь гукаў у працэсе выканання твора |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка «А ты, каток шэры». У першай частцы калыханкі — тэрцыевы лад з субквартай (мінорнае нахіленне). У рытмічных адносінах — наяўнасць трыолей, чаргавання кароткіх і доўгіх гукаў у характэрнай для калыханак паслядоўнасці | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага пачуцця; фарміраванне ўяўленняў аб выразным значэнні чаргавання кароткіх і доўгіх гукаў у працэсе ўзнаўлення твора і маторнага ўпадаблення гучанню |
| | Рухавая гульня | Гульня «У ката», лічылка № 2 | Развіццё ладавага пачуцця |
| 2 | Спевы | Калыханкі «Хадзіў каток па капусце», «А ты, каток шэры»), лічылка № 1 | Замацаванне ўяўленняў аб мажорным і мінорным гучанні тэрцыевага ладу з субквартай у працэсе выканання твораў; фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання тэрцовых і квартавых інтанацый |
| | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка «Люлі, люлі, люлі, спаць» з дзвума варыянтамі тэкстаў. Калыханка выконваецца на дзвух гуках у інтэрвале малай тэрцыі, рытмічны малюнак — чаргаванне кароткіх і доўгіх гукаў у характэрнай для калыханак паслядоўнасці | Асэнсаванне наяўнасці тэкставых варыянтаў твора, фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання інтэрвала малай тэрцыі; развіццё меладычнага слыху і музычна-рытмічнага пачуцця |
| | Музіцыраван-не і спевы | Калыханка «Люлі, люлі, люлі, спаць», металафон, трохвугольнік | Развіццё меладычнага слыху і музычна-рытмічнага пачуцця |
| | Рухавая гульня | Гульня «У ката», лічылка № 2 | Развіццё ладавага пачуцця |
| | Успрыманне музыкі | Калыханка «Пайшоў каток...». Ладавая асаблівасць твора — наяўнасць пентатонікі | Развіццё ладавага пачуцця, пачуцця гумару |
| | Імправіза-цыя тэксту калыханкі | Калыханка «Пайшоў каток...», прыклады варыянтаў тэксту (№ 5а). У ствараемых тэкстах неабходна пры-трымлівацца схемы: «Пайшоў — прынёс (знайшоў)» | Развіццё творчага мыслення, ініцыятыўнасці і ак-тыўнасці |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3 | Спевы з элементамі інсцэніроўкі | Калыханка «Пайшоў каток...» | Развіццё меладычнага слыху ў працэсе ўзнаўлення твору, навыкаў выразнага адлюстравання дзеянняў вобраза ў рухах |
| | Вакальная імправіза-цыя, ства-рэнне калек-тыўных варыянтаў | Тэкставыя варыянты па схеме «Пайшоў — прынёс (знайшоў)». Варыянты тэкстаў калектыўна выконваюцца ў тэрцыевым ладзе з субквартай (з мажорным або мінорным нахіленнем). Узорамі могуць быць прыклады — ладавыя схемы № 5б і № 5в | Развіцце прадуктыўнага музычнага мыслення, замацаванне уяўленняў аб тэрцыевым ладзе з субквартай, аб яго эмацыянальных адценнях |
| | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка «Ходзіць певень па капусце». Калыханка вытрымана ў тэрцыевым ладзе з субквартай (мінорнае нахіленне). У рытмічных адносінах — чаргаванне кароткіх і доўгіх гукаў у характэрнай паслядоўнасці | Асэнсаванне варыянтнасці фальклорных твораў праз параўнанне твора з іншымі прыкладамі |
| | Спевы | Калыханкі № 2, 3, 6 | Асэнсаванне варыянтнасці фальклорных твораў праз іх параўнанне; замацаванне вывучаных твораў |
| | Рухавая гульня | Гульня «Лавіць куры», лічылка № 3 | Развіццё ладавага пачуцця |
| 4 | Спевы | Калыханка «Ходзіць певень па капусце» | Замацаванне вывучанага твора; развіццё гукавысотнага слыху, музычна-рытмічнага і ладавага пачуцця |
| | Успрыманне музыкі і спевы | Калыханка «Люлі, люлі, люлі, прыляцелі куры». Твор вытрыманы ў квартовым ладзе, мелодыя будуецца на спалучэнні малой тэрцыі з вялікай секундай. Рыт-мічны малюнак: спалучэнне кароткіх і доўгіх гукаў; рытмічны малюнак з трыолямі, жанрава характэрны тэкст і вобразы | Фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання, развіццё музычна-рытмічнага пачуцця, пашырэнне ведаў аб вобразах калыханак |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Рухавая гульня | Гульня «Лавіць куры», лічылка № 3 | Развіццё ладавага пачуцця |
| | Успрыманне музыкі | Забаўлянка «Ладкі, ладушкі, прыляцелі птушкі». Твор вытрыманы ў квартовым ладзе, меладычная лінія будуецца на спалучэнні вялікай секунды і малой тэрцыі | Замацаванне ведаў пра асаблівасці жанраў калыханкі і забаўлянкі праз параўнанне падобных па вобразным змесце твораў |
| | Спевы і музіцыраванне | Калыханка «Пайшоў каток...», музычныя інструменты | Усведамленне выразных магчымасцяў тэмбраў дзіцячых музычных інструментаў праз аркестроўку твора |
| 5 | Спевы, імправізацыя і музіцыраванне | Увесь вывучаны па тэме матэрыял | Замацаванне ўяўленняў аб жанры калыханкі, вобразах знаёмых калыханак, іх ладавых і рытмічных асаблівасцях |
| | Успрыманне музыкі | Інструментальная калыханка па выбары педагога. Магчыма выкарыстоўваць як апрацоўкі фальклору, так і аўтарскія творы, не выключаючы сучасныя прыклады | Усведамленне сувязі паміж вакальнай і інструментальнай музыкай; асэнсаванне песеннасці ў інструментальнай музыцы |
| | Вакальная імправізацыя | Тэкст калыханкі з казкі «Піліпка-сынок», у які ўносяцца дапаўненні і змены. Магчымы варыянт тэксту: «Люлі, люлі. Спі, Піліпка-сынок, спі, мой мілы галубок, з белымі плячыцамі, з чорнымі вачыцамі. А-а-а, а-а-а» | Развіццё прадуктыўнага музычнага мыслення; замацаванне ведаў аб жанры калыханкі |

**Абсталяванне:** персанажы батлеечнага тэатра або цацкі: хатка, людзі (дзед і баба, маці і бацька, дзіця ў калысцы), жывёлы (кот, петух і куры); дзіцячыя музычныя інструменты: металафон або ксілафон, званочак, трохвугольнік і інш.

**Літаратурны фальклорны матэрыял**

*Казка* «Піліпка-сынок».

*Лічылкі:*

№ 1

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсць, сем, восем,
Выйшла баба з доўгім носам,
А за бабай сівы дзед,
Колькі дзеду таму лет?

№ 2

Ішоў кот праз сто варот,
Дайшоў да канца,
Знайшоў кацяня.
Мяў!

№ 3

Пайшла курка ў аптэку,
Закрычала: «Кукарэку!
Дайце пудры і духоў
На падманку петухоў».

**Музычны фальклорны матэрыял**

*Натаваныя творы:*

№ 1 [19, с. 21].

Павольна

Калыханка



А... а... люлі, а... а... люлі.

Спі, сыночак міленькі,
Галубочак сізенькі.
Мой сыночак будзе спаць,
А я буду калыхаць.

Нашто, вецер, ты гудзеш,
Спаць Міхаську не даеш?
Спі, сыночку міленькі,
Ой, да люлі, люленькі...

Варыянт тэксту [17, с. 130]:

Спі, дачушка мілая,
Галубачка сізая.
Мая дочка будзе спаць,
А я буду калыхаць.

Нашто, вецер, ты гудзеш,
Спаць Марысі не даеш?
Спі, дачушка мілая,
А я цябе люляю.

№ 1а [17, с. 131].

**Калыханка**

Павольна




№ 2 [18, с. 18; 22, № 15].

Калыханка

Павольна



№ 3 [22, № 29].

Калыханка

Павольна




№ 4 [24, с. 10].

Варыянт тэксту [22, с. 98]:

Калыханка

Павольна




Люлі, люлі, люляю.

Засні,спаці, гультаю.

№ 5 [22, № 136; 18, с. 20; 17, с. 134].

Умерана

Калыханка




Пайшоў каток ў лясок[2]

Шукаць Волі паясок.

---

[2] **Кожны радок паўтараецца двойчы.**

Ён паяска не знайшоў.
Узяў плюнуў і пайшоў.
А Волечка чакае,
Што ёй каток шукае.
Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток.
Ён сам бярэ і жарэ,
А Волечцы не дае.

№ 5а [24, с. 28].

Пайшоў каток у лясок, прынёс каток паясок.
Пайшоў каток на ганачак, прынёс каток бараначак.
Пайшоў каток у лавачку, прынёс каток булавачку.
Пайшоў каток на рыначак, прынёс каток разыначак.
Пайшоў каток на крылечка, прынёс каток калечка.
Пайшоў каток на таржок, прынёс каток піражок.

№ 5б.

Павольна



№ 5в.

Павольна



№ 6 [18, с. 18].

Калыханка




№ 7 [2, с. 26; 6, № 195].

Калыханка




№ 8 [18, с. 29].

Умерана

Забаўлянка




Увага! У тэкстах прыведзеных калыханак неаднаразова выкарыстаны розныя імёны дзяцей, для якіх калыханка выконваецца. Пры арганізацыі заняткаў па тэме гэтыя імёны неабходна змяняць на тыя, якіх патрабуе сюжэтная лінія заняткаў (у дадзеным прыкладзе — на імя Міхась).

Магчымая сюжэтная лінія і гульнёвыя сітуацыі

*Занятак 1.* Знаёмы дзецям персанаж дзядуля прапануе ўспомніць казку «Піліпка-сынок» (або абяцае пазнаёміць з гэтай казкай). Пасля чытання ўрыўка ад пачатку казкі, дзед пытаецца ў слухачоў, ці запомнілі яны, якія словы спявала маці над калыскай, і ўдакладняе, ці ведаюць дзеці, як называюцца песні, якія спяваюць, каб дзеткі спалі. Далейшае чытанне казкі дзядуля прапануе адкласці, а зараз пазнаёміцца з жыхарамі яго хаткі (дэманструе персанажы — бабулю, маладых маці і бацьку, дзіця) і скласці ўсім разам пра іх сваё апавяданне.

Пачатак апавядання можа быць наступны: «У вёсцы заўсёды шмат працы. Вось і сёння зранку малады гаспадар ужо пайшоў у поле, а маладая гаспадыня толькі сабралася пайсці з дому, як яе малое дзіця прачнулася і пачало плакаць. Што рабіць? Трэба заспяваць калыханку, каб дзіця супакоілася і заснула». Пасля гэтага ў выкананні дарослага гучыць калыханка «Спі, сыночак міленькі» (№ 1). (Увага! Магчыма выкананне варыянту гэтай калыханкі для дзяўчынкі «Спі, дачушка мілая»). Пасля праслухоўвання пажадана звярнуць увагу дзяцей на словы, з якімі маці звяртаецца да свайго сыночка Міхаські, ахарактарызаваць пачуцці, адлюстраваныя ў творы.

Далей дарослы распавядае: «Міхаська як быццам заснуў, але толькі маці пайшла з дому, ён зноў заплакаў. Дзядуля і бабуля пачалі супакойваць малога. Але адразу не ўспомнілі якую-небудзь калыханку, а таму заспявалі, як змаглі». Пасля гэтага дарослы выконвае варыянт калыханкі на гукі «А-а-а» (№ 1а) у розных галасавых рэгістрах ад імя бабулі або дзядулі. Затым дзецям прапануецца таксама выканаць падобную калыханку. Спачатку дзяўчынкі па жаданні імправізуюць ад імя бабулі, а хлопчыкі — ад імя дзядулі, а потым удзельнічаюць усе дзеці, усталёўваючы чаргу па лічылцы № 1.

Пасля выканання гэтага задання дзядуля раптам «узгадвае» калыханку і «выконвае» яе (№ 2 «Хадзіў каток па капусце»), далей калыханка развучваецца з дзецьмі «з голаса», пры гэтым спевы можна

суправаджаць імітацыяй рухаў персанажа, мадэліруючых рытмічны малюнак. Неабходна абавязкова звярнуць увагу дзяцей і на настрой калыханкі (мажорны лад).

Далей дарослы працягвае: «Дзядуля разам з намі шмат разоў пеў калыханку. Ён нават стаміўся, таму бабуля вырашыла паклікаць ката, каб ён дапамог ім». Пасля гэтага дарослым ад імя бабулі выконваецца першыя два радка калыханкі № 3 «А ты, каток шэры». Дзецям прапануецца паклікаць ката разам (пры выкананні неабходна звярнуць увагу на мінорны лад твора); такім чынам першая частка калыханкі можа спявацца (калектыўна або сола) да таго моманту, пакуль іх выкананне «не задаволіць» ката. Да той пары «кот» (дарослы) кожны раз прапявае трэці радок калыханкі. Калі калыханка ў выкананні дзяцей гучыць здавальняюча, дарослы ад імя бабулі дапявае апошні радок. Напрыканцы ўвесь твор выконваецца калектыўна яшчэ раз. Маленькі Міхаська «засынае», а кот прапануе дзецям рухомую гульню «У ката». Для арганізацыі гульні выкарыстоўваецца лічылка № 2.

*Занятак 2.* Напачатку дзецям прапануецца ўзгадаць, якія калыханкі пелі дзед і баба, і разам з імі выканаць іх для маленькага Міхася. Яшчэ раз удакладняецца ладавая афарбоўка двух твораў: дзядуліна калыханка больш бадзёрая, яна гучыць весялей; бабуліна — больш спакойная і сумная.

Калі кот зноў з’яўляецца, яго просяць спець новую калыханку. Дарослы ад імя ката выконвае калыханку № 4 «Люлі, люлі, люлі, спаць» з першым варыянтам тэксту, дзе звяртаюцца да Светачкі, на што кату робяць заўвагу. Тады «кот» спявае гэтую калыханку з другім варыянтам тэксту. Пры далейшых калектыўных спевах гатага варыянту дзецям прапануецца суправаджаць спевы рухамі правай рукі, імітуючы рух калыскі і мадэліруючы метрычную аснову твора.

Далей гэты варыянт калыханкі выконваецца дарослым на металафоне або ксілафоне, некалькі дзяцей па чарзе (па жаданні або па лічылцы) адзначаюць метрычную пульсацыю мелодыі на

трохвугольніке. Пасля гэтага дзеці па жаданні могуць самі сыграць мелодыю на гукавысотным інструменце (сола або нават дуэтамі).

Пасля правядзення рухавай гульні «У ката» дзеці знаёмяцца з новым узорам калыханкі, што выконвае маці, якая ўжо прыйшла дадому (№ 5 «Пайшоў каток...»). Яна просіць ката прынесці падарункі для Міхаські. Пасля ўспрымання і, па магчымасці, падпявання дзецьмі асобных фраз твора, дзецям прапануецца самім скласці варыянты тэксту, адказваючы на пытанні: куды мог яшчэ пайсці каток, што ён мог прынесці ў падарунак? Каб палегчыць дзецям задачу, дарослы можа прапанаваць свой варыянт адказу на першае пытанне (можна карыстацца варыянтам № 5а), а дзеці ў рыфму падбіраюць адказ на другое пытанне.

*Занятак 3.* Падарожжа катка за падарункамі працягваецца, але яму патрабуецца дапамога дзяцей. У гэты момант яны самі становяцца «катамі» і разнастайнымі рухамі адлюстроўваюць падзеі, якія адбываюцца ў творы. Пасля некалькіх выкананняў твора выяўляецца «лепшы кот». Яму дазваляецца прапанаваць свой тэкст пра падарунак ад ката (або ўзгадаць з папярэдняга занятку) і вызначыць, які настрой будзе адлюстраваны ў гэтай калыханцы (мажорнае або мінорнае нахіленне). Пасля гэтага калектыўна выконваецца прапанаваны варыянт з апорай на гукі тэрцовага ладу з субквартай (прыклады № 5б і 5в). Пажадана адабраць і выканаць калектыўна некалькі варыянтаў.

Далей дарослы працягвае сюжэтную лінію: «Сваю калыханку вырашыў праспяваць сыночку і яго бацька. Вось што ў яго атрымалася...» (дарослы ад імя бацькі выконвае калыханку № 6 «Ходзіць певень па капусце»). Пасля ўспрымання абавязкова трэба параўнаць гэты твор з ўжо вядомымі дзецям калыханкамі. Можна запытацца: «Хто з нашых жыхароў хаткі спяваў падобную калыханку?» Хутчэй за ўсё, дзеці выявяць падобнасць новай калыханкі з дзедавай калыханкай «Хадзіў каток па капусце» (падобны па тэксту і сюжэту, але адрозніваюцца ладавым нахіленнем). Неабходна звярнуць увагу на

меладычную падобнасць з калыханкамі, якія спявалі маці («Спі, сыночак міленькі») і бабуля («А ты, каток шэры»). Пажадана яшчэ раз разам з дзецьмі выканаць гэтыя калыханкі.

Напрыканцы занятку можна правесці рухомую гульню «Лавіць куры», выкарыстоўваючы новую лічылку № 3.

*Занятак 4.* Напачатку дзеці разам з дарослым ўзнаўляюць калыханку «Ходзіць певень па капусце». У мэтах найлепшага засваення рытмічнага малюнка і мелодыі карысна выкарыстоўваць рухавае мадэліраванне, звязаннае з вобразам: рытмічны малюнак адлюстроўваць падчас выканання з дапамогай «шагоў пеўня», а гукавысотную лінію — «крылаў пеўня» (рухаў рукамі).

Працягваючы сюжэтную лінію заняткаў, дарослы прапануе паклікаць кур. Дзеля гатага можна ўзгадаць лічылку № 3 і нават паспрабаваць некалькі разоў яе меладызаваць па ролях, дзе дарослы будзе спяваць словы аўтара, а дзеці па жаданні — словы куркі. Пасля гэтага дарослы знаёміць дзяцей з новай калыханкай «Люлі, люлі, люлі, прыляцелі куры» (№ 7). Пры паўторным выкананні дзеці павінны падпяваць дарасламу, суправаджаючы спевы рухамі пад тэкст твора.

Пасля рухавай гульні «Лавіць куры» дарослы паведамляе, што «наш маленькі Міхаська сёння ўжо добра паспаў і яго патрэбна павесяліць, пазабавіць. Вось як мы яму праспяваем...» Пасля гэтага выконваецца забаўлянка «Ладкі, ладушкі» (№ 8), тэкст якой нагадвае тэкст апошняй з калыханак, выяўляецца роднаснасць вобразаў твораў, але падкрэсліваецца іх рознае функцыянальнае значэнне і настрой. Падчас выканання забаўлянкі дзеці могуць выконваць характэрныя для забаўлянкі пляскання ў далоні, ствараючы некаторыя варыянты рытмічнага малюнка твора.

Пасля ўдакладнення жанравай прыналежнасці твора дарослы прапануе узгадаць вядомыя дзецям забаўлянкі, выканаць іх калектыўна, у ансамблях або сола.

Напрыканцы зноў можна звярнуцца да жанру калыханкі праз пытанне: «А ў калыханках бывае смешны тэкст, як ў забаўлянках?» Твор «Пайшоў каток ў лясок» выконваецца і аркеструецца дзецьмі з дапамогай дзіцячых інструментаў, якія імітуюць шум лесу, плёсканне вады.

*Занятак 5* прысвечаны, галоўным чынам, замацаванню вывучаных твораў, удакладненню ўяўленняў пра іх асаблівасці. Паўтарэнне калыханак магчыма ажыццявіць праз выпадковы выбар вобраза калыханкі або персанажа, які выконваў калыханку. Так, можна арганізаваць гульню накшталт «Цудоўнага меху», дзе схаваліся персанажы, якія ўдзельнічалі ў занятках тэмы, або з дапамогай «ваўчка», які пакажа на знаёмы персанаж, або кубіка, на гранях якога адлюстраваны вобразы і сюжэты калыханак. Пры жаданні дзеці могуць узнаўляць свае імправізацыі або ствараць новыя варыянты, музіцыраваць. Цікаўнасць выклікае ў дзяцей прапанова выканаць калыханку для каго-небудзь з групы або для любімай цацкі з абавязковым зваротам па імені.

У мэтах пашырэння ўяўленняў дзяцей аб жанры карысным будзе прапанаваць для ўспрымання інструментальную калыханку (запіс або жывое выкананне). Неабходна звярнуць увагу дзяцей на песеннасць у інструментальнай музыцы: «У гэтай калыханцы няма словаў, але па настроі, меладычнасці музыкі мы можам здагадацца, што гэта калыханка». Пры жаданні дзеці на гукі «А-а-а» могуць падпяваць інструментальнаму выкананню.

У канцы вывучэння тэмы «Калыханкі» пажадана зноў звярнуцца да тэксту казкі «Пілiпка-сынок» і меладызаваць новы тэкст калыханкі для Піліпкі, у які можна ўключыць такія характэрныя для жанра словы, як «а-а», «люлі», разнастайныя звароты.

## Тэма «Зімовы фальклор»

| № занятку | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці; абсталяванне | Задача выкарыстання Фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| 1 | Успрыманне музыкі | Песня «Ой, калядачкі, бліны-ладачкі». Апрацоўка фальклорнага твора, жанравая асаблівасць — наяўнасць традыцыйнага рэфрэну: «Каляда!» | Стварэнне пэўнага эмацыянальнага настрою, зацікаўленасці, замацаванне ўяўленняў аб традыцыйных святах |
| | Успрыманне музыкі | Загадка; урывак песні «Го-го-го, каза» (аўтэнтычны запіс). Тыповы ўзор жанра калядкі, з характэрным рыт-мічным малюнкам (працяглы пяты гук фразы) | Замацаванне ўяўленняў аб аўтэнтычным фальклоры, асаблівасцях традыцыйнага выканання твораў |
| | Слуханне, падпавянне, музіцыраван не | Песня «Каляда з казой» (№ 1, першы варыянт апрацоўкі). Тыповы ўзор жанра з характэрным рытмічным малюнкам (працяглы пяты гук фразы). Адрозненне ад варыянту ў аўтэнтычным гучанні меладычнае і тэкставае | Пашырэнне ўяўленняў аб жанры каляднай песні; развіццё музычна-рытмічнага пачуцця; асэнсаванне прынцыпу варыянтнасці ў фальклоры; фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання ў межах тэрцыевага ладу |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Жораў». У танцы імітуюцца рухі жураўля — дзеючай асобы абрада калядавання. | Развіццё музычна-рытмічнага пачуцця, прадуктыўнага мыслення |
| 2 | Слуханне, падпяванне | Песня «А ў лузе, лузе». Характэрны рытм (працяглы пяты гук фразы) і наяўнасць традыцыйнага рэфрэну: «Добры вечар!», які ўяўляе сабой квінтовы ход | Развіццё музычна-рытмічнага пачуцця; замацаванне тыповага рытмічнага малюнка, навыкаў чыстага інтанавання інтэрвала квінты |
| | Слуханне, спевы | Урывак песні «Шчодры вечар» (№ 4, першы варыянт твора). Гэты варыянт адрозніваецца ад папярэдняга пункцірным рытмам і запоўненасцю тэрцыі ў мелодыі | Развіццё музычна-рытмічнага пачуцця ў працэсе ўзнаўлення пункцірнага рытмічнага малюнка; фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання ў межах трыхорда |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Жораў» | Замацаванне танцавальных і імітацыйных рухаў |
| | Успрыманне і імітацый-ныя рухі | Песня «Каляда з казой» (№ 5, другі варыянт твора) Характэрны рытм (працяглы пяты гук), у ладавых ад-носінах — узор ладу з цэнтральнай тонікай. Тэкст дае магчымасць выконваць імітацыйна-гульнёвыя рухі | Асэнсаванне прынцыпу варыянтнасці ў фальклоры; замацаванне тыповага рытмічнага малюнка; развіццё прадуктыўнага мыслення |
| 3 | Успрыманне і спевы | Песня «Шчодры вечар» (№ 4), урывак з песні «Шчод-ры вечар» (№ 6, другі варыянт твора). Другі варыянт пабудаваны на гучанні малой тэрцыі, рытм твора — раўнамерны. Тэкст, традыцыйны для шчадровак | Асэнсаванне прынцыпу варыянтнасці; фарміраванне навыкаў узнаўлення малой тэрцыі і раўнамернага рытму |
| | Спевы і му-зіцыраванне | Песня «Каляда з казой» (№ 5, другі варыянт твора) | Развіццё гукавысотнага слыху і ладавага пачуцця, засваенне тыповага рытму праз ігру на шумавых музычных інструментах |
| | Танцавальная імправізацыя | Танец-гульня «Пакажы, казелінька». Асаблівасць твора ў магчымасці ўвасаблення вобразаў, звязанных з тэкстам (бабулі, хлопчыкі, козлікі) | Развіццё прадуктыўнага мыслення; фарміраванне ўменняў увасабляць вобраз у рухах; развіццё назіральнасці |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Жораў» | Развіццё навыкаў руху ў адпаведнасці з характарам музыкі |
| 4 | Успрыманне | Найгрыш «Каляда» (аўтэнтычны запіс). Галоўная асаблівасць: наяўнасць тыповага рытму (працяглы пяты гук) | Асэнсаванне роднасці вакальнай і інструментальнай музыкі, замацаванне ведаў аб спосабе выканання на скрыпцы |
| | Спевы | Урыўкі песень «Шчодры вечар» (№ 4, № 6) | Замацаванне ўзораў раўнамернага і пункцірнага рытмічнага малюнка, навыкаў чыстага інтанавання тэрцыевых ладоў |
| | Падпяванне, музіцыра-ванне | Песня «А ў лузе, лузе»; ксілафон | Асэнсаванне формы твора (наяўнасць рэфрэну), навыкаў выканання чыстай квінты на ксілафоне, гукавысотнага слыху |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Спевы | Песня «Каляда з казой» | Замацаванне ўзору; развіццё музычна-рытмічнага пачуцця, гукавысотнага слыху |
| | Успрыманне | Найгрыш «Камарыцкая», фота парных дудак. Найгрыш выконваецца на парных дудках | Знаёмства з парнымі дудкамі; развіццё тэмбравага слыху |
| | Успрыманне | Развітальная песня «Будзь ваша здароў» (№ 8) Тыповы рытмічны малюнак, наяўнасць рэфрэну: «Гэй, каляда, калядзіца!» | Пашырэнне ўяўленняў аб функцыянальным прызначэнні песен зімовага цыклу і рытмічнай роднасці, форме твораў |
| 5 | Спевы | «Шчодры вечар» (№ 9, трэці варыянт песні), паўтарэнне першых дзвух варыянтаў. Асаблівасць варыянту ў рытмічным супадзенні з рэфрэнам развітальнай песні, больш значным адрозненні тэксту ад першых дзвух варыянтаў | Асэнсаванне прынцыпу варыянтнасці фальклора; засваенне рытмічнага малюнка «чвэрць, дзве васьмыя, чвэрць» |
| | Вакальная імпра-візацыя | Стварэнне невялічкіх ўласных прывітанняў. У імправізацыях неабходна адлюстраваць тыповыя моўныя звароты, пажаданн. | Развіццё прадуктыўнага мыслення, актывізацыя слоўніка; замацаванне уяўленняў аб рытмічна-меладычных рысах шчадровак |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец-гульня «Пакажы, Казелінька» | Развіццё прадуктыўнага мыслення; фарміраванне ўменняў ўвасабляць вобразы ў рухах |
| | Рухавая гульня са спевамі | «У мядзведзя на бару» (№ 10). Папеўка да гульні будуецца на вылікай секундзе або малой тэрцыы | Фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання, актыўнасці |
| | Успрыманне і падпяванне | Развітальная песня «Будзь ваша здароў» | Засваенне рытмічнага малюнка «чвэрць, дзве васьмыя, чвэрць» пры падпяванні рэфрэну |
| 6 | Рухі, спевы, музіцыраван-не, гульні | Увесь вывучаны па тэме матэрыял | Фарміраванне навыкаў выразнага выканання твораў; замацаванне ўяўленняў аб абрадах калядавання і шчадравання |

**Абсталяванне:** персанажы батлейкі або лялькі дзеля стварэння сюжэтнай лініі і гульнёвых сітуацый: хатка, людзі (дзед і баба, дзяўчына і хлопчык, гаспадар-музыка), жывёлы (каза, воўк, жораў, мядзведзь); дзіцячыя музычныя інструменты: металафон або ксілафон, разнастайныя шумавыя інструменты, малюнкі або фотаздымкі музыкі з парнымі дудкамі і калядоўшчыка ў адзенні казы.

**Літаратурны фальклорны матэрыял**

*Казка:* «Як воўк калядаваць хадзіў».

*Загадка:* «З барадою, а не стары, з рагамі, а не бык, дояць, а не карова, лыкі дзярэ, а лапці не пляце». (*Каза.*)

*Лічылка*:

Эны-бэны, фіны, лёк,
Сам Пятровіч бліны пёк.
Пёк, пёк, недапёк,
Схапіў шапку дый уцёк.

**Музычны фальклорны матэрыял**

*Аўтэнтычныя аўдыязапісы:* найгрыш на скрыпцы «Каляда» [4, № 16], найгрыш на парных дудках «Камарыцкая» [4, № 19]; песня «Го-го-го, каза» [4, № 18].

*Аўдыязапісы апрацовак фальклору:* песня «Ой, калядачкі, бліны-ладачкі» [1].

*Натаваныя творы:*

№ 1[3] [18, с. 37].

Каляда з казой




1. Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе ж ты козанька,
Дзе ж ты бывала?
— Я ў бару-бару
Ягадкі брала.

2.Я ў бару-бару
Ягадкі брала.
Як прыбег ваўчок,
Ухапіў козаньку,
А ваўчанята:
За казянята.

3. Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Як ты, козанька,
Як ты крычала?
— Так я крычала:
«Мэ-гэ-гэ-гэ-гэ».

4. Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Як ты, козанька,
Як ты ўцякала?
— Так я ўцякала :
«Туп-туп-туп-туп-туп».

5. Стара казішча,
Стань, расхадзіся,
Стань, расхадзіся,
Развесяліся.
А хазяіну
У ногі скланіся!

6. Шчэ (й) гаспадыні
Штоб падарылі:
Мерачку аўса,
Наверх каўбаса,
Сала паласа —
Песенька ўся.

№ 2 [31, с. 47].

---

**[3] Тут і далей знак * пасля нумара твора азначае, што тэкст твора прыведзены з невялікімі скарачэннямі.**




№ 3 [17, с. 29].




А ў лузе, лузе
Каліна красна.
Добры вечар![4]
Ой, ясней, красней
Ганна ў татачкі.
На двор хадзіла —
Увесь двор красіла.
У сені ўвайшла —
Сені заззялі.

У хату ўвайшла.
Паны стаялі.
Паны стаялі,
Шапкі зымалі:
— Ці ты цароўна,
Ці каралёўна?
— Я ні цароўна,
Ні каралёўна.
Таткава дачка —

[4] **Рэфрэн паўтараецца пасля кожнага дзвухрадкоўя.**

Красна панначка.

— Мамчына дачка,

Як та ягадка.

Мы ж цябе, красну,

Не зневажаем.

І з Новым Годам

Паздраўляем!

№ 4* [19, с. 57].

Шчодры вечор, святы вечор




№ 5* [20, с. 133].

Каляда з казой




Го-го-го, каза,

Го-го-го, шэра!

Дзе каза рогам,

Там жыта стогам,

Дзе каза нагой,

Там жыта капой,

Дзе каза хвастом,

Там жыта кустом.

№ 6* [19, с. 56].

Шчодры вечор, добры вечор




№ 7* [31, с. 45].

Умерана

Пакажы, казелінька




У кожным наступным куплеце замест «бабулі» спяваецца: «дзяўчаты», «хлопчыкі», «козлікі».

№ 8* [19, с. 100].

Будзь ваша здароў




| | | |
|---|---|---|
| Будзь ваша здароў,<br>Як рыжык з бароў!<br>Гэй, каляда, калядзіца![5] | Май торбу грошай,<br>Жыві ў раскошы! | Май усяго даволі,<br>А бяды — ніколі! |

№ 9* [19, с. 57].

[5] **Рэфрэн паўтараецца пасля кожнага дзвухрадкоўя.**

Шчодры вечор, добры вечор




№ 10 [18, с.182—183].

У мядзведзя на бару
(1 варыянт)




У мядзведзя на бару

Грыбы, ягады бяру,

А мядзведзь на нас глядзіць

І вурчыць.

Умерана

У мядзведзя на бару
(2 варыянт)



Магчымая сюжэтная лінія і гульнёвыя сітуацыі

*Занятак 1.* Гучанне шырокавядомай апрацоўкі беларускай народнай песні «Ой, калядачкі, бліны-ладачкі» выконвае ролю своеасаблівай музычнай загадкі, якая адначасова са стварэннем пэўнай святочнай атмасферы дазволіць (праз пытанні дарослага) даведацца аб існуючых у дзяцей уяўленнях аб зімовых святах беларусаў і пашырыць, удакладніць іх у далейшай размове. Інфармацыя можа быць самая разнастайная, даступная дзецям гэтага ўзросту, але пажадана даць неабходныя звесткі аб тых з'явах, якія пэўным чынам адлюстраваны ў

фальклоры гэтай тэмы. Так, папулярнасць такой стравы, як бліны, абумоўлена павер'ем, што не будзе ў гаспадароў гладкай тлустай жывёлы, калі ў час Каляд (дакладней на «другую куццю» — 13 студзеня) не пякуцца бліны.

Успрыманне наступнага твора — урыўка песні «Го-го-го, каза», як і кожнага аўтэнтычнага твора, неабходна арганізаваць так, каб выклікаць зацікаўленасць дзяцей. Успрыманне можа папярэдзіць загадка пра казу, пасля чаго з'яўляецца і адпаведны парсанаж батлейкі, які разам з дарослым распавядае дзецям аб сваёй адказнай ролі ў калядным абрадзе, падкрэслівае, што людзі вельмі казу паважалі (як сімвал пладароднасці) і часта пераапраналіся ў яе (прадэманстраваць фота), спявалі песні і танцавалі — «вадзілі казу», за што атрымлівалі паднашэнні ў выглядзе розных прысмакаў. Гэтыя песні звычайна пелі моладзь і дзеці, але і старыя людзі іх вельмі добра памятаюць. «Каза» прапануе падыйсці да «адной хаты» і паслухаць, як спяваюць такую песню бабулі. Пасля гэтага можа прагучаць аўтэнтычны ўрывак.

Пасля ўспрымання ўрыўку вельмі важна зрабіць акцэнт на тым, што песень, падобных гэтай, вельмі шмат. І яшчэ адну (іншы варыянт тэксту і мелодыі, але характэрны рытм) наша знаёмая каза жадае выканаць разам з дарослым. Падчас выканання песні «Каляда з казой» дарослы можа зрабіць невялічную яе інсцэніроўку, выкарыстоўваючы персанажаў батлейкі — бабулю і дзядулю (якія выконваюць тэкст аўтара), казу, воўка. На гэтым этапе засваення дзецьмі музычных асаблівасцяў шматлікіх калядак неабходна звярнуць увагу дзяцей на традыцыйны рытмічны малюнак кожнай фразы. Зрабіць гэта можна ў працэсе прапявання дзецьмі слоў казы «Мэ-гэ-гэ-гэ-гэ» і дэманстрацыі яе «ўцёкаў» праз тупанне нагамі: «Туп-туп-туп-туп». Для гэтага каза можа праспяваць адпаведныя два куплеты «на біс». Пры наступным выкананні песні дарослым можна прапанаваць асобным дзецям

(выбраных праз лічылку) з дапамогай шумавых музычных інструментаў акцэнтаваць пяты гук кожнай фразы.

Далей каза знаёміць дзяцей са сваім сябрам жоравам, які таксама з'яўляецца вельмі папулярным персанажам калядавання. Ён жадае навучыць дзяцей свайму танцу, які так і называецца «Жораў» (або «Журавель»). Разгорнуты харэаграфічны варыянт гэтага танца пададзены ў літаратуры [18], але ён дастаткова складаны, і некаторыя яго рухі могуць быць зменены на тыя, якія традыцыйна выкарыстоўваліся ў гэтых танцах [31]. Гэта нахілы корпуса з узнятымі і злучанымі наверсе рукамі, што нагадвае жураўля, які апускае да зямлі сваю дзюбу, і рухі, якія перадаюць хлопанне крыламі, уздыманне і апусканне жураўлём ног. Існуе і варыянт карагода, у якім у цэнтры круга ходзіць хлопец-«журавель», а астатнія выканаўцы ідуць па кругу, павольна падымаючы то левую, то правую нагу; потым пары кружацца, а хлопец імкнецца ўхапіць якую-небудзь дзяўчыну і станцаваць з ёю; «жураўлём» становіцца хлопец без пары.

*Занятак 2.* Сюжэтная лінія гэтага і наступных заняткаў тэмы будуецца на своеасаблівым «калядаванні» каля лялечнай хаткі, дзе «жывуць» знаёмыя персанажы. Напярэдадні выканання прывітальнай песні «А ў лузе, лузе» дарослы павінен растлумачыць, што калядаванне, якое ўключае ў сябе ўжо знаёмы дзецям абрад «ваджэння казы», пачынаецца з прывітання гаспадарам хаты, віншавання. Пасля выканання песні дарослым, якое пажадана суправаджаць падпяваннем дзецьмі рэфрэну «Добры вечар!», цікавым будзе для дзяцей выкананне дарослым першых дзвух куплетаў непасрэдна для дзяўчынак групы. У гэтым выпадку імя «Ганна» змяняеца на іншае дзявочае імя. Дзяўчынка, для якой спелі прывітанне, павінна таксама прывітаць спевака: яна выконвае фразу «Добры вечар».

Акрамя калядак, у зімовым песенным фальклоры шырока прадстаўлены і шчадроўкі, якія выконваліся ўжо пад Новы год. Першую з такіх шчадровак (урывак) можна вывучыць разам з дзецьмі. Каб дабіцца больш дакладнага выканання рытмічнага малюнка, магчыма выкарыстаць яго мадэліраванне дзецьмі з дапамогай «крокаў» у адпаведнасці з пункцірным рытмам. Аналагічны рытмічны малюнак прысутнічае і ў танцы «Жораў». Гэтая асаблівасць дазваляе звязаць шчадроўку з танцам: па-першае, рытм шчадроўкі можа быць прамадэліраваны з дапамогай рухаў, імітуючых рухі дзюбы жорава (правая рука дзіцяці — жораў з дзюбай, у левай руцэ — смачнае паднашэнне для яго); па-другое, гэтая сувязь заахвоціць дзяцей да выканання танца, у які можна ўключыць новыя рухі.

Каб калядаванне было амаль што сапраўдным, неабходна прапанаваць дзецям вывучыць песню «пра казу» (другі варыянт песні «Каляда з казой»), суправаджаючы развучванне рухамі ў адпаведнасці з тэкстам (паказваючы рожкі, хвосцік і г. д.).

*Занятак 3.* Дзеці працягваюць «калядаванне». На гэты раз перад імі зачыненая хата, і каб паклікаць гаспадара, неабходна спець знаёмую шчадроўку, пажадана некалькі разоў (хорам, ансамблямі, сольна). Працягваючы сюжэтную лінію, дарослы паведамляе, што «гаспадар» не чуе нашых спеваў, трэба пастукаць у дзверы, але зрабіць гэта патрэбна з дапамогай новай шчадроўкі. Пасля гэтага дарослы спявае другі варыянт шчадроўкі, удакладняе разам з дзецьмі падобнасць і адрозненні варыянтаў. Раўнамерны рытм гэтага ўзору дазваляе мадэліраваць яго — «стукаць ў дзверы». Дзеці па чарзе (магчыма з дапамогай лічылкі) выконваюць новы варыянт шчадроўкі.

Бабуля, якая адчыняе дзверы, просіць калядоўшчыкаў «праспяваць казу», пасля чаго дзеці выконваюць другі варыянт «Каляда з казой», дапаўняюць выкананне рухамі. Паўторнае выкананне можа

суправаджацца ігрой на шумавых інструментах, сярод якіх некаторыя будуць адлюстроўваць рытмічны малюнак цалкам, некаторыя — акцэнтаваць пяты гук кожнай фразы. Пасля выканання бабуля можа даць падарункі найбольш ўдалым выканаўцам.

Далей яна паведамляе, што яе малыя ўнук ды ўнучка засумавалі, а яна ж ведае танец-гульню «Пакажы, казелінька», якая можа іх развесяліць, але ёй ужо цяжка скакаць і танцаваць. Таму яна просіць дзяцей дапамагчы: яна будзе спяваць, а дзеці павінны паказаць тых, пра каго спяваецца, у рухах. Той з танцораў, які найбольш сапраўдна пакажа герояў, атрымае падарунак ад бабулі. Так праводзіцца танец-гульня «Раскажы, казелінька». Напрыканцы занятку бабуля пытаецца, ці не забыліся дзеці пра жорава, і прапануе станцаваць яго танец.

*Занятак 4. «*Калядаванне» працягваецца. На гэты раз з хаты чуваць інструментальны найгрыш на скрыпцы. Каб даведацца, хто ў гэтай хаце гаспадар, неабходна зноў праспяваць шчадроўкі. Пасля спеваў чуваць голас гаспадара — ён згодзен пусціць калядоўшыкаў да сябе пасля таго, як яны разам з ім сыграюць на скрыпцы. Пад гучанне найгрыша дзеці імітуюць уласнае выкананне на скрыпцы, мадэліруя даўжыню гукаў з дапамогай выканальніцкага жэста — на больш працяглы пяты гук фразы дзеці «выконваюць» працяглы гук «на скрыпцы».

Дзверы адчыняе дачка гаспадара. Для яе дарослы прапаноўвае выканаць песню «А ў лузе, лузе», у якой дзеці хорам падпяваюць рэфрэн. Пасля гэтага яны прывітаюцца і з гаспадаром — дзеці па жаданні выконваюць на ксілафоне гэты ж рэфрэн «Добры вечар!» і падпяваюць сабе.

Пасля чарговага выканання «казы» гаспадар-музыка вырашае пазнаёміць дзяцей з новым інструментам, прапануе ім здагадацца, на які вядомы ім інструмент ён падобны. Пасля гучання найгрыша на парных дудках дзеці разглядаюць фотаздымак ці малюнак інструмента.

Перад развітаннем з гаспадаром-музыкай дарослы паведамляе, што існуюць не толькі прывітальныя, але і развітальныя зімовыя песні, у якіх таксама выказваюцца пажаданні гаспадарам, пасля чаго выконвае песню «Будзь ваша здароў». Пры паўторным выкананні песні дарослым пажадана, каб дзеці падпявалі хорам рэфрэн «Гэй, каляда, калядзіца».

*Занятак 5.* Напачатку дарослы паведамляе, што ў калядаванні можа ўдзельнічаць яшчэ адзін персанаж — мядзведзь. Але звычайна ўзімку ён спіць, таму трэба яго паклікаць. Больш за ўсё наш мядзведзь любіць вось такую шчадроўку (дарослы выконвае «Шчодры вечар» № 9), пры гэтым сам мадэліруе «крокі» мядзведзя, якія адпавядаюць рытмічнаму малюнку твора ( чвэрць, дзве васьмыя, чвэрць). Далей усе хорам некалькі разоў выконваюць урывак шчадроўкі.

Але мядзведзь не задаволены. Ён жадае, каб дзяці праспявалі яго шчадроўку-прывітанне, каб ведаць, што дзеці сапраўды падрыхтаваны да калядавання. Варыянт можа складацца як калектыўна разам з дарослым (з больш разгорнутым і складаным тэкстам), так і імправізавацца сольна жадаючымі (у гэтым выпадку варыянт можа нагадваць адзін з вядомых дзецям).

Далей мядзведзь жадае ўпэўніцца ў тым, што дзеці могуць не толькі прывітацца песняй, але і развітацца. Для спакою мядзведзя дарослы прапануе выканаць разам з ім развітальную песню, у якой рэфрэн выконваецца дзецьмі хорам і суправаджаецца пляскannем у далоні або тупаннем ў адпаведнасці з рытмічным малюнкам, які так падабаецца мядзведзю.

Нарэшцэ мядзведзь згаджаецца сябраваць з дзецьмі і прапаноўвае ім гульню «У мядзведзя на бару». Паколькі сюжэт гульні не адпавядае зімоваму сезону, з'яўленне гэтай гульні у цыкле зімовых заняткаў дзяцям можна данесці наступным чынам: "Наш мішка вельмі любіць гуляць у гэтую гульню ўлетку разам са сваімі сябрамі – ляснымі

жыхарамі. Вы мішке вельмі спадабаліся і ён жадае навучыць вас гэтай гульне”. Правілы гульні наступныя. З удзельнікаў гульні выбіраюць «мядзведзя». Усе астатнія дзеці робяць выгляд, што збіраюць грыбы і ягады, пры тым спяваюць папеўку, магчыма некалькі разоў. «Мядзведзь» выбірае зручны момант, каб кінуцца да іх. Першы злоўлены гулец становіцца «мядзведзем».

Пасля таго, як мядзведзь убачыў поспехі дзяцей, ён прапануе на наступным занятку арганізаваць «сапраўднае калядаванне» — у суседняй групе садка. Далейшая праца на занятку падпарадкавана размеркаванню роляў, паўтарэнню неабходных для правядзення наступнага занятка твораў. Матэрыял, вывучаны ў гэтым цыкле заняткаў, безумоўна, можа быць карысным і пры арганізацыі фальклорнага свята або пастаноўцы каляднай казкі «Як воўк калядаваць хадзіў», у якой разам з дарослымі дзеці могуць ваконваць невялічкія ролі калядоўшчыкаў.

## Тэма «Заняткі нашых продкаў»

| № занятку | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці; абсталяванне | Задача выкарыстання фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| 1 | Успрыманне і падпяванне | Забаўлянка «Сіўка-варонка». Тэкст забаўлянкі дыялагічны, у ладавых адносінах — узор тэрцыевага ладу з субквартай (мінорнае нахіленне), наяўнасць рэфрэну | Замацаване ўяўленняў аб жанры забаўлянкі, яе музычнай форме; фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання чыстай кварты пры падпяванні рэфрэну |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Каваль». Спалучаюцца танцавальны рух па-дэ-баск і імітацыйныя рухі | Фарміраванне ўменняў рухацца ў адпаведнасці з выяўленчымі рысамі музыкі, магчыма вывучэнне танца-вальнага кроку па-дэ-баск |
| | Успрыманне | Песня «Я табун сцерагу». У аснове песні — квінтовы лад, мелодыя складаецца пераважна з тэрцыевых, квартовых і квінтовых інтанацый, што ставарае вельмі пранікнёны, выразны вобраз | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, уменняў інтэрпрэтыраваць музычны вобраз з дапамогай колеравых асацыяцый |
| | Спевы | Песня «Пастухоў найгрыш на трубе» | *Гл.* тэму «Уводзіны ў фальклор» |
| | Рухавая гульня | Гульня «Воўк і авечкі» | Развіццё ладавага пачуцця |
| 2 | Спевы, тэкставая імправізацыя | Забаўлянка «Сіўка-варонка» | Замацаванне тэксту, развіццё прадуктыўнага мыслення |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Каваль» | Фарміраванне навыкаў выразных і дакладных рухаў; замацаванне танцавальнага кроку па-дэ-баск (калі ён выкарыстоўваецца ў танцы) |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Успрыманне і музычна-рытмічныя рухі | Танец «Шастак» (прыпеўка № 4 да танца), апрацоўка для баяна і аўтэнтычны запіс), малюнкі з выявамі інструментаў. Традыцыйная мелодыя у аўтэнтычным запісе выкон-ваецца ансамблем: скрыпка, цымбалы, гармонік, бубен | Знаёмства з мелодыяй традыцыйнага танца, фарміраванне ўмення рухацца ў адпаведнасці са зменай тэмпу; замацаванне ведаў аб гучанні і знешнім выглядзе музычных інструментаў, развіццё тэмбравага слыху |
| | Успрыманне і імітацый-ныя рухі | Танец «Таўкачыкі» (прыпеўка да танца, № 5). Тради-цыйна танец з прыпеўкамі, у танцавальнай лексіцы значная роля надаецца імітацыйным рухам «таўка-чыкам» | Знаёмства з традыцыйным танцам і прыладамі працы таўкачыкамі; развіццё музычна-рытмічнага пачуцця |
| 3 | Спевы і музіцыра-ванне | Забаўлянка «Сіўка-варонка» | Фарміраванне навыкаў выканання чыстай кварты на ксілафоне і голасам |
| | Вакальная імправізацыя | Тэкст забаўлянкі «Коў-коў, кавалёк». У тэксце два настроі, якія могуць быць адлюстраваны ў сачыненні мелодыі са зменай мажорнага ладу на мінорны | Развіццё прадуктыўнага музычнага мыслення; фарміраванне ўяўленняў аб ладзе і яго ролі ў стварэнні музычнага вобраза; развіццё ладавага пачуцця |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Каваль» | Замацаванне уменняў выразна адлюстроўваць рухавы вобраз |
| | Танцаваль-ная імправізацыя | Танец «Таўкачыкі». Танец гучыць у апрацоўцы для баяна | Развіццё музычна-рытмічнага пачуцця, уменняў выкарыстоўваць знаёмыя танцавальныя і імітацыйныя рухі ва ўласных імправізацыях |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Млынок», лічылка. Танцавальная лексіка — розныя варыянты імітацыйных рухаў | Фарміраванне ўменняў выразна адлюстроўваць рухавы вобраз |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4 | Успрыманне | Найгрыш «Пастушок», песня «Я табун сцерагу». Найгрыш на дудцы, інтанацыйна роднасны песне | Развіццё навыкаў параўнання малакантрастных твораў, эмацыянальнай спагадлівасці, тэмбравага слыху |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Таўкачыкі» (другі варыянт рухаў). Мелодыя танца гучыць у апрацоўцы. Выконваюцца разнастайныя танцавальныя рухі, «таўкачыкі» размешчаны на падлозе | Замацаванне вядомых танцавальных рухаў; развіццё дакладнасці рухаў, увагі |
| | Музіцыраванне | Танец «Шастак». Танец гучыць у апрацоўцы для баяна | Фарміраванне навыкаў ігры на шумавых музычных інструментах |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Танец «Млынок» | Замацаванне рухаў да танца |
| 5 | Спевы, музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне | Увесь вывучаны па тэме матэрыял | Замацаванне ведаў пра традыцыйныя прафесійныя заняткі, танцавальныя рухі, музычныя інструменты |

**Абсталяванне:** персанажы батлеечнага тэатра або лялькі: людзі (пастух, каваль, млынар, дзяўчына), жывёлы (сіўка-варонка); прылады працы і малюнкі (два таўкача, млын, прылады каваля); прызавыя фішкі ў выглядзе манет («шастакі»); дзіцячыя шумавыя музычныя інструменты; камплекты картак з выявамі музычных інструментаў.

**Літаратурны фальклорны матэрыял**

*Лічылка:*

Круціцеся, жорны,
З’едзен хлеб наш чорны:
Крысін і Марысін,
Грунін і Анісін,
З’едзен і Пятроў хлябок.
Намалі для іх, дзядок.

**Музычны фальклорны матэрыял**

*Аўтэнтычныя аўдыязапісы:* танец «Шастак» (скрыпка, цымбалы, гармонік, бубен) [4, № 72].

*Аўдыязапісы апрацовак фальклора:* інструментальны найгрыш на дудцы «Пастушок» [9];

*Натаваныя творы:* танцы «Шастак» [18, с. 263], «Таўкачыкі» [18, с. 258].

№ 1* [24, с. 37].

Сіўка-варонка




— Сіўка варонка,
Далі, гойда![6]
— Куды ляцела?
— К кавалю на двор.

— Нашто тая траўка?
— Кароў карміці.
— Нашто кароўкі?
— Млечка даіці.

---

[6] **Рэфрэн паўтараецца пасля кожнага радка.**

— Нашто табе каваль?

— Косы каваці.

— Нашто табе косы?

— Траўку касіці.

— А нашто млечка?

— Сырцы ляпіці.

—А нашто сырцы?

— Пастухоў карміці.

№ 2 [31, с. 58].

Рухава

Каваль



№ 3 [17, с. 149; 19, с. 146].

Я табун сцерагу




Я табун сцерагу, а ўсе людзі спяць,

Я адзін на расе абмакрэў, акалеў,

Перамёрз, адубеў. Ой!

Вы, кароўкі старыя, вы, цяляткі малыя,

Вы хадзіце па траве: не мычыце, не бадайце
Ды ў шкоду не ўпадайце. Ой!

Эх, вы коні мае, коні быстрыя,
Вы хадзіце па траве: не іржыце, не брыкайце
Ды ў шкоду не ўпадайце. Ой!

**№ 4 [31, с. 56].**

Умерана

Шастак




№ 5 [31, с. 36].

Таўкачыкі




№ 6 [24, с. 36].

— Коў-коў, кавалёк,
Падкуй сапажок.
— Я не буду каваць:
Мае ручкі баляць.

№ 7 [31, с. 58].

Жвава




Магчымая сюжэтная лінія і гульнёвыя сітуацыі

*Занятак 1* пачынаецца з сустрэчы з новым персанажам — сіўкай-варонкай. Дарослы ваконвае разам з ёю забаўлянку, пасля чаго задае дзецям пытанні аб жанры твора, прапануе згадаць вядомую ім забаўлянку з падобным спосабам выкладання тэксту («Ішоў казёл мастом»), якую пры жаданні магчыма таксама праспяваць. Пры паўторных спевах дзецям прапануецца падпяваць рэфрэн забаўлянкі.

Нарэшцэ ўсе ўдзельнікі разам з сіўкай-варонкай «апыняюцца» у каваля, які «распавядае» ім аб сваёй працы і прыладах да яе, пасля чаго жадае навучыць дзяцей свайму танцу і «скаваць касу», якая патрабуецца (па тэксту забаўлянкі). Танец выконваецца ў парах наступным чынам. Танцоры размяшчаюцца насупраць адзін аднаго, стоячы на левай назе, а правую выстаўляюць уперад з сагнутым каленам на паўпальцы, на калене далонню ўверх ляжыць правая рука, а левая сціснута ў кулак. На працягу першых чатырох тактаў левая рука танцораў з размаху апускаецца на далонь правай, нібы молат на кавадла (пажадана адстукваць рытмічны малюнак»); на пяты-шосты такты танцоры па-дэ-баскамі мяняюцца месцамі і прымаюць зыходнае становішча (крок па-дэ-баск дастаткова складаны, яго вывучэнне патрабуе дадатковага часу, таму яго з поспехам можна замяніць на іншы рух — пераменны або дробны крок); на сёмы і восьмы такты выконваецца рух, які ўзмацняе першы: удар па кавадлу робіцца ўжо не кулаком, а галавой, пры гэтым

корпус рэзка нахіляецца ўперад, да калена правай нагі, якая адначасова падымаецца да галавы; далей мелодыя і рухі паўтараюцца.

«Атрымаўшы касу» пад выкананне забаўлянкі і падпявання рэфрэну хорам, дзеці імітуюць дзеянні па тэксце забаўлянкі і разам з сіўкай-варонкай апыняюцца ў пастуха, каб накарміць яго «сырцамі». Дарослы пры «сустрэчы» з пастухом павінен звярнуць увагу дзяцей на сумны настрой пастуха і прапанаваць даведацца аб прычыне, пасля чаго ад імя персанажу спець песню «Я табун сцерагу». Пасля выказванняў дзяцей аб настроі твора, фарбах, якімі можна было б намаляваць пастушка, магчыма паспрабаваць знайсці спосабы палепшыць настрой новага сябра — кожны з дзяцей можа выказаць свае меркаванні (накарміць, даць цёплае адзенне, дапамагчы адшукаць жывёл і г. д.). Павесялелы пастух прапануе дзецям успомніць і выканаць вядомыя ім «Пастухоў найгрыш на трубе» і гульню «Воўк і авечкі».

*Занятак 2.* Спевы забаўлянкі «Сіўка-варонка» арганізуецца наступным чынам: пасля першага выканання забаўлянкі дарослым пры далейшай рабоце дарослы задае музычнае пытанне і спявае рэфрэн, а дзіця рэчытатыўна адказвае на гэтая пытанне, рэфрэн пасля якога таксама выконваецца дарослым. Выкарыстанне такой — рэчытатыўнай — манеры звязана з тым, што тэкставы рытм забаўлянкі не заўсёды супадае з рытмам першай фразы мелодыі, на якую будзе арыентавацца дзіця пры выкананні свайго тэкста і гэтая абставіна можа перашкаджаць. Але менавіта гэтая асаблівасць можа і стымуляваць дзіця да стварэння адпаведнага рытму тэксту варыянта мелодыі. У гэтай працы неабходна зыходзіць з ўласных асаблівасцяў дзіцяці, яго магчымасцяў.

Пасля замацавання зафіксаванага ў творы тэксту прапануецца стварыць свае варыянты, якія могуць змяняць тэкст арыгінала як у дэталах (напрыклад, замяніць «сырцы ляпіці» на «смятанку зрабіці» або

«пастухоў карміці» на «дзетак карміці» і г. д.), так і больш значна (напрыклад, змяніць «косы каваці» на «каня падкаваці», або «чобаты падкаваці» і г. д.). Вядома, выконваецца гэтае заданне пасля дадатковага паведамлення дарослым аб сутнасці магчымых зменаў і пры актыўнай яго дапамозе.

Далей арганізуецца паўтарэнне танца «Каваль», пры гэтым можна кожнаму танцору «выбраць», што ён будзе «каваць» і дзе гэтая рэч можа спатрэбіцца.

Пасля выканання танца дарослы «купляе» у кавалёў іх вырабы, плаціць за іх прызавымі фішкамі «шастакамі» і распавядае аб назве гэтай манеты. Потым дзецям прапануецца для ўспрымання прыпеўка да традыцыйнага танца «Шастак», у тэксце якой назва гэтай манеты зафіксавана. Прыпеўка можа выконвацца ад імя персанажа «дзяўчыны». Пры паўторным выкананні дзеці імітуюць малацьбу. Далей выконваецца танец «Шастак». Дзеці ўтвараюць адзін або два кругі (адзін у адным). Яны рухаюцца пад музыку, якая гучыць паскараючыся. Калі ў танцы удзельнічаюць два кругі, то яны рухаюцца ў супрацьлеглых напрамках. Вядома, што гэты танец лепш выконваць пад ўласны акампанемент дарослага. Магчыма арганізаваць успрыманне яшчэ аднаго варыянта выканання «Шастака» — у аўтэнтычным гучанні скрыпкі, цымбал, гармоніка і бубна. Перад успрыманнем дзеці могуць быць падзелены на каманды, удзельнікі кожнай з якіх павінны з набора картак з выявамі розных музычных інструментаў выбраць тыя, якія гучаць ў аўдыязапісу. Пераможцы, якія верна адабралі карткі, узнагароджваюцца «шастакамі».

Працягваючы сюжэтную лінію дарослы паведамляе, што «наша дзяўчына» на свае «шастакі» купіла адну прыладу працы, пры гэтым дэманструецца таўкач (невялікая цыліндрычная палка даўжынёй 20—30 см, прылады накшталт таўкача і сёння выкарыстоўваюцца ў хатняй

гаспадарцы), выяўляецца яго прызначэнне. Пасля гэтага пад спевы прыпеўкі «Таўкачыкі» дарослы імітуе працу з дапамогай двух уяўляемых таўкачыкаў. Пад паўторныя спевы тое самае выконваюць і дзеці.

*Занятак 3* пачынаецца з выканання забаўлянкі «Сіўка-варонка». На гэты раз асноўны тэкст выконваецца дарослым без змен, а рэфрэн не толькі падпяваецца дзецьмі, але і можа выконвацца імі на ксілафоне ці ансамблем, ці сольна па чарзе.

Пасля выканання задання дзеці зноў «апыняюцца» у каваля, але на гэты раз прапануецца творчае заданне па меладызацыі тэксту забаўлянкі «Коў-коў, кавалёк». Пасля калектыўнай дэкламацыі тэксту, у якой абавязкова неабходна інтанацыйна і мімічна адлюстраваць змену настрою, дарослы меладызуе першыя два радкі ў мажоры, а дзіця — наступныя два радкі, імкнучыся выканаць іх з мінорным нахіленнем, у больш павольным тэмпе. Магчымы і адваротны варыянт — дзіця пачынае, дарослы працягвае.

Улічваючы тое, што Каваль вельмі стаміўся, дарослы прапануе дзецям самім падкаваць сапажок — выканаць танец «Каваль». Пасля каваль хваліць дзяцей за выкананне працы і танца, але скардзіцца на тое, што у яго скончыўся хлеб, ёсць толькі зярняты, з якіх можна хлеб зрабіць.

Каб дапамагчы кавалю, дзеці клікаюць Дзяўчыну з таўкачыкамі, каб растаўкці зерне. На гэты раз мелодыя «Таўкачыкаў» можа гучаць на інструменце ў апрацоўцы, а дзеці выконваюць не толькі імітацыйныя рухі, але і іншыя знаемыя ім танцавальныя рухі. Апісанне харэаграфіі танца ёсць у літаратуры [18, с. 258], дзе яно дастаткова разгорнута і патрабуе спецыяльнага занятку для вывучэння. Але сярод рухаў да танца ёсць такія, што могуць быць адлюстраваны дзецьмі пасля паказу дарослым: прытупы, павароты на 360˚, прыстукі таўкачамі перад сабой,

за спіной, над галавой і г. д. Пасля выканання танцавальнай імпрвізацыі дарослы паведамляе, што нягледзячы на вельмі добрую працу і танец, усё зерне немагчыма растаўкці — патрэбен млын.

Дзяці «апыняюца» у Млынара, які распавядае ім аб сваёй працы (некаторыя звесткі аб млыне можна знайсці ў казцы «Два камяні», якую трэба прачытаць дзецям у вольны час у групе) і прапануе намалоць муку самім праз танец «Млынок». У кампазіцыі могуць ўдзельнічаць пяць чалавек — чацвёра выканаўцаў злучаюць у цэнтры правыя рукі і бягуць па кругу, робячы ўзмахі правымі рукамі над галавой (імітуючы лопасці ветрака), а пад іх злучанымі рукамі ваўчком круціцца пяты танцор («жорны»). Выбраць удзельнікаў (або толькі пятага танцору) можна з дапамогай лічылкі.

*Занятак 4* можна пачаць з музычнай загадкі: «Здагадайцеся, хто з нашых сяброў прыйшоў да нас сёння першым». Найгрыш на дудцы «Пастушок» вельмі выразна падказвае вобраз, які потым дапаўняецца ўспрыманнем ужо знаёмай песні «Я табун сцерагу», знаходзяцца агульныя рысы твораў.

Каб пастух, які «перамёрз, адубеў», меў магчымасць абагрэцца, дарослы прапануе патанцаваць і паскакаць яму разам з дзецьмі. Пад гучанне «Таўкачыкаў» у апрацоўцы выконваецца новы варыянт рухаў. На падлозе размяшчаюцца дзве лучыны або кіі («вялікія таўкачы») крыж-накрыж. Танец выконваецца сольна наступным чынам: не кранаючы лучын, танцор  робіць розныя рухі (імправізацыйна або па дамоўленасці) у правым ніжнім вугле, потым пераскоквае ў левы верхні, пасля ў левы ніжні, затым у правы верхні, і зноў у тым жа парадку:



Пасля гэтага дарослы просіць дзяцей згадаць яшчэ танцы, аб якіх яны даведаліся на занятках. Танец «Шастак» інструментуецца з дапамогай шумавых інструментаў (абавязкова адстукваецца метрычная аснова, некаторыя дзеці выконваюць рытмічны малюнак). Напрыканцы занятку выконваецца танец «Млынок».

*Занятак 5* прысвячаецца паўтарэнню і замацаванню матэрыялу; гэта можна арганізаваць праз серыю «загадак»: гучыць танцавальная мелодыя, дзеці павінны здагадацца, які да іх зайшоў персанаж, выканаць яго заданні.

## Тэма «Беларускія музычныя інструменты»

| № | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці; абсталяванне | Задача выкарыстання фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| 1 | Успрыманне | Песня «Зайграй жа мне, дударочку» | Асэнсаванне магчымасцей гукаперайманняў голасам інструментальнага гучання |
| | Успрыманне | Інструментальны твор «Сола на дудзе», малюнак | Знаёмства з дудой |
| | Спевы або падпяванне | Песня «Зайграй жа мне, дударочку» | Фарміраванне навыкаў чыстага інтанавання ў межах кварты; развіццё музычна-рытмічнага пачуцця ў працэсе мадэліравання рытмічнага малюнка прыпева |
| | Успрыманне і падпяванне, рухі | Мелодыя танца «Мікіта» (аўтэнтычны запіс у выкананні дудкі і апрацоўка ў выкананні сімфанічнага аркестру) | Знаёмства з новым традыцыйным танцам; замацаванне ўяўленняў аб інструментах; развіццё дакладнасці рухаў |
| | Музіцыраванне і падпяванне | Урыўкі танцавальных мелодый «Мікіта» і «Юрачка», ксілафон | Фарміраванне навыкаў выканання голасам і на ксілафоне мажорнага трохгучча і інтэрвала вялікай сэксты; замацаванне інтанацыйных сімвалаў танцавальных мелодый |
| 2 | Спевы і музіцыраванне | Песня «Зайграй жа мне, дударочку», фартэпіяна | Развіццё гукавысотнага слыху; замацаванне ўяўленняў аб гучанні інтэрвала чыстай квінты падчас стварэння «акампанемента» на фартэпіяна |
| | Успрыманне, спевы, музіцыраванне | Найгрыш «Лявоніха» (аўтэнтычны запіс); выконваецца на скрыпцы, ксілафон. | Фарміраванне навыкаў выканання голасам і на ксілафоне мажорнага трохгучча і пункцірнага рытмічнага малюнка; замацаванне інтанацыйнага сімвала танцавальнай мелодыі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Музычна-рытмічныя рухі | «Лявоніха» у выкананні цымбал і баяна | Замацаванне рухаў да танца «Лявоніха», замацаванне ведаў аб цымбалах і баяне, развіццё тэмбравага слыху |
| | Успрыманне, музіцыраванне, музычна-рытмічныя рухі | «Крыжачок» (аўтэнтычны запіс); выконваецца на гармоніку і варыянт у аркестровым выкананні | Знаёмства з традыцыйным танцам; замацаванне ўяўленняў аб гармоніку; фарміраванне навыкаў ігры на шумавых музычных інструментах; развучванне асноўнага кроку танца «Крыжачок» |
| 3 | Музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне | Мелодыі танцаў «Мікіта», «Юрачка» | Фарміраванне навыкаў выканання на ксілафоне мажорнага трохгучча і інтэрвала вялікай сэксты; замацаванне інтанацыйных сімвалаў танцавальных мелодый і рухаў да танца «Юрачка» |
| | Успрыманне | Найгрыш «Камарыцкая» (аўтэнтычны запіс), выконваецца на парных дудках | Замацаванне ўяўленняў аб парных дудках, развіццё тэмбравага слыху |
| | Успрыманне і падпяванне | Песня «Іграў я на дудцы» | Знаёмства з новым творам; замацаванне ведаў аб дудцы, спосабе выканання на ёй |
| | Успрымане і музіцыраванне | «Лявоніха» (апрацоўка для цымбал і баяна), ксілафон | Фарміраванне навыкаў выканання на ксілафоне мажорнага трохгучча; замацаванне інтанацыйнага сімвала танцавальнай мелодыі да танца «Лявоніха» |
| | Музычна-рытмічныя рухі | «Крыжачок» у выкананні сімфанічнага аркестра. | Замацаванне асноўнага кроку танца |
| | Гульня «Крама музыкі» | Малюнкі з выявамі інструментаў: скрыпка, цымбалы, гармонік, дудка, парныя дудкі, дуда, бубен, барабан, ліра | Замацаванне ведаў аб знешнім выглядзе і назвах музычных інструментаў |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4 | Спевы або падпяванне | Песня «Іграў я на дудцы» | Развучванне мелодыі прыпеву песні; фарміраванне навыкаў выразнага выканання гукаперайманняў |
| | Успрыманне | Інструментальны найгрыш на пішчыку «Лета» (аўтэн-тычны запіс) | Знаёмства з пішчыкам; фарміраванне навыкаў параўнання падобных тэмбраў |
| | Гульнёвае заданне «Якія інст-рументы падобныя?» | Малюнкі знаёмых інструментаў | Замацаванне ведаў аб музычных інструментах; фарміраванне навыкаў класіфікацыі, параўнання |
| | Успрыманне і танца-вальная імправізацыя | «Старажытны палескі вальс» (скрыпка, цымбалы, гармонь) | Пашырэнне ўяўленняў аб танцавальных жанрах, развіццё прадуктыўнага мыслення падчас імправізацыі рухаў да вальса |
| | Успрыман-не, вакаль-ная імправі-зацыя, му-зычна-рыт-мічныя рухі | «Полька» (аўтэнтычны запіс), выконваецца на ба-лалайцы, лічылка | Знаёмства з балалайкай і спосабам выканання на ёй; замацаванне танцавальнага кроку полькі |
| 5 | Варыянт гульні «Сля-пы музыка» | Музычныя ўрыўкі знаёмых твораў у выкананні розных музычных інструментаў | Развіццё тэмбравага слыху, замацаванне ведаў аб знешнім выглядзе і назвах музычных інструментаў |
| | Спевы або падпяванне | Песня «Зайграй жа мне, дударочку» | Замацаванне твора |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне | Танец «Крыжачок» (аркестровае выкананне) | Замацаванне рухаў да танца; развіццё музычна-рытмічнага пачуцця |
| | Гульнёвае заданне «Скарбонка з танцамі» | Танцы «Юрачка», «Мікіта», «Лявоніха», «Крыжачок», «Старажытны палескі вальс», «Шастак», «Таўкачыкі» | Замацаванне ўяўленняў аб мелодыях да танцаў; развіццё музычнай памяці |
| | Спевы або падпяванне | Песня «Іграў я на дудцы» | Замацаванне твора |
| 6 | Музіцыраванне, музычна-рытмічныя рухі | Мелодыі да танцаў «Юрачка», «Мікіта», «Лявоніха», ксілафон | Замацаванне інтанацый знаёмых танцавальных мелодый і танцавальных рухаў; фарміраванне навыкаў выканання на ксілафоне |
| | Гульнёвае заданне «Загадкі для сляпого музыкі» | Малюнкі знаёмых музычных інструментаў | Замацаванне ведаў аб музычных інструментах; развіццё назіральнасці, мыслення, уменняў знаходзіць асабістыя ўласцівасці і характэрныя рысы розных інструментаў |
| | Спевы і музычна-рытмічныя рухі | Музычны матэрыял тэмы (па жаданні) | Замацаванне вывучаных твораў; развіццё памяці, рэпрадуктыўнага і прадуктыўнага музычнага мыслення |

**Абсталяванне:** персанажы батлеечнага тэатра або лялькі: людзі (Юрачка, Мікіта, Лявоніха і інш.); фотаздымкі або малюнкі з выявамі музычных інструментаў (скрыпка, цымбалы, дудка, парныя дудкі, дуда, пішчык, гармонік, балалайка, ліра); невялічкая скарбоначка для гульнёвага задання «Скарбонка з танцамі»; гукавысотныя дзіцячыя інструменты (ксілафон або металафон), шумавыя инструменты.

**Літаратурны фальклорны матэрыял**

*Лічылка:*

Цынцы-брынцы, балалайка,
Цынцы-брынцы, паіграй-ка.
Цынцы-брынцы, не хачу,
Цынцы-брынцы, спаць хачу.
Цынцы-брынцы, хто стучыць?
Цынцы-брынцы, дзевачка.
Цынцы-брынцы, як завуць?
Цынцы-брынцы, Евачка.

**Музычны фальклорны матэрыял**

*Аўтэнтычныя аўдыязапісы:* найгрыш на скрыпцы «Лявоніха» [4, № 21], найгрышы на дудцы «Юрачка» і «Мікіта» [4, № 58]; найгрыш на парных дудках «Камарыцкая» [4, № 19]; найгрыш для пішчыка «Лета» [4, № 7]; найгрыш на гармоніку «Крыжачок» [7]; найгрыш на балалайцы «Полька» [4, № 65]; «Сола на дудзе» [9];

*Аўдыязапісы апрацовак фальклорных твораў:* танцавальныя мелодыі «Лявоніха» [8] (цымбалы і баян), «Юрачка» [8] (сімфанічны аркестр); «Мікіта» [3] (сімфанічны аркестр); «Крыжачок» [6] (сімфанічны аркестр); «Старажытны палескі вальс» [5] (скрыпка, цымбалы, гармонь).

*Натаваныя творы:*

№ 1 [30, с. 32; 21, с. 9].

Умерана скора

Зайграй жа мне, дударочку




Зайграй жа мне, дударочку,
А я патанцую,
Курка мне яйка знясець,
Табе падарую.
Тум-тум, тум-та, тум-та,
Тум-та, тум-та, тум-тум.

Зайграй жа мне, дударочку,
Як сам разумееш,
Зайграй, сівы галубочку,
Тое, што ўмееш.
Тум-тум, тум-та, тум-та,
Тум-та, тум-та, тум-тум.

Як іграюць без дуды,
Ходзяць ножкі не туды,
А як дуду пачуюць,
Самі ножкі танцуюць.
Тум-тум, тум-та, тум-та,
Тум-та, тум-та, тум-тум.

№ 2 [30, с. 31; 21, с.11].

Іграў я на дудцы

Умерана



Іграў я на дудцы, ту-лю-лю!
Седзячы ў будцы, ту-лю-лю!
Ту-лю, ту-лю, ту-лю-лю, ту-лю-лю!

Грае мая дудка: ту-лю-лю!
Пяе весялушка: ту-лю-лю!
Ту-лю, ту-лю, ту-лю-лю, ту-лю-лю!

Як іграла дудука, ту-лю-лю!
Прыбег скакаць Юрка, ту-лю-лю!
Ту-лю, ту-лю, ту-лю-лю, ту-лю-лю!

А за Юркам — Янка, ту-лю-лю!
А за Янкам — Танька, ту-лю-лю!
Ту-лю, ту-лю, ту-лю-лю, ту-лю-лю!

Магчымая сюжэтная лінія і гульнёвыя сітуацыі

*Занятак 1.* Пачаць гэты цыкл заняткаў магчыма праз сувязь з пяпярэднім цыклам, у якім дзеці знаёміліся з разнастайнымі відамі працы людзей і ўвасабленнем гэтай тэмы ў фальклорных творах. На гэты раз больш увагі звяртаецца на музыкаў, якія лепш за іншых маглі спяваць, навучыцца іграць на розных інструментах. Вось з адным з такіх музыкаў дарослы і прапануе пазнаёміцца, а праслухаўшы песню пра яго, здагадацца, на якім інструменце ён іграе.

Пасля выканання дарослым песні «Зайграй жа мне, дударочку» дзеці выказваюць свае здагадкі аб інструменце. Неабходна звярнуць іх увагу на тое, што дуда, на якой іграе іх новы знаёмы, пры падобнасці назвы на вядомую дзецям дудку, знешне значна ад яе адрозніваецца. Пры разгляданні малюнка або фота падкрэсліваюцца наяўнасць скуранога меха, які запаўняецца паветрам, і дэталі, якія нагадваюць ужо

знаёмыя дзецям дудкі. Пасля гэтага «дударочку» згаджаецца зайграць на сваім інструменце — гучыць «Сола на дудзе». Далей зноў можна звярнуцца да песні, прапанаваўшы дзецям патанцаваць падчас прыпеву і падпяваць так, як гучыць дуда. На склады «тум-тум», якім адпавядаюць больш доўгія гукі (чвэрці), дзеці могуць выконваць невялікі падскок на дзвух нагах, на склады «тум-та, тум-та», якія адпавядаюць кароткім гукам, — на адной назе.

У мэтах параўнання гучання дуды і дудкі магчыма выкарыстаць наступны паварот сюжэту: пасля паведамлення аб тым, што музыка можа іграць не толькі на дудзе, але, вядома, і на дудцы, а танцавальны найгрыш, які ён вельмі любіць, можа нават і падказаць імя музыкі. Пасля ўспрымання найгрыша «Мікіта» на дудцы, у выпадку, калі дзецям ён не знаёмы, дарослы павінен назваць імя музыкі, а пры паўторным успрыманні падпець яго — спачатку адзін, а потым разам з дзецьмі:




Што датычыцца харэаграфічнага боку гэтага танца, то ён мае мноства варыянтаў, нярэдка з трукавымі, акрабатычнымі элементамі, больш нагадваючы гульню або спаборніцтва. Напрыклад, існаваў такі варыянт: некалькі чалавек (дзве дзяўчыны і два хлопца) танцавалі па розныя бакі ад палкі (часцей качаргі), якая ляжала на падлозе, і адначасова (па дамоўленасці, у адпаведнасці з музыкай) пераскоквалі цераз яе, стараючыся не зачапіць. У другім варыянце на падлогу паралельна адна адной клаліся тры палкі ў выглядзе лесвіцы і рухам па-дэ-баск танцоры пераскоквалі цераз іх. Яшчэ адзін варыянт выконваўся як пераскокі танцораў праз палку, што клалася на сагнутыя ступні выцягнутай нагі дзвух удзельнікаў танца і магла быць паднята імі

вышэй або ніжэй. Любы з гэтых варыянтаў пры жаданні можа быць прапанаваны дзецям.

Пасля выканання рухаў дарослы здзіўлена паведамляе, што Мікіта некуды знік і неабходна яго паклікаць. Для гэтага выкарыстоўваецца ксілафон, на якім дарослы выконвае адзін (прыведзены вышэй) або двойчы паўтораны такт мелодыі «Мікіты», а дзеці падпяваюць. Пасля гэтага жадаючыя дзеці з дапамогай дарослага могуць самастойна паклікаць Мікіту, прайграўшы яго імя на ксілафоне. Нарэшцэ з’яўляецца Мікіта, але ён прыводзіць з сабою сябра, імя якога таксама неабходна пазнаць па музычным урыўку (гучыць знаёмая мелодыя «Юрачка»), пад які дарослы, як і ў танцы «Мікіта», падпявае разам з дзецьмі:




Пры пэўнай падрыхтаванасці дзяцей, наяўнасці жадання і часу магчыма ўжо на гэтым занятку паспрабаваць выканаць на ксілафоне і гэты ўрывачак.

*Занятак 2.* Напачатку дарослы прапануе выканаць разам песню «Зайграй жа мне, дударочку», каб сябры-музыкі пачулі і зайшлі ў госці. На гэты раз песня выконваецца пад гучанне фартэпіяна, а жадаючыя дзеці па чарзе (на куплет або прыпеў) становяцца «музыкамі», мэта якіх — адлюстраваць на фартэпіяна гучанне «дуды». Для гэтага дзіця павінна ў ніжнім рэгістры выконваць інтэрвал чыстай квінты ў гарманічным выкладанні (напрыклад, до-соль), які можа гучаць толькі на першую долю такта, або і на першую, і на другую.

Пасля гэтага добра будзе выканаць заданне, у якім дзеці з дапамогай ігры на ксілафоне «клікаюць» сваіх сяброў-музыкаў — Мікіту і Юрачку (аналагічна таму, як на першым занятку). Пасля

з’яўлення музыкаў «раптам» гучыць яшчэ адна танцавальня мелодыя, знаёмая дзецям па папярэдніх тэмах, — «Лявоніха». Пасля таго як будзе ўзгадана назва танца, з’яўляецца і сама Лявоніха, але яна трошкі пакрыўдзілася, бо яе не паклікалі. Каб суцешыць яе, неабходна з дапамогай ксілафона і ўласнага падпявання яе паклікаць. Выкарыстоўваецца наступная папеўка:




Пры яе выкананні пажадана звярнуць увагу на роднаснасць інтанацыі «Лявоніхі» з інтанацыяй «Юрачкі» (магчыма, персанажы Лявоніхі і Юрачкі таксама родныя паміж сабой). Далей пад гучанне «Лявоніхі» у апрацоўцы можна паўтарыць асноўны танцавальны крок або паімправізаваць рухі пад гэтую мелодыю. Неабходна яшчэ раз звярнуць увагу на інструменты, на якіх выконваецца мелодыя (цымбалы і баян).

Наступны танец, з якім можна пазнаёміць дзяцей — «Крыжачок», — першапачаткова можа прагучаць на гармоніку (гучанне яго можна параўнаць з гучаннем баяна). Далей пад аркестровае выкананне мелодыі можна арганізаваць шумавы аркестр. Пераходзячы да музычна-рытмічных рухаў, неабходна паведаміць дзецям, што танец мае назву «Крыжачок» дзякуючы таму, што яго рухі пабудаваны на малюнку крыжа. Гэта могуць быць складзеныя танцуючымі парамі накрыж рукі, утварэнне крыжа з чатырох пар, якія рухаюцца па кругу, і інш. Існуе (у сцэнічным варыянце) і асноўны крок «Крыжачка», які выконваецца наступным чынам: зыходнае становішча — шостая пазіцыя ног; на такт — падскочыць на паўпальцах левай нагі з прасоўваннем наперад, а правую нагу падняць, сагнуўшы ў калене пад прамым вуглом; на «раз» — рэзка пераступіць на паўпальцы правай нагі, а левую злёгку

прыўзняць над падлогай; на «і» — спружынны крок наперад на паўпальцы левай нагі; на «два» — спружынны крок наперад на паўпальцы правай нагі; на «і» — падскочыць на паўпальцах правай нагі з прасоўваннем наперад, а левую нагу падняць, сагнуўшы ў калене пад прамым вуглом; на другі такт увесь рух паўтараецца з другой нагі.

*Занятак 3* можна пачаць з выканання ўжо знаёмых заданняў па выкананні імёнаў на ксілафоне і іх прапяванні, паўтарэння крока да танца «Юрачка» або танцавальных імправізацый на мелодыю «Мікіты». З'яўленне яшчэ аднаго музыкі звязана з гучаннем парных дудак, якія ўжо вядомы дзецям. Новы музыка жадае выканаць для дзяцей песню «Іграў я на дудцы», падчас выканання пад прыпеў дзеці імітуюць выкананне на дудцы, пры паўторы — падпяваюць гукаперайманні ў прыпеве. Цікавым будзе зварот да песні «Зайграй жа мне, дударочку» у мэтах параўнання гукапераймання дуды і дудкі.

Наступны персанаж — Лявоніха — з'яўляецца пасля таго, як яе паклікалі (прапелі і адыгралі яе імя), і ўсе музыкі вырашылі вучыцца разам з дзецьмі танцу «Крыжачок». Кожная пара (або дзіця) выбірае героя і разам з ім выконвае крок танца.

Гульня «Крама музыкі» можа быць праведзена па наступных правілах. Дзіця, што выконвае ролю гандляра-музыкі, называе любы з музычных інструментаў на картках, якія пакладзены малюнкам уверх, а «пакупнікі» па чарзе адшукваюць патрэбны інструмент. У іншым варыянце «пакупнікі» самі па чарзе называюць інструмент, а «музыка» павінен іх адшукаць і падаць «пакупніку». У трэцім варыянце правілаў можа дзейнічаць хітры «гандляр-музыка», які, каб астатнія не бачылі, хавае «інструмент» за спіну, а «пакупнік», які першы здагадаўся і назваў гэты інструмент, становіцца на яго месца.

*Занятак 4* можна пачаць з падпявання дзецьмі прыпеву песні «Іграў я на дудцы», якое можа суправаджацца імітацыйнымі,

гульнёвымі, танцавальнымі рухамі. Увогуле у гэтым цыкле заняткаў не ставіцца мэта развучыць дзве прыведзеныя песен, яны з’яўляюцца свайго рода матэрыялам, які ілюструе асноўны змест тэмы. Таму падпяванне прыпеву, разнастайныя гульнёвыя і танцавальныя рухі будуць асноўнымі відамі дзейнасці пры знаёмстве з песенным рэпертуарам тэмы.

Музыка распавядае дзецям, што дудкі бываюць самыя розныя і па памерах, і па выкарыстаным для іх стварэння матэрыялу. Ён прапануе паслухаць, як гучыць інструмент, калі ён зроблены з чароціны або саломіны (гучыць найгрыш на пішчыку). Пасля ўспрымання пажадана, каб дзеці выказалі свае меркаванні аб настроі твора і абавязкова звязалі назву інструмента з тэмбравай афарбоўкай гучання.

Паколькі дзеці ўжо даведаліся пра некалькі духавых народных інструментаў, гульнёвае заданне «Якія інструменты падобныя?» дапаможа ім асэнсаваць адзінасць способу гукавылучання ў іх. Сярод раскладзеных малюнкаў з выявамі музычных інструментаў гульцам патрэбна знайсці тыя, які з’яўляюцца «роднымі». Неабавязкова толькі вылучыць паслядоўнасць «пішчык — дудка — парныя дудкі — дуда». Агульныя рысы могуць быць знойдзены паміж скрыпкай, цымбаламі і лірай, паміж бубнам і барабанам і г. д.

Пасля выканання гэтага задання падчас гучання «Старажытнага палескага вальса» можна прапанаваць дзецям вылучыць інструменты, якія гучалі ў ім. Заданне можна выконваць і па камандах, калі ёсць некалькі камплектаў картак з інструментамі. Пры далейшым гучанні можна прапанаваць дзецям стварыць уласныя рухі пад музыку вальса, у якіх, вядома, неабходна адлюстраваць характэрныя асаблівасці жанру. Гэта заданне будзе карысным, зыходзячы з таго факта, што вальс — даволі рэдкі жанр і з'явіўся толькі ў познетрадыцыйным фальклоры; у дадзеным музычным матэрыяле ён прадстаўлены толькі аднойчы.

Знаёмства з новым інструментам — балалайкай (якая ўвогуле з’яўляецца рускім народным інструментам, але дастаткова распаўсюджана ў познетрадыцыйнай музыцы беларусаў) можна пачаць з дэкламацыі лічылкі і дэманстрацыі малюнка. Гучанне балалайкі ва ўзоры жанра «полька» можна суправаджаць імітацыйнымі рухамі, а пры паўторным успрыманні — жанрава-характэрнымі танцавальнымі рухамі. Пры выкананні вакальнай імправізацыі на першае дзвухрадкоўе лічылкі дарослы можа прапанаваць спачатку свой узор. Пажадана, каб гэтая імправізацыя нагадвала гучанне балалайкі. Напрыклад, гэта можа быць імправізацыя на дзвух гуках у інтэравале вялікай секунды:




*На занятках 5 і 6* замацоўваюцца ўяўленні дзяцей аб беларускіх музычных інструментах, танцах і музычна-рытмічных рухаў да іх. Варыянт гульні «Сляпы музыка» можа быць арганізаваны наступным чынам. Пад гучанне музычнага фрагмента, у якім інструмент выконвае мелодыю сольна, удзельнік гульні (гэта можа быць і дарослы), што выконве ролю сляпога музыкі (яго вочы завязаны або заплюшчаны), павінен дакрануцца да каго-небудь з гульцоў, якія падчас гучання выконваюць танцавальныя рухі па жаданні. Той, да каго дакрануліся, павінен назваць музычны інструмент, які гучыць ва ўрыўку. Калі дзіця не назвала інструмент, яно выбывае з гульні. Так працягваецца, пакуль не прагучаць усе ўрыўкі.

Аналагічна выконваецца і гульнёвае заданне «Скарбонка з танцамі». Пад гучанне знаёмага танца дзеці павінны пачаць выконваць адпаведныя танцу рухі, або проста назваць танец. Пасля гэтага танцавальныя рухі выконваюцца калектыўна. У арганізацыі гульнёвай сітуацыі можа удзельнічаць любы са «знаёмых музыкаў», або ўсе яны

па чарзе могуць «адкрываць скарбонку» і прапаноўваць пэўны танец. Найбольш актыўныя ўдзельнікі атрымліваюць права да апошняга музычнага твора танцаваць з музыкай.

Апісанне гульнёвага задання «Загадкі для сляпога музыкі» занятку 6  прыведзена ў тэме «Кірмаш» (занятак 4), астатнія заданні заняткаў 5 і 6 вядомы па папярэдніх занятках тэмы.

## Тэма «Веснавы фальклор»

| № занятку | Від дзіцячай дзейнасці | Фальклорны матэрыял, яго асаблівасці; абсталяванне | Задача выкарыстання Фальклорнага матэрыялу |
|---|---|---|---|
| 1 | Успрыманне і спевы | Песня «Ідзі, зіма, да Кракава» (№ 1), фланэлеграф. Ва ўзоры выкарыстоўваецца кантрастна-рэгістравы тып інтанавання | Пашырэнне ўяўленняў аб спецыфічным спосабу інтанавання, усведамленне яго эмацыянальнай выразнасці |
| | Вакальная імправізацыя | Тэкст № 1 | Развіццё прадуктыўнага музычнага мыслення; узбагачэнне слоўніка |
| | Успрыманне і падпяванне, музіцыраванне | Песня «Дазвольце, людзі», металафон. Твор вытрыманы ў квінтовым ладзе, прысутнічае характэрная для веснавога фальклору інтанацыя «загукання» («У!»), рытмічная асаблівасць — распевы гукаў | Развіццё ладавага пачуцця ў межах квінтовага ладу; усведамленне асаблівасцяў ваканання веснавых песень, іх адметных рыс |
| | Спевы, музычна-рытмічныя рухі | Песня «Дазвольце, людзі», тэкст № 2 (літ.). Спевы дапаўняюцца выкананнем характэрнага для веснавога фальклора харадовам — «танком» | Развіццё навыкаў руху ў адпаведнасці з настроем твора, знаёмства з традыцыйнай кампазіцыяй крывога танка |
| 2 | Спевы і вакальная імправізацыя | Песня «Ідзі, зіма, да Кракава», уласныя тэксты. Імправізацыя інтанацыйна можа набліжацца да развучанага твора | Развіццё прадуктыўнага музычнага мыслення, творчых здольнасцяў ў працэсе стварэння ўласных тэкстаў |
| | Спевы, музычна-рытмічныя рухі | Песня «Дазвольце, людзі» | Развіццё ладавага пачуцця ў межах квінтовага ладу, дакладнасці рухаў |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Успрыманне і падпяванне | Песня «Жавароначкі, прыляціце!». У творы выкарыстоўваюцца характэрныя для веснавых песен пентатанічныя абароты, рытмічнай складанасцю з’яўляецца пераменны памер і распевы | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага і музычна-рытмічнага пачуцця |
| | Успрыманне і падпяванне | Заклічка «Свяці, свяці, сонейка!». Заклічка пабудавана ў ладзе з ніжняй тонікай, ладавай рамкай з’яўляецца інтэрвал малай сэксты | Знаёмства з жанрам заклічкі, яе былым функцыянальным прызначэннем (магічным); фарміраванне навыкаў інтанавання гукаў у дыяпазоне малай сэксты |
| 3 | Спевы і музіцыраванне | Заклічка «Свяці, свяці, сонейка!», фланэлеграф, металафон | Развіццё гукавысотнага слыху, навыкаў інтанавання гукаў у дыяпазоне малай сэксты, навыкаў выканання яго на металафоне |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Заклічка «Свяці, свяці, сонейка!». Падчас спеваў выконваюцца хараводныя рухі з элементамі вобразнасці | Развіццё вакальных навыкаў, усведамленне інтанацыйнай лініі твора падчас выканання рухаў з элементамі вобразнасці |
| | Спевы | Песня «Жавароначкі, прыляціце!» | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага і музычна-рытмічнага пачуцця |
| | Музычна-рытмічныя рухі | Песня «Дазвольце, людзі». Можа выконвацца імправізаваны варыянт крывога танка | Развіццё ладавага пачуцця ў межах пентатанічнага ладу, прадуктыўнага музычнага мыслення |
| 4 | Спевы | Песня «Жавароначкі, прыляціце!» | Развіццё эмацыянальнай спагадлівасці, ладавага і музычна-рытмічнага пачуцця |
| | Спевы, музычна-рытмічныя рухі, музіцыраванне | Заклічка «Свяці, свяці, сонейка!», металафон | Развіццё вакальных навыкаў, усведамленне інтанацыйнай лініі твора падчас выконвання рухаў з элементамі вобразнасці, навыкаў выканання на металафоне |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Успрыманне | Заклічка «Ідзі, ідзі, дожджыку!». Можа разглядацца як тэкставы варянт папярэдняй заклічкі | Пашырэнне ўяўленняў аб варыянтнасці фальклору |
| | Музіцыра-ванне («Песенка дожджыка») | Бубен, металафон, трохвугольнік. Выкананне на музычных інструментах рытмічных малюнкаў (№ 5) | Развіццё музычна-рытмічнага пачуцця, фарміраванне навыкаў ігры на музычных інструментах |
| | Спевы, музычна-рытмічныя рухі | Песня «Дазвольце, людзі». Спевы дапаўняюцца выкананнем аднаго з танкоў | Развіццё ладавага пачуцця; фарміраванне навыкаў выразнага выканання рухаў |
| 5 | Спевы, музычна-рытмічныя рухі, музіцыра-ванне | Увесь музычны матэрыял тэмы | Замацаванне ўяўленняў аб асаблівасцях веснавога фальклору; развіццё музычных і творчых здольнасцей |

**Абсталяванне:** персанажы батлеечнага тэатра або лялькі: людзі, птушкі і інш., дзіцячыя музычныя інструменты: металафоны, бубен, трохвугольнік, званочак; фланэлеграф з адпаведным матэрыялам: «сумёты» рознай велічыні, «сонейка» і яго «праменьчыкі».

**Літаратурны фальклорны матэрыял**

*Тэксты*:

№ 1

Згары, зіма, ты нядобрай была!
Адыдзі, зіма, ты мокрай была!
Згінь, зіма, ты нямой была!
Пусці вясну на зямлю маю!

№ 2

Прыйдзі, прыйдзі, вясна,
Прыйдзі, прыйдзі, красна,
Да нас у таночак,
Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб нам звіць вяночак.

**Музычны фальклорны матэрыял**

№ 1 [22, с. 355].

Ідзі, зіма




Ідзі, зіма, да Кракава,
Зноў ты прыйдзеш аднакава.
Ідзі, зіма да Кіева,
Ты нам лета пакінула.
Ідзі, зіма, да крыніцы,
Ды забірай рукавіцы!

№ 2* [19, с. 142, 156].

Умерана Дазвольце, людзі




№ 3 [19, с. 118; 17, с. 34].

Жаваронaчкі, прыляціце




Жаваронaчкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,
Бо зімачка надаела,
Нам хлебушак пераела.

Жаваронaчкі, прыляціце,
Зямлю-матушку абудзіце
І дожджыкам напаіце,
Каб травачкі парасцілі,
Каб волікаў накармілі.

Жаваронaчкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,
Бо зімачка надаела,
Нам хлебушак пераела.

№ 4* [21, с. 14].




№ 5 [22, с. 361].

**Ідзі, ідзі, дожджыку,**

Звару табе боршчыку.

Ай, люлі, люлі,

Люленькі, люлі.

Пастаўлю пад елкаю,

Накрыю талеркаю.

Ай, люлі, люлі,

Люленькі, люлі.

Сама пакаштую,

Цябе пачастую.

Ай, люлі, люлі,

Люленькі, люлі.

№ 6.







Магчымая сюжэтная лінія і гульнёвыя сітуацыі

*Занятак 1.* Пачаць знаёмства з веснавым фальклорам магчыма праз стварэнне гульнёвай сітуацыі вакол выканання даволі спецыфічнага ў музычных адносінах твора «Ідзі, зіма, да Кракава». Напачатку дарослы, карыстаючыся адной з лялек (па выбары) і

фланэлеграфам, на якім размешчаны «сумёты», вядзе размову аб прыкметах надыходзячай вясны, распавядае, што знаёмыя дзецям жыхары вёскі вельмі чакаюць яе надыхода. Але зіма звычайна ніяк не жадае адыходзіць, таму, каб паскорыць надыход вясны і прагнаць зіму, спяваюцца спецыяльныя песні — вяснянкі. Пасля гэтага дарослы спявае твор, імкнучыся асабліва выразна выканаць апошнія гукі кожнай фразы, якія, аб’ядноўваючы інтанацыі замовы і прычыту, адлюстроўваюць асаблівы эмацыянальны накал, моцнае жаданне пазбавіцца ад дакучлівай зімы. Пасля першага выканання дарослы паведамляе, што першы вялікі «сумёт» ужо «растапіўся» (здымае яго з фланэлеграфа). Пры далейшым выкананні твора ад імя іншых (дзвух або трох) жыхароў вёскі, якім дзеці могуць падпяваць, «растаюць» яшчэ некалькі «сумётаў».

Каб «растапіць увесь снег», дарослы заахвочвае дзяцей да выканання ўласных вакальных імправізацый, назначэнне якіх — адагнаць зіму. Для гэтага першапачаткова можна выкарыстоўваць прыведзены вышэй тэкст № 1: «Згары, зіма, ты нядобрай была! Адыдзі, зіма, ты мокрай была! Згінь, зіма, ты нямой была! Пусці вясну на зямлю маю!» У гэтым выпадку кожны з дзяцей можа меладызаваць тую або іншую фразу. Пры ўзнікненні цяжкасцей у выкананні задання дарослы можа прапанаваць уласны меладычны варыянт на гэты тэкст (пажадана, каб ён інтанацыйна нагадваў твор «Ідзі, зіма, да Кракава»), а дзеці па чарзе могуць паўтарыць яго з невялічкімі меладычнымі змяненнямі. Кожнае выкананне дзяцей павінна «растапляць» адзін з «сумётаў» на фланэлеграфе.

Тэму загукання вясны працягвае песня «Дазвольце, людзі», якую першапачаткова дарослы выконвае ад імя аднаго з жыхароў вёскі. Пасля ўспрымання твора неабходна звярнуць увагу дзяцей на характэрную гукальную інтанацыю на гук «У!» у канцы твора і растлумачыць яго

наяўнасць не толькі функцыянальным прызначэннем — патрэбнасцю гукаць, клікаць вясну, але і ўмовамі выканання такіх твораў у фальклорнай традыцыі. Звычайна падобныя вяснянкі спявалі на адкрытых месцах, на прасторы, пераклікаючыся з іншай групай спевакоў (антыфонныя спевы), або ў лесе, каб пачуць рэха ад «загуканняў». Падчас наступнага выканання песні дарослым дзецям прапануецца выканаць толькі гукальны гук «У», а потым, пасля падзелу групы дзяцей на 2—3 падгрупы, размешчаныя у розных месцах залы («розныя вёскі»), яшчэ некалькі разоў выканаць твор, звяртаючыся да дзяцей розных падгруп, якія па чарзе выконваюць «гуканне».

Гэты твор дастаткова складаны ў рытмічных адносінах, таму яго развучванне павінна папярэджвацца шматразовым успрыманнем, арганізаваным пры дапамозе іншых відаў дзіцячай музычнай дзейнасці. Адной з такіх магчымасцей можа стаць выкананне падчас спеваў дарослага жадаючымі дзецьмі на металафонах гука *мі* першай актавы. Пры гэтым выканаўцы могуць не абмяжоўваць сябе пэўным рытмічным малюнкам — меладычная будова твора дазваляе выконваць гэты своеасаблівы акампанемент ці на кожны гук, ці ствараючы рытмічны малюнак па жаданню. У любым выпадку выконваемы на металафоне гук будзе ўтвараць кансананс з гукам, які выконваецца голасам (будзе гучаць малая тэрцыя, чыстая кварта або чыстая квінта).

Другая магчымасць для ўспрымання твора і яго развучвання можа быць звязана з музычна-рытмічнымі рухамі. Падчас выканання песні дарослым і падпявання дзецьмі дашкольнікаў можна знаёміць з традыцыйным карагодным малюнкам крывога танка (крывога танца). Спачатку пажадана прапанаваць дзецям паслухаць прыведзены вышэй тэкст № 2, у якім згадваецца запрашэнне вясны «да нас у таночак» і праз аналіз тэксту раскрыць сэнс слоў «таночак, танок». Крывыя танкі вядомы з глыбокай старажытнасці, выконваліся яны звычайна вясной

пад суправаджэнне розных песень (часцей шлюбнай тэматыкі), але ў аснове яго кампазіцыйнага малюнка заўсёды ляжалі крывыя, асіметрычныя фігуры. Магчыма выкарыстаць, напрыклад, такі варыянт малюнка крывога танка:



Тры дзяўчынкі становяцца на некаторай адлегласці адна ад другой і ствараюць як бы вяршыні трохвугольніка; астатнія ўдзельнікі карагода бяруцца за рукі, складаюць ланцужок і абыходзяць кругом дзвух дзяўчынак, якія знаходзяцца ў аснове трохвугольніка, агібаюць кожны раз з іншага боку (не абыходзячы кругом) дзяўчыну, якая стаіць у вяршыні ўяўнага трохвугольніка.

Вадзіць такі танок можна да той пары, пакуль як мага болей дзяўчынак не пабудуць у яго сярэдзіне. Падчас ваджэння дзеці разам з дарослым выконваюць песню «Дазвольце, людзі».

*Занятак 2.* Напачатку можна згадаць разам з дзецьмі, якім чынам праганялі зіму з дапамогай песні, выканаць твор «Ідзі, зіма, да Кракава» і імправізацыі, выкарыстоўваючы тыя ж гульнёвыя прыёмы, што на папярэднім занятку. Пасля гэтага пажадана прапанаваць дзецям стварыць уласныя тэксты з апорай на пэўную структуру сказа: «…, зіма, ты … была!», у якіх адлюстроўюцца розныя характарыстыкі зімы: злая, халодная, галодная, лютая і інш.

Як і на першым занятку, тэму гукання вясны можа працягваць выкананне (па падгрупах, з салістамі) песні «Дазвольце, людзі», якое суправаджаецца ваджэннем танка.

Наступная вясновая песня — «Жаваронaчкі, прыляціце» — шырокавядомы ўзор і пажадана, каб яго дзеці развучылі цалкам. Разгорнуты тэкст песні адлюстроўвае зразумелыя дашкольнікам

вобразы і пажаданні. Каб палегчыць засваенне меладычнай лініі твора, можна выкарыстаць рухавае мадэліраванне з дапамогай перакрыжаваных рук, імітуючых рухі птушыных крылаў. У час падпявання дзецьмі першых дзвух радкоў куплета, якія будуюцца на чатырох гуках featureнай вышыні, на ўмоўнай вертыкалі можна вылучыць своеасаблівыя кропкі (яны адпавядаюць вышыні гукаў), дзе птушкі «спыняюцца» падчас лёту. Мелодыя наступных трох радкоў будуецца на вельмі распаўсюджаных у беларускім фальклоры тэрцова-квартовых інтанацыях, якія пры сістэматычнай працы з фальклорам могуць быць «на слуху» і не выклікаць асаблівых цяжкасцей у інтанаванні дзецьмі. На гэтым занятку можна абмежавацца толькі падпяваннем дзецьмі дзвух першых радкоў куплетаў.

Матывы заклікання вясны, запрашэння прыроды да абуджэння могуць быць працягнуты пры знаёмстве з заклічкамі. Трэба данесці да свядомасці дзяцей, што нашыя продкі лічылі, што да прыроды можна звярнуцца як да жывой істоты, запрасіць яе «да супрацоўніцтва». Перайсці на ўспрыманне заклічкі «Свяці, свяці, сонейка» можна праз стварэнне гульнёвай сітуацыі, аналагічнай «растапленню сумётаў» (*гл.* вышэй) з дапамогай фланэлеграфа. На гэты раз на фланэлеграфе размяшчаецца «сонейка», «праменьчыкі» якога дадаюцца да яго па аднаму ў залежнасці ад колькасці і якасці выканання заклічкі. Пасля першага ўспрымання заклічкі ў выкананні дарослага дзецям прапануецца дапамагчы заклікаць сонейка, падпяваючы толькі другую частку заклічкі на тэкст «Ай, люлі, люлі, люленькі, люлі».

*Занятак 3.* Далейшае развучванне заклічкі «Свяці, свяці, сонейка» пажадана дапоўніць музіцыраваннем. Гэта можа быць сваеасаблівы інструментальны рэфрэн на металафоне пасля кожнага вакальнага выканання чатырохрадкоўя. Выконваюцца на металафоне толькі два розныя па вышыні гукі, якія ўтвараюць ладавую рамку твора (*до* другой

актавы і *рэ* першай актавы). Тут магчымы розныя варыянты рытмічнага малюнка, але найбольш простым можа быць наступны рэфрэн:

Замацаванне заклічкі магчыма арганізаваць праз стварэнне



імправізаванага карагода, у якім дзеці, узяўшыся за рукі, павольна рухаюцца па кругу і адлюстроўваюць у рухах злучанымі рукамі напрамак мелодыі падчас спявання, утвараючы «сонейка» (само кола) і яго «праменьчыкі» (злучаныя папарна рукі). Для большай выяўленчасці карагода дзеці могуць стаяць спіной да цэнтра кола — тады «праменчыкі»-рукі апынуцца звонку карагода.

Пасля спеваў песні «Жавароначкі, прыляціце» можна зноў звярнуцца да карогодных рухаў. Замацоўваючы мелодыю песні «Дазвольце, людзі», можна стварыць уласны варыянт крывога танка, ствараючы незвычайныя графічныя малюнкі.

*Занятак 4* можа быць галоўным чынам прысвечаны далейшаму развучванню і замацаванню твораў, з якімі дзеці пазнаёміліся на папярэдніх занятках тэмы. Пры гэтым спевы і падпяванне суправаджаюцца рухамі і музіцыраваннем. Каб пашырыць ўяўленні аб жанры заклічкі, можна прапанаваць для азнаямлення варыянт тэксту заклічкі «Ідзі, ідзі, дожджыку». Яна выконвацца на мелодыю заклічкі «Свяці, свяці, сонейка», што дазволіць яшчэ раз замацаваць мелодыю твора, асэнсаваць варыянтнасць фальклорных твораў.

Паколькі веснавы фальклор вельмі лірычны па змесце і не дае шырокіх магчымасцей для актыўных музычна-рытмічных рухаў і аркестроўкі, каб надаць разнастайнасць прапануемым заданням у гэтай тэме, цікавым момантам можа быць выкананне дзецьмі практыкавання «Песенка дожджыка» — інструментальнае і вакальнае гукаперайманне,

якое стварае своеасаблівы аркестр. Могуць выкарыстоўвацца як тры прыведзеныя вышэй рытмічных малюнкі (№ 6), так і два, або чатыры. Пры агучванні трох рытмічных партый дарослы з дапамогай званочка адлюстроўвае малюнак «ка-пель-кі», большасць дзяцей выконваюць на металафонах або трохвугольніках малюнак «кап-лі», двое-трое дзяцей з дапамогай бубнаў — малюнак «кап». Пры стварэнні чацвёртага рытмічнага малюнка можа быць выкарыстаны барабан або бразготка (гэты малюнак будзе складацца з палавінных або цэлых гукаў, можа прагучаць такі інструмент і аднаразова — у залежнасці ад жадання выканаўцы) і адпаведны гучанню навальніцы склад «бах». Паслядоўнасць уступу розных рытмічных партый абумоўліваецца жаданнем выканаўцаў у залежнасці ад таго, які дождж яны жадаюць уявіць (ён можа пачынацца раптоўна, хутка скончыцца і г. д.).

На *занятку 5* можна выканаць заданні, якія выклікалі найбольшую зацікаўленасць дзяцей, замацаваць тыя творы, якія могуць быць уключаны ў праграму ранішніка або фальклорнага свята, прысвечанага гуканню вясны. Пры жаданні занятак можа быць праведзены на пляцоўцы дзіцячага садка. Падчас выканання песень на свежым паветры будзе больш магчымасцей адчуць паэтыку веснавога фальклору, паспрабаваць выканаць творы антыфонна, далучыць да фальклору дзяцей іншых узроставых груп.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Вось і адбылося знаёмства з “Музычнай скарбонкай”, ў якой апынулася толькі невялічкая часцінка сапраўднай скарбніцы – музычнага фальклору беларусаў, які можна выкарыстоўваць у працы з дашкольнікамі.

Першыя крокі ў засваенні культуры – такія ж складаныя, як і сапраўдныя крокі маленькага чалавека. Але яны і не меньш адказныя. Цудоўна, калі побач з малым будзе такі дарослы, які зможа не толькі падтрымліваць гэтыя крокі, але і пакажа шматлікія сцежкі, дарожкі і шырокія магістралі, працягнутыя з мінулага ў будучыню – усё багацце музычнай спадчыны, неад’емнай часткай якой з’яўляецца нацыянальны фальклор. Калі вы чытаеце гэтыя радкі (аўтар спадзяецца, што вы не з тых, хто чытае кнігі з канца, а гэта значыць, змесціва “Музычнай скарбонкі” выклікала у вас сапраўдную зацікаўленасць), – Вы той самы дарослы.

Застаецца толькі пажадаць Вам поспехаў у стварэнні ўласных скарбонак – з цікавым музычным рэпертуарам, метадамі і прыёмамі яго данясення да маленькіх слухачоў, скарбонак творчасці дзяцей і дарослых, радаснай сумеснай дзейнасці.

# Літаратура

## да раздзела «Тэарэтычныя асновы выкарыстання беларускага музычнага фальклору ў музычным выхаванні дашкольнікаў»

1. *Алексеев, Э. Е.* Раннефольклорное интонирование / Э. Е. Алексеев. М.,1986.

2. *Алексеев, Э. Е.* Фольклор в контексте современной культуры / Э. Е. Алексеев. М., 1988.

3. *Балашова, С. С.* На повороте к аутентичному фольклору / С. С. Балашова // Музыкальное воспитание: опыт, проблемы, перспективы : межвузовский сборник научных трудов. Тамбов, 1994. С. 16—26.

4. *Елатов, В. И.* Ладовые основы белорусской народной музыки / В. И. Елатов. Мн., 1964.

5. *Елатов, В. И.* Мелодические основы белорусской народной музыки / В. И. Елатов. Мн., 1970.

6. *Елатов, В. И.* Ритмические основы белорусской народной музыки / В. И. Елатов. Мн., 1966.

7. *Каган, М. С.* Философия культуры / М. С. Каган. СПб., 1996.

8. *Каган, М. С.* Эстетическое и художественное воспитание в развитом социалистическом обществе / М. С. Каган. СПб., 1984.

9. *Кирнарская, Д. К.* Современные представления о музыкальных способностях / Д. К. Кирнарская // Вопросы психологии. 1988. № 2. С. 129—137.

10. *Кодай, З.* Музыка в детском саду : избранные статьи / З. Кодай. М., 1982. С. 145—192.

11. *Кудрявцев, В.* Дошкольное детство: культурно-исторический аспект / В. Кудрявцев // Универсальное и национальное в дошкольном

детстве : материалы международного семинара ; под ред. Л. А. Парамоновой. М., 1994. С. 10—13.

12. *Леви, В.* Вопросы психобиологии музыки / В. Леви // Советская музыка. 1966. № 8. С. 37—43.

13. *Радынова, О. П.* Музыкальные шедевры : авторская программа и методические рекомендации / О. П. Радынова. М., 1999.

14. *Радынова, О. П.* Музыкальное воспитание дошкольников : учебное пособие для студентов вузов / О. П. Радынова, А. И. Катинене, М. Л. Палавандишвили. М., 1997.

15. *Тарасова, К. В.* Онтогенез музыкальных способностей / К. В. Тарасова. М., 1988.

16. *Теплов, Б. М.* Психология музыкальных способностей : избранные труды. В 2 т. Т. 1 / Б. М. Теплов ; ред.-сост. Н. С. Лейтес, И. В. Равич-Щербо. М., 1985.

**да раздзела «Метадычныя рэкамендацыі па далучэнні старшых дашкольнікаў да беларускага музычнага фальклору»**

17. Анталогія беларускай народнай песні / уклад. Г. Цітовіч. Мн., 1975.

18. Беларускі дзіцячы фальклор / скл. : А. М. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў, А. С. Фядосік, У. Д. Каструлёў. Мн., 1994.

19. Беларускі музычны фальклор / скл. : А. М. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў, У. Д. Каструлёў. Мн., 1996.

20. Беларускі фальклор у школе : 1 клас : дапаможнік для настаўніка / [І. І. Сучкоў, Ф.І. Таранава і інш.]. Мн., 1996.

21. *Грыневіч, А.* Дзіцячы спеўнік / А. Грыневіч. Вільня, 1925.

22. Дзіцячы фальклор / АН БССР, інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Мн., 1972.

23. Казкі для сцэны / скл. М. Федасеенка. Мн.,1992.

24. Калыханкі і забаўлянкі / скл. В. Ліцвінка. Мн.,1992.

25. Каток — залаты лабок : беларускія народныя казкі. Мн., 1986.

26. Людзей слухай, а свой розум май : беларускія народныя казкі. Мн., 1988.

27. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. Мн., 1997.

28. Пралеска : хрэстаматыя для дзіцячага сада і пачатковай школы. Мн., 1997.

29. *Скарабагатчанка, А*. Беларускія народныя музычныя інструменты 20 стагоддзя / А. Скарабагатчанка. Мн., 2001.

30. Ходзіць жораў па таку / Скл. Г. А. Барташэвіч. Мн., 1993.

31. Чурко, Ю. М. Вянок беларускіх танцаў / Ю. М. Чурко. Мн., 1994.

## Фонадакументы

### да раздзела «Метадычныя рэкамендацыі па далучэнні старшых дашкольнікаў да беларускага музычнага фальклору»

1. Зачараваная мая : песні [Гуказапіс] / выконвае ансамбль «Песняры» ; кір. У. Мулявін. Л. : Всесоюзная студия грамзаписи «Мелодия», 1983. — 1 грампласцінка.

2. Купалінка [Гуказапіс] / выконвае гурт "Купалінка"; маст. кір. А.Цялькова. Мн. : Купалінка, 1998. - 1 кампакт -дыск.

3. Микита. Белорусский народный танец [Звукозапись] / исполняет симфонический оркестр Белорусской гос. филармонии; дирижер В. Дубровский. – 1 грампластинка.

4. Музыкальный фольклор Белоруссии [Звукозапись] / сост. : З. Можейко, И. Назина. Л. : Всесоюзная студия грамзаписи «Мелодия», 1990. — 1 грампластинка.

5. Свята : ансамбль народнай музыкі [Гуказапіс] / маст. кір. В. Купрыяненка. — 1 грампласцінка.

6. Танцы народов СССР [Звукозапись] / исполняет Государственный академический русский народный оркестр им. Н. Осипова ; дирижер В. Дубровский. Л. : Всесоюзная студия грамзаписи «Мелодия», 1980. — 1 грампластинка.

7. Традиционное искусство Поозерья : вечериночная музыка (Витебщина) [Звукозапись]. — 1 грампластинка.

8. Фонохрестоматия по белорусской музыке для детских музыкальных школ [Звукозапись] / сост. : Г. Глущенко, К. Степанцевич. Л. : Всесоюзная студия грамзаписи «Мелодия». — 1 грампластинка.

9. Хорошки : Белорусский фольклорно-хореографический ансамбль [Звукозапись] / художественный руководитель В. Гаевая; музыкальный руководитель С. Хвощинский. — 1 аудиокассета.